№ 45 (403) 3 сьнежня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Аранжавая рэвалюцыя**

Гутарка з Натальляй Якавенкай.

старонка 6

**Рабаўнік Ягайла, тэрарыст Луцкевіч**

Сэнсацыйныя адкрыцьці гісторыкаў.

старонка 8

**Паштовая скрынка апазыцыі**

17 кастрычніка — гэта 11 верасьня.

старонка 13



АРТУР КЛІНАЎ

АНОНС

**Адбудова сталіцы**

Агульнанацыянальны праект у наступным нумары «НН».

КАЛЯНДАР

**2 сьнежня**

Сусьветны дзень барацьбы з рабствам. Змаганьне зь несвабодай пачынаем зь сябе.

# Латыпаў выйшаў на свабоду

## Віктар Шэйман — кіраўніком Адміністрацыі

Лукашэнкаўскія палітычныя кампаніі — цяжкое выпрабаваньне для кіраўнікоў ягонай адміністрацыі. Урал-авой ня вытрымаў перанапругі. Ён сыходзіць. З ордэнам Дружбы Народаў і, як намякае, у бізнэс. У органах улады і КДБ ён больш ніколі працаваць ня будзе, гэта перагорнутыя старонкі, — заявіў ён у інтэрвію «Народнай волі». Мо ён стане першым «чэсным» беларускім алігархам? Ходзяць чуткі, што ён можа заняць высокую пасаду ў кампаніі «Лукойл». Тады ён, трэба думаць, нарэшце перасядзе з сваёй знакамітай бардовай «сямёркі» на сучасны легкавік.

Блізкія да яго супрацоўнікі адміністрацыі пашанотна называлі яго «Ўрал-авой», што па-татарску значыць дзядзька Ўрал. Ураджэнец Бышкірыі Латыпаў дысцыплінавана выкарыстоўваў свой унікальны як для беларускага чыноўніка інтэлектуальны патэнцыял на службе аўтарытарнаму рэжыму.

Беларусь, бадай, адзіная краіна сьвету, дзе найвышэйшыя дзяржаўныя пасады даступныя выхадцам зь іншых краінаў, якія да таго ж не валодалі моваю карэннага насельніцтва. «Беларусь застанецца ў мяне ў сэрцы. Гэта сапраўды белая чыстая Русь. Яна застанецца акурат такой, а мы бачым, што робіцца навокал», — заявіў ён на разьвітаньне. Трэба разумець, зараз ён будзе працаваць у іншай краіне.

Выпадковая ці не выпадкова, але пасьля рэфэрэндуму сышлі зьвязаныя з Расеяй Ерын і Латыпаў, а сярод новых прызначэнцаў — два ўраджэнцы Заходняе Беларусі. Віктар Шэйман, цяпер кіраўнік адміністрацыі, вырас на гістарычнай Віленшчыне (Салтанішкі Воранаўскага раёну).

**Працяг на старонцы 2.**



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

# Кухня рэвалюцыі

**Абсалютна ясна, што Януковічу прэзыдэнтам ня быць. Няясна, ці стане прэзыдэнтам Юшчанка. Рэвалюцыя выдыхаецца, рэвалюцыя натхняецца, рэвалюцыя мае тайныя спружыны і апору ў народзе. Старонка 3.**

### Салідарнасьць з Украінай

На грошы, сабраныя супрацоўнікамі Рэдакцыі, былі закупленыя пакеты для сьмецьця, рукавічкі, пітная вада, мандарыны й цыгарэты для ўдзельнікаў акцый пратэсту супраць фальшаваньня выбараў. Менавіта ў гэтых рэчах у намётавым стане адчувалася найбольшая патрэба на мінулым тыдні. Як паведамляе з Кіева наш чытач ВП, людзі адразу разьбіраюць мандарыны й цыгаркі, якія дапамагаюць хлопцам саграваццa на марозе.

### «НН» і «ARCHE» ў Горадні

3 сьнежня ў Горадні адбудзецца сустрэча з рэдактарамі «Нашай Нівы» і «ARCHE» **Андрэем Дыньком** і **Валерам Булгакавым**. Пачатак а 18.30 у майстэрні мастака Зьмітра Іваноўскага (Будзённага, 48а, першы паверх). У Горадню прыедуць таксама паэт **Андрэй Хадановіч** і сьпявак **Зьміцер Бартосік**. У сустрэчы возьмуць удзел і гарадзенцы — паэт **Юры Пацюпа** і крытык **Даніла Жукоўскі**. Гаворка пойдзе пра гарачыя пытаньні нашага жыцьця.

### Свой сьвет штотыдзень

«Наша Ніва» з Новага году будзе выходзіць на 24 старонках штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

# Звышзадача белінтэлігенцыі

Пачынаючы са сьнежня, часопіс «ARCHE» будзе немагчыма набыць праз дзяржаўную сетку распаўсюду — у шапіках і крамах «Белсаюздруку» і «Белкнігі». Аб скасаваньні дамоваў Рэдакцыю папярэдзілі пасьля выхаду адмысловага «прэзыдэнцкага» нумару, у якім аналізавалася дзесяцігодка Аляксандра Лукашэнкі. Таму наша гутарка з галоўным рэдактарам «ARCHE» Валерам Булгакавым вымушана пачалася з актуальнага для Рэдакцыі пытаньня.

**— Што «ARCHE» рабіцьме, каб не згубіць чытачоў ва ўмовах фактычнай забароны на распаўсюд?**

— Добра, што «Белпошта» пакуль не даўмелася выдаліць нас з падпіснога каталёгу. Адчуваючы магчымыя санкцыі з боку дзяржавы за палітызацыю «ARCHE», мы стварылі спрыяльныя варункі для падпіскі: кошт часопісу праз падпіску ўсяго 2500. Дзеля справядлівасьці варта заўважыць, што нягледзячы на каманду зь «Белкнігі» выкінуць нас з кнігарняў, ня ўсе зь іх адмовіліся ад супрацоўніцтва з намі.

**Працяг на старонцы 14.**

**«Дзеяньні беларускіх дзеячаў культуры па-ранейшаму скіраваныя на стварэньне нейкіх абстрактных вечных вартасьцяў. Пара ўжо адысьці ад гэтых амбіцыяў наконт вечнасьці й займацца зьлыбедамі й посьпехамі сярэднестатычнага беларуса. Мы павінны фармаваць культурную карціну сьвету суайчыньнікаў і бягучыя перакананьні шараговага грамадзяніна», — маркуе рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў.**

# Прэс-дама

## Птушаня Латыпава пайшло на ўзьлёт

Раман Якаўлеўскі

На апошняй рэспубліканскай нарадзе па кадравых пытаньнях ужо былы кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Ўрал Латыпаў абнародаваў установку на амаладжэньне кіруючых кадраў. У прыватнасьці, ён адзначыў, што кіраўнікі ва ўзросьце 30—35 гадоў сьмялей бяруць на сябе тыя ці іншыя дзяржаўныя рашэньні. І зьявіліся 30-гадовыя кіраўнікі замежных дыпмісій і іншых дзяржструктур. Гэтая ўстаноўка знайшла сваё адлюстраваньне і ў нядаўнім кадравым прызначэньні. Прэзыдэнт сваім указам назначыў 32-гадовую Натальлю Пяткевіч намесьніцай кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, вызваліўшы яе ад пасады прэс-сакратаркі прэзыдэнта.

Выпускніца юрфаку БДУ пачала сваю кар'еру ў прэзыдэнцкіх структурах у 1994 г. Да дзяржаўнай службы яе прыцягнуў у той час вядомы ў атачэньні Лукашэнкі юрыст Аляксандар Пласкавіцкі, які ўзначальваў Галоўнае дзяржаўна-прававое ўпраўленьне прэзыдэнцкай адміністрацыі. Спн.Пяткевіч сем гадоў займала ў гэтай структуры пасады ад вядучага спэцыяліста да начальніка ўпраўленьня дзяржаўнага і міжнароднага правоў. Стала кандыдатам юрыдычных навук. У 2001 г. пасьля актыўнага ўдзелу ў перадвыбарчай кампаніі прэзыдэнта Лукашэнкі была прызначана ягонай прэс-сакратаркі. Праўда, тады некаторыя больш адзначалі наяўнасьць іншага актывіста перадвыбарчага штабу Лукашэнкі — ягонай асабістай лекаркі Ірыны Абельскай. Разам з прэзыдэнцкім памочнікам Уладзімерам Макеем і сэнатарам Мікалаем Чаргінцом яна апавядала па тэлевізары аб праграме свайго прэзыдэнта. А Натальля Пяткевіч, трэба меркаваць, забясьпечвала юрыдычную чысьціню гэтай праграмы.

Людзі, якія ведаюць яе, нязьменна адзначаюць у Пяткевіч мэтанакіраванасьць, адукаванасьць і ўменьне выказваць тыя ці іншыя думкі. Наяўнасьць у атачэньні прэзыдэнта жанчын-спэцыялістаў спараджала ў чыноўнага люду рознага кшталту чуткі, якія імі і заставаліся. Як і чуткі аб тым, што Натальля Пяткевіч (прозьвішча ў дзявоцтве Краўчанка) зьяўляецца ледзь не пляменьніцай першага міністра замежных спраў сувэрэннай Беларусі і былога пасла ў Японіі Пятра Краўчанкі.

Бацька Натальлі Пяткевіч — вядомы ў Менску лекар-стаматоляг і зь нядаўняе пары дэпутат гарсавету, а маці — настаўніца.

Натальля Пяткевіч увесь час падкрэсьлівае сваю адданасьць сям'і. Яна даволі рана ўзяла шлюб і да сваёй дзяржаўнай службы разам з мужам удзельнічала ў шэрагу праектаў па аказаньні юрыдычнай дапамогі ў сфэры міжнароднага права некатэрым грамадзкім арганізацыям. Але гэта было ў дапрэзыдэнцкі час.

Зьяўленьне новай прэс-сакратаркі ў прэзыдэнта сьпярша выклікала натуральную цікавасьць у журналістаў. З папярэднікам Пяткевіч журналістам працавалася даволі нябліга, назіраліся адпаведны кантакт і субардынацыя. А вось з прыходам Натальлі Пяткевіч запанавала жорсткае стаўленьне да журналістаў, асабліва заходніх СМІ. Таму яе празвалі прэс-дамай.

Напрыклад, калі прэзыдэнт вырашыў наведаць у больніцы алімпійскую чэмпіёнку Юлію Несьцярэнку, ягоная прэс-сакратарка ў даволі жорсткай форме забараніла здымаць гэту сцэну карэспандэнту агенцтва «Reuters». Сваім калегам ён потым расказваў, як яму давялося нечакана пачуць на адрас свайго агенцтва непрынадную характарыстыку. Чый імідж выйграў ад такога стаўленьня — зразумець нескладана. А галоўнай задачай прэс-сакратаркі прэзыдэнта зьяўляецца падтрыманьне станоўчага іміджу свайго гаспадара. І гэта быў не адзіны выпадак такога кшталту.


PHOTO.BYMEDIA.NET

А ўжо як спадарыня Пяткевіч «прасавала» супрацоўнікаў беларускай тэлевізіі, дык яны дасюль забыць пра гэта ня могуць. Яна настойліва раіла тэлеспэцыялістам «не мудраваць» і ўладна, напрыклад, кіравала ўстаноўкай сьвятла, дэкарацый і г.д. Для прэс-сакратаркі, якая не гаварыла па-беларуску, такія паводзіны былі настолькі натуральнымі, што пасьля пасадкі за краты 30-гадовага Ягора Рыбакова на вуліцы Макаёнка сталі казаць пра новага начальніка БТ, якім можа стаць Натальля Пяткевіч. І яе з хваляваньнем нейкі час там чакалі, ведаючы, што яна крэатура кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Ўрала Латыпава.

Яе «сваталі» і на месца звольненага з пасады міністра інфармацыі Міхаіла Падгайнага. Чаго толькі вартыя некаторыя яе ўказаньні «Советской Белоруссии», на якія канкрэтна старонкі ставіць тыя ці іншыя матэрыялы. Карацей, уплыў прэс-дамы на сфэру прапаганды ўзрастаў. І «птушанятка» высьпела. Відавочна, што Латыпаў выкарыстоўваў устойлівую думку прэзыдэнта аб неабходнасьці вылучаць на кіруючыя пасады жанчын.

Паводле некаторых зьвестак, у якасьці альтэрнатыўнай фігуры разглядалася іншая жанчына — Ніна Шпак, дырэктарка Інстытуту сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Аднак, відаць, Латыпаў здолеў пераканаць кіраўніка дзяржавы ў неабходнасьці пакінуць за яго новай намесьніцай пытаньні ўдасканаленьня заканадаўчай базы краіны, каардынацыі дзейнасьці падсправаздачных прэзыдэнту дзяржаўных органаў у галіне права, узаемадзеяньня прэзыдэнта з органамі судовай улады.

Шматабяцальнай уяўляецца яшчэ адна сфэра, падсправаздачная спн. Пяткевіч. У адрозьненьне ад свайго невалявога папярэдніка, Пяткевіч будзе актыўна дапамагаць сьпікерам абедзьвюх палат парлямэнту пісаць законы і ўдасканальваць заканадаўчую базу. Як вядома, не чужы ёй і «прэсінг». Вельмі магчыма, што на гэтым шляху заканатворчасьці ў новай намесьніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта будуць узьнікаць міжасабовыя калізіі з новым сьпікерам ніжняй палаты парлямэнту. А яе выканаўчасьць і прыхільнасьць да жорсткага стылю ў працы цалкам сугучныя з разуменьнем працы зь людзьмі новага кіраўніка Адміністрацыі Віктара Шэймана. Спрацуюцца.

## Латыпаў выйшаў на свабоду

Працяг са старонкі 1.

Новы генэральны пракурор, а раней намесьнік старшыні Вярхоўнага Суду Пятро Міклашэвіч нарадзіўся ў вёсцы Касута на Вялейшчыне, а пачынаў кар'еру на Гомельшчыне.

Пра асабістую прыныцыповасьць новага генпракурора ў інтэрвію радыё «Свабода» высока адзывающа ягоныя былыя калегі.

Фігура В.Шэймана асабліва непрымальная эўрапейскае супольнасьці. У дакладзе Хрыстаса Пургурыдэса праводзілася думка пра ягоную магчымую датычнасьць да асабліва цяжкіх злачынстваў. Пра палітычныя погляды В.Шэймана сьведчыць ягоны выбар прэс-сакратара ў пракуратуры. Гэтую сынэкуру пры В.Шэйману заняў сумна вядомы рэжысэр Азаронак.

**Мікола Бугай**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Надсан

Прэзэнтацыя кнігі а.Аляксандра Надсана «Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус» адбудзецца **8 сьнежня** ў дольнай залі Чырвонага касьцёлу. Пачатак а 18-й. З Брытаніі на яе прыедзе аўтар.

### Бураўкін

**2 сьнежня** ў вялікай залі Дому літаратара адбудзецца прэзэнтацыя новага зборніка вершаў Генадзя Бураўкіна «Жураўліная пара». Пачатак у 18.30, уваход вольны.

### «Крама»

**5 сьнежня** ў Палацы прафсаюзаў адбудзецца сольны канцэрт гурту «Крама» з прэзэнтацыяй альбомаў «Наваполацак. Life» і «Гарэлка на лёдзе». Пачатак а 19-й. Квіткі — ад 8000 да 20000.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў

**Рыхтуецца Калядны нумар «НН». Просьба дасылаць апавяданьні й пераклады для надрукаваньня ў традыцыйнай падборцы.**



# Ва ўсіх пачаўся пост


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**28 лістапада пачаўся Калядны пост у праваслаўных і рыма-каталікоў. Грэка-каталікі на Беларусі пачалі пост яшчэ 15 лістапада. У бізантыйскім абрадзе пост перад Раством даўжэйшы, чым у лацінскім, таму праваслаўныя і грэка-каталікі посьцяцца аднолькава па часе. Паколькі ж праваслаўныя прытрымліваюцца старога юліянскага календара, пачынаюць пасьціцца яны пазьней і сьвята Раства ў іх 7 студзеня, а рыма-каталікі і грэка-каталікі адсьвяткуюць яго 25 сьнежня. Калядны пост называюць яшчэ Піліпаўкай, таму што пачынаецца ён на наступны дзень пасьля ўспаміну апостала Піліпа.**

**Калядны пост павінен дапамагчы хрысьціянам малітвай падрыхтавацца да дня Раства Хрыстовага, каб з чыстым сэрцам, душой і целам сустрэць зьяўленьне ў сьвеце Сына Божага. Царква, аднак, навучае сваіх вернікаў, што цялесны пост — ня мэта, а толькі сродак і без малітвы ды пакаяньня можа ператварыцца ў звычайную дыету. Падчас посту трэба ня толькі ўстрымлівацца ад ежы ды забаў, але таксама практыкаваць справы міласэрнасьці і дапамогі тым, хто мае ў гэтым патрэбу.**

**Алесь Трафіменка**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

### Справа супраць Паганяйлы


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Супраць **Гары Паганяйлы**, намесьніка старшыні Беларускага Хельсынскага камітэту, пракуратура Менску распачала крымінальную справу. Прававабаронцу вінавацяць у паклёпе на прэзыдэнта (ч.2, арт.367 КК): яму пагражае абмежаваньне альбо пазбаўленьне волі на тэрмін да 5 гадоў. Паганяйла 18 жніўня даў інтэрвію швэдзкай тэлекампаніі TV4: распавёў пра палітычныя зьнікненьні й назваў імёны тых, каго падазраюць у датычнасьці да гэтых зьнікненьняў. Касэту зь відэазапісам у журналіста канфіскавалі пры перасячэньні дзяржаўнай мяжы супрацоўнікі КДБ, якія накіравалі яе ў пракуратуру.

### Спыненая шчэ газэта


PHOTO.BYMEDIA.NET

Выхад недзяржаўнай гарадзенскай газэты **«Биржа информации»** прыпынены 29 лістапада на 3 месяцы загадам міністра інфармацыі У.Русакевіча: падстава — рашэньне суду пра пакараньне галоўнай рэдактаркі **Алены Раўбецкай** за артыкул «Здрада імем народу», якім былі «зьняважаныя гонар і годнасьць» Лукашэнкі.

**АШ**

Іншыя паведамленьні з хронікі супраціву — **старонка 13**.



Любая дэмакратычная сыстэма зайздросна стабільная. Нават заліўшы Кіеў аранжавым морам, апазыцыя не рашаецца абвесьціць сябе ўладай.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Аранжавае мора

## На Храшчаціку ды Майдане Незалежнасьці — уся Ўкраіна

Алесь Кудрыцкі

Менск разьвітваецца зь цягніком ліхтарыкамі пахмурых чыгуначнікаў. Стоячы ў калідоры ля свайго купэ, мужчына, відаць, мэнэджэр нейкай менскай фірмы, сьпешна вырашае справы па сотавым тэлефоне — пакуль ня выйшаў з зоны пакрыцьця: «Качуся ў цягніку на Кіеў. Куды? Ды на Майдан з інспэкцыяй. Прывязу табе аранжавы пакет».

«Кажуць, ужо ўвесь сьпірт у Кіеве скупілі», — бурчыць беларуска-праваднiца, завіхаючыся з гарбатай. Пад гоман пасажыраў цягнік засынае, каб прачнуцца на мяжы ад вішчаньня мытніцкіх рацыяў.

7-я раніцы, станцыя Нежын. Ужо добра такі разьвіднела. Дзьве жанчыны крочаць па пэроне ў форменных аранжавых жылетках. А падумалася было — рэвалюцыя й сюды дабралася. Так і ёсьць! У адной з дворнічых на камізэльцы павязаная бантам аранжавая стужачка, здаля й не разглядзець.

Але ж і сьнегу навальіла... На бэтонным плоце надпіс па-расейску: «Сыманенка! Бог табе дапаможа!».

На станцыях, што праплываюць міма, усё больш памаранчавага колеру. Найчасьцей трапляюцца бабулькі ў аранжавых хустках.

Прадмесьце Кіева. На плоце буйной аўтабазы — бела-блакітная налепка «аўтамабілісты — за Януковіча». Міма яе, смалячы цыгаркі, крочаць мужыкі ў аднолькавых скураных куртках з аднолькавымі парэпанымі аранжавымі стужкамі на рукавах.

Цягнік пад'яжджае да вакзалу. На платах — «Пора», «Пора»...

Вакол станцыі мэтро «Храшчацік» — мора людзкое. Зьлева згрувасьціліся запэцканыя рэйсавыя аўтобусы, наперадзе — шэрагі намётаў, якія, як паглядзець направа, хаваюцца за паваротам праспэкту.

«Хлопчыкі, вам шкарпэткі не патрэбныя?» — пытаецца бабуля, трымаючы стос чыстых, рукамі вязаных шкарпэтак. Хлопец з ачапленьня, высака трымаючы памаранчавы сьцяг, адмоўна матляе галавою ды накіроўвае яе да камэнданта. Побач — гурба вопраткі. Два беспрытульнікі, пачапіўшы аранжавыя стужкі, папаўняюць гардэроб. Ахоўнікі відавочна радыя, што хоць камусьці спатрэбілася гэтае майно, якое патроху набракае вільгацьцю.

Намётавае мястэчка стаіць на пэнапластавых плясьцінах, нібы на крыгах, якія плывуць у расталым сьнезе. Па пэрымэтры плячом да пляча стаіць ахова — народная дружына. Прайсьці праз агароджу чужаніцу амаль немагчыма — шыбуй, «будьласка», да прахадной ды рэгіструйся з пашпартам. Беларусаў у лягеры прыблізна тры дзясяткі.

Пару дзён таму тут зьявіліся вайсковыя пайкі, загорнутыя ў фольгу плястыкавых кантэйнэрчыкі, падзеленыя на тры аддзелы — сьнядаанак, абед, вячэра. Заходзячы з маркіроўкі, яны былі выраблены ў верасьні гэтага году, і нават Анатоль Кінах, старшыня Партыі прамысловцаў ды прадпрымальнікаў, які, паводле чуткак, у асноўным забясьпечвае жыцьцядзейнасьць Храшчаціку, наўрад ці мог іх набыць — відаць, гэта зрабіў хтосьці з буйнымі зоркамі на пагонах. Міністар Кузьмук лашчыцца да народу?

Храшчацік з Майданам трымаецца ня толькі на вялікіх капіталістах з каманды Ючшанкі. Вунь да намётавага мястэчка ідуць чародкаю хлопцы, якія нясуць на плячах навюткія матрацы, — прадпрымальнік прывёз на сваім грузавіку, але ня змог пад'ехаць бліжэй з-за натоўпу. На стэндзе ля штаб-кватэры інфармацыйнага агенцтва «Уніян» прылепленыя раздрукоўкі апошніх навінаў. «ВіяГра» ды Канстанцін Меладзэ абвяргаюць зьвесткі пра падтрымку Януковіча ды ахвяруюць на патрэбы рэвалюцыі тысячу валёнкаў.

Харчоў ды вопраткі дастаткова, недахоп адчуваецца ў спэцыфічных драбніцах, якія цяжка дастаць з-за страйку, што ахапіў кіеўскія крамы. Пэрыядычна ўзьнікаюць праблемы з адмысловымі пальчаткамі для прыбіральшчыкаў з гумавымі пупышкамі на далонях, катастрафічна не стае вазкоў, якія б дазволілі не насіць на руках рэчы праз усё мястэчка, а таксама стэляжоў для намётаў-складоў.

Туга з туалетамі. Мэр Кіева выставіў на Храшчацік некалькі тузінаў «біякабінак», аднак многія зь іх ужо не функцыянуюць, дый замала іх. Большасьць жыхароў мястэчка карыстаецца туалетамі ў навакольных установах. Куткамі ды сьценамі не карыстаецца ніхто, прынамсі, на Храшчаціку. Яшчэ вастрэй адчуваецца адсутнасьць магчымасьці памыцца, перабівацца, хто як можа — хто да знаёмых ідзе, хто ў лазьню.

Сьмецьця на вуліцах — мінімум, калі ўлічваць, што ў цэнтры тыдзень ужо гуляе мільён чалавек. «Не паскудзь навокал, ты ж не ў Данбасе» — распаўсюджаны лёзунг першых дзён пратэсту патроху забываецца: у Кіеве хапае жыхароў усходу, якім крыўдна чуць такія словы, дый людзі на Храшчаціку за тыдзень ужо звыкліся кідаць плястыкавыя талеркі не пад ногі, а запіхваць іх у перапоўненыя сьметніцы, над якімі дзе-ндзе напісана «хата Янука». Кабеты ў аранжавых жылетках зграбаюць скамечаную паперу і пустыя пляшкі ды скідаюць у аранжавы сьмецьцявоз.

Працяг на старонцы 4.

### Рэвалюцыя выдыхаецца

**На другім тыдні пратэстаў дзеяньні апазыцыі сталі больш прадказальнымі, а колькасьць мітынгантаў зьмяншаецца. Страйкаваць вечна ня будзеш...**
**Пакуль Юшчанка зь Януковічам падпісваюць дэклярацыі, якія ні да чога не абавязваюць уладу, розныя палітычныя гульцы выкарыстоўваюць палітычны крызіс у тактычных мэтах. Віктар Юшчанка пераконвае сваіх прыхільнікаў: «Мы тут змагаемся за свабоду ня толькі для сябе, але і для будучых пакаленьняў. Для гэтага варта пацярпець на марозе ня толькі некалькі дзён, але і некалькі тыдняў».**

### Кампаніі, якія страйкуюць за Юшчанку

**Сярод 27 тысяч прадпрыемстваў, якія бастуюць — «Рошен», «Оболонь», «Житомирські сладощі». Студэнцкія арганізацыі Ўкраіны заклікаюць байкатаваць тавары, што вырабляюцца кампаніямі, якія належаць да клану Януковіча-Ахметава: піва «Сармат», слодычы «Супэр-Контык», «Шэдэўр», алей «Славолія».**

### Недавер ураду Януковіча

Вярхоўная Рада Ўкраіны з трэцяй спробы 229 галасамі выказала недавер ураду Віктара Януковіча. Мінімум, неабходны для гэтага рашэньня — 226 галасоў. Аднак паводле канстытуцыі Ўкраіны, адправіць урад у адстаўку можа толькі прэзыдэнт, а Леанід Кучма ўжо назваў пастанову Вярхоўнае Рады «чыста палітычнай», прынятай пад ціскам дэманстрантаў. Каля 100 тыс. мітынгоўцаў сабраліся ля сьценаў будынку на вуліцы Грушэўскага падчас паседжаньня.

### Хутчэй Зымбабвэ, чым Літва

Паводле рэйтынгу журнала «Economist», Беларусь па ўзроўні жыцьця знаходзіцца на сотым месцы ў сьвеце. Першае месца мае Ірляндыя, потым ідуць Швайцарыя, Нарвэгія і Люксэмбург. Эўропа ўвогуле трымае 9 месцаў зь першых 10-ці, толькі Аўстралія займае 6-е месца. З усходнеэўрапейскіх краінаў вышэй за ўсіх падняліся Славенія — 27-е месца — і Чэхія — 34-е. Сярод краін былога СССР вышэй за ўсіх прыбалтыйскія краіны: 63-е месца ў Літвы. Расея толькі на 105-м.

### Вяртаньне пасла Ізраілю

30 лістапада ў Менск прыбыў пасол Ізраілю ў Беларусі Зэеў бэн-Ар'е, які ў 1997—1998 г. ужо ўзначальваў тут ізраільскае прадстаўніцтва. Гэта трэцяя спроба адчыніць ізраільскую амбасаду. Апошні раз яе зачынілі летась у ліпені. Пасольства разьмесьціца на Партызанскім праспэкце.

### Пэнсіянэраў паболела

За 10 месяцаў гэтага году пэнсіянэрамі сталі 106349 грамадзян Беларусі. Зь іх 66711 жанчын і 39638 мужчынаў. Пэнсіі па ўзросьце атрымала 74603 чалавек. Прычым 18314 зь іх не дасягнулі пэнсійнага ўзросту. Пэнсіі па інваліднасьці атрымала 16829 чалавек, у сувязі са стратай кармільца — 10440. Сярэдняя пэнсія ў кастрычніку склала 158 тыс.

### Бананы схавалі ад марозу

З 1 сьнежня ў Менску забаронены гандаль садавіной і гароднінай на вуліцах. Санітарныя службы тлумачаць: зімой не захоўваецца тэмпэратурны рэжым, неабходны пры гандлі садавіной.

### Беларуская крама ў Бэльгіі

У Антвэрпэне адкрылася першая беларуская крама «Сьвітанак», якую заснавалі палітычныя ўцекачы з Горадні. У ёй паміж іншага можна набыць беларускія прадукты, а з часам плянуецца прадаваць беларускія кніжкі, паштоўкі, музыку і сувэніры.

### IV зьезд беларусаў сьвету

Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» склікае чацьвёрты зьезд. Ён адбудзецца ў Менску 16—17 ліпеня 2005 г. Чакаецца прысутнасьць прадстаўнікоў дыяспары з 25 краінаў.

### Эротыка ў Віцебску

У Віцебску разгарэлася палеміка вакол перадачы «Плэйбой», трансьляванай на кабэльным «TV-1000». Невядомыя асобы запісалі яе на відэа і перадалі на экспэртызу ў складзеную зь мясцовых знаўцаў камісію па парнаграфіі. Цяпер вяшчанне на кабэльным канале пасьля 23.00 адключаецца. Але нечаканую актыўнасьць праявілі былыя гледачы каналу, якія аспрэчваюць адзнаку гэтых перадач як «парнаграфічных». Адзін з гледачоў, амаль 70-гадовы пэнсіянэр, запытвае праз гарадзкую газэту, чаму чыноўнікам далі права вырашаць, што яму глядзець.

**АТ, Міхал Чарвінскі; БелаПАН**

# Аранжавае

Працяг са старонкі 3.

Бліжэй да Майдану Незалежнасьці гараць агеньчыкі ў вайсковых палявых кухнях, тамсама сякуць дровы, а яшчэ далей — сталы, на якіх раскладзеныя харчы — бульба ў лушпайках, кілбаса, сала, хлеб... Галаднаватыя мітынгоўцы самі сабе не накладаюць, каб пазьбегнуць штурханіны, а робяць замовы жанчынам, якія завіхаюцца ля сталоў.

## Гэй, бульба!

«Увесну 2005-га мы зьбіраемся абудзіць беларускі народ, — кажа Павал Севярынец, стоячы ля ўваходу ў намёт, на якім флямастарам напісана «Менск». — Калі ва Ўкраіне рэвалюцыя канчаткова пераможа, у Беларусі палітычны шок будзе». Паводле Паўла, галоўная задача беларусаў у Кіеве — паказаць сваю прысутнасьць. Гэта асабліва добра ўдавалася напачатку падзеяў, цяпер беларускія сьцягі ўжо не такія шматлікія ды губляюцца ў памаранчавым моры, якое пакрысе робіцца жоўта-блакітным. «Высьпявае нацыя!» — ківае Севярынец.

Павал ды Алег, іншы беларус зь лягеру, накіроўваюцца на шпацыр. Галоўныя кропкі маршруту — будынак Вярхоўнай Рады ды рэзыдэнцыя прэзыдэнта. Сьцягі на тэлескапічных вудзільнах чапляюцца за голае вецьце дрэваў.

«Хлопцы, адкуль вы?» — чуецца збоку голас са знаёмым акцэнтам. «Зь Менску? А я з Мазыра!» — махае рукою коратка стрыжаны хлопец з усьмешкай ад вушэй.

«Хлопцы, а чый гэта сьцяг? Беларускі? Сябры! Сябры!» — чуецца з бакоў. «Сябры — гэтае слова ўзгадваюць найчасьцей, — кажа Павал. — Праўда, неяк мяне адна бабулька назвала «Гэй, бульба!». Пытаецца: «Вы чаго сюды прыехалі?». «Януковіча вашага скідаць!» — адказваю. «Так це ваш Янукович!».

Завулкамі Павал ды Алег выходзяць да рэзыдэнцыі прэзыдэнта. Ня ў прыклад чырвона-жоўтаму гмаху ў Менску, яна стаіць бачком на вузкай вуліцы, з двух бакоў блякаваная шэрагамі спэцназаўцаў у шлемах. Перад імі — мэталёвая агароджа, уздоўж яе — шэраг «памаранчавых» добраахвотнікаў, якія ахоўваюць спэцназ ад жартаўнікоў, правакатараў ды фотарэпарцёраў. Пагляды жаўнераў стомленыя, яны ўжо нават не хаваюцца ад успышак фотаапаратаў, як раней, некаторыя нават усьміхаюцца. Зьмена — кожныя дзьве гадзіны.

На невялікім скрыжаваньні ля рэзыдэнцыі стаяць чатыры агромністыя КрАЗы, якія ледзьве можна разгледзець пад покрывам зь людзей ды аранжавай атрыбутыкі. Нехта прыладкаваўся на даху аўтамонстра ды сілкуецца сальцам ды цыбулькай. Двары навокал поўныя міліцыі, але ўсе вароты ды праходы таксама блякаваныя грузавікамі — чалавеку не працiснуцца. Як што, дык давядзецца спэцназу скакаць з вокнаў.

Сябры-ўкраінцы адмыслова прасілі беларусаў сходзіць да ачапленьня ля рэзыдэнцыі, праверыць, ці не пабачаць яны там «роднага» спэцназу. «Былі такія зьвесткі, але знаёмых твараў са шклянымі вачыма мы там не заўважылі», — кажа Павал.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

## Інфармацыйная хваля

**Каманда Віктара Юшчанкі на сто працэнтаў скарыстала рэвалюцыйны энтузіязм грамадзтва для стварэньня вясёлае інфармацыйнае хвалі. Гідрамэтцэнтар, напрыклад, адмовіўся даваць прагнозы надвор'я для СМІ, якія хавалі інфармацыю пра фальшаваньне выбараў. Жытомірская панчошная фабрыка адправіла жыхарам намётавых мястэчак 5 тыс. параў цёплых шкарпэтак. А чаркаскія таксісты адправілі сто аўтамабіляў для перавозкі ахвотных уязьць удзел у мітынгу ў сталіцы.**

## Новыя формы пратэсту

**Экс-кіраўнік передвыбарнага штабу Віктара Януковіча Сяргей Тыгіпка прызнаў, што праект Януковіч спыніўся 21 лістапада, а вось каманда Юшчанкі мела стратэгію, разьлічаную і на пасьлявыбарчы пэрыяд. Сярод новых формаў пратэсту, ужытых «Сілай народу», быў стрытрэйсінг — язда калёнаў аўтамабіляў, маляўніча аздобленых жоўтагарачай агітацыяй, і аўтамабільны флэшмоб. Так, 150 днепрапятроўскіх прыхільнікаў Юшчанкі зрабілі два такія рэйды да Днепрадзяржынску ды Паўлаграду. Гуртаваліся стрытрэйсэры праз Інтэрнэт.**

«Беларусы трохі лепей жывуць, чым мы», — выказвае меркаваньне кабетка ў аранжавай хустцы. «Няпраўда, беларусы таксама моцна нацярпеліся», — пярэчыць іншая.

«Кожны дзень мітынг на Майдане пачынаецца з малітвы, — хваліць Павал. — Аксамітная рэвалюцыя мусіць пачынацца з духоўнасьці». «Павал, піць даюць!» — паказвае Алег на купку людзей, якія сабраліся ля століка з тэрмасам. «Піць? Пост сёньня!» «Які такі пост?» — не разумее Алег. «Пятніца!» — ці то жартам, ці то ўсур'ёз папікае яго Павал.

«Ісус, мой Госпад! Юшчанка — мой прэзыдэнт!» напісана на аранжавай накідцы маладога чалавека, які, стоячы на рагу вуліцы, распраўляе пакамечаны памаранчавы сьцяг з надпісам «Так!».

## Бела-блакітныя

Вярхоўны Суд пачынае разгляд скаргаў штабу Юшчанкі. Ля ягонага будынку тысяч трыццаць «памаранчавых» скандуюць: «Праўда є! Праўда є!» Крыху наводдаль — пяцьдзясят чалавек пад блакітна-белымі сьцягамі.

Мая прыехала ў Кіеў з Жытоміру, ёй на выгляд гадоў васямнаццаць, і скалечанае рыцынам Юшчанкава абліччa ёй, чыста па-жаночаму, не падабаецца: «Хаця б вось такі прынцып, па ідэі ён здаецца дурацкім, але ўсё-такі: я не хачу, каб нашую краіну прадстаўляў такі на выгляд жахлівы твар».

Рыта Стрэльнікава, сярэдніх год кіяўлянка з сумным голасам кажа: «Я — за стабільнасьць зь Януковічам, а не за хаос зь Юшчанкам. Я дасьведчаная эканамістка, і ведаю, што кажу. Юшчанка — гэта іржа, якая запаланіла ўсю краіну». Пытаньне пра магчымае аддзяленьне ўсходу Ўкраіны прымушае яе задумацца. «Я думаю, што гэтага ня будзе. Як грамадзяніну мне хацелася б, каб Украіна была адзінай, але… Калі што, я прадам кватэру ў Кіеве ды паеду туды. Маё месца там».

«Баюся я, вайна будзе», — хітае галавой старык, які стаіць побач ды слухае гэтую размову.

А па абледзянеламу бруку пукатай вуліцы Лютэранскай спускаецца ад прэзыдэнцкай рэзыдэнцыі да Хрышчаціку неверагодная кампанія. «Аранжавыя» хлопцы па-сяброўску гутараць з двума здаравеннымі мужыкамі ў блакітным камуфляжы ды чорных вязаных шапачках на макаўках. У абодвух з-за пасаў тырчаць януковіцкія бела-блакітныя сьцяжкі. Адзін зь іх паляпвае сябе па сьцягне нагайкай з жоўтай скуры. А, дык вось у чым справа: у таго, з нагайкай, на шапцы ўжо прымацаваныя аранжавыя стужкі.

«Хлопцы, дайце яму постэр!» — просяць «памаранчавыя» ў купкі сустрэчных аднадумцаў, якія нясуць плакацікі клюбу «баявога гапака». Тыя зь недаверам паглядаюць на «бела-блакітных». «Ды я музэй яднаньня буду ствараць! — ушчувае іх мужык з нагайкай. — Музэй таго, што не было ў нас крывавай бойні! Мы ж адзін народ!». Усьцешаныя ды супакоеныя, мінакі прэзэнтуюць яму постэр, зь цікавасьцю вывучаючь нагайку ды гуртуюцца для супольнага фота ў абдымках.

Незадоўга да гэтага Януковіч зладзіў ля галоўнага вакзалу мітынг у сваю падтрымку, на які цягнікамі везьлі людзей з усходу. Калі спачатку на мітынгу «бела-блакітных» было тысяч дваццаць, дык да вечара засталося хіба пяць. Увечары гэтага ж дня, прамаўляючы на Майдане, Юшчанка заклікаў Януковіча везьці ў сталіцу яшчэ больш людзей з Данбасу. «Яны пастаяць дзень на холадзе, а потым мы прыйдзем да іх, дамо ежу, напоім гарбатай, возьмуць у нас шкарпэткі ды рукавічкі».

## Майдан

Майдан Незалежнасьці — гэта, хутчэй, ня плошча, а агромністы амфітэатар пад адкрытым небам. Каб патрапіць туды, неабавязкова ісьці празь вялізнае фае ў выглядзе Хрышчаціку. Можна праслізнуць праз заднюю дзьверку — вуліцу Інстытуцкую ды апынуцца на самым версе, на галёрцы, пад гмахам гатэлю «Ўкраіна». Калі ня кружыцца галава ды расступіцца натоўп, падыдзіце да парэнчаў, што разьмешчаныя па-над каскадам зялёных шыбаў гандлёвага цэнтру, празваных кіяўлянамі «Днепрагрэсам», ды зірніце навокал. Адзіны пусты лапік зямлі, які вы здолееце пабачыць, будзе акурат пад вамі, унізе, вакол Манумэнту Незалежнасьці — калёны са скульптурай жанчыны, якую шалёна ненавідзяць інтэлектуалы ды зьдзекліва называюць Люськаю (паводле жонкі Кучмы). Вакол яе кругам стаяць намёты забесьпячэньня дэманстрантаў ды аховы. А ўся астатняя прастора, аж но да шкляных купалаў падземнага гораду (у народзе — «парнікоў») ды вуліцаў па той бок Майдану, што промнямі разыходзяцца ў розныя бакі, запоўненая людзьмі. Пасярэдзіне — сцэна з экранамі.

# мора




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**«Рэвалюцыйны інтэрнацыянал» Усходняе Эўропы зьляцеўся на дапамогу ўкраінскай апазыцыі. Павал Севярынец ля беларускага намёту: «Калі ва Ўкраіне рэвалюцыя пераможа, у Беларусі будзе палітычны шок».**

Шчыльнасьць грамады неаднолькавая: ад сцэны канцэнтрычнымі кольцамі разыходзяцца «вуліцы ў натоўпе» — праходы, якія людзі наўмысна не змыкаюць, каб можна было вальней перасоўвацца праз плошчу. Таму сюды ідуць нават мамы зь дзецьмі, бацькі саджаюць малых сыноў на шыі, а тыя круцяць галовамі, трушчаць цукеркі, бо гэтыя чалавечкі з аранжавымі сьцяжкамі ды паветранымі шарыкамі выклікаюць у іх страшэнную цікавасьць.

Хто-ніхто каўтае «Абалонь» ці «Славуціч», але п'яных вы тут не адшукаеце — мітынгоўцы лічаць гэта прэрагатывай «бела-блакітных».

Канцэрт ды выступы палітыкаў зазвычай пачынаюцца ўвечары, калі ўжо цямнее. Днём круцяць кампакты з музыкай, але людзей ад гэтага ня меншае. Агульны настрой — радаснае ды спакойнае чаканьне. У нейкі момант плошчу апаноўвае цішыня — мабыць, мяняюць кружэлку. Раптам на ўзгорку пад Жоўтневым Палацам, дзе цяпер ідзе рэгістрацыя на бясплатныя аўтобусныя рэйсы з Кіева, трубач пачынае граць гімн Украіны. Гэтая частка Майдану пачынае сьпяваць. У цэнтры плошчы трубы ўжо ня чуюць, але падхопліваюць сьпеў. Хваля песьні дакочваецца да іншага боку плошчы ды сьціхае.

Гадзіне а дзясятай на плошчы перад сцэнай робіцца крыху вальней, але не таму, што людзі разыходзяцца па хатах. Па вуліцах Грушэўскага ды Інстытуцкай падымаюцца калёны да будынку кабінэту міністраў, што разагнутай падковай раскінуўся на прыгорку. Ад ягоных сьценаў адбіваецца перуновы тамтамавы грукат трыццаці жалезных бакаў, у якія малоцяць палкамі «памаранчавая моладзь». Іншая калёна з Майдану ідзе па Лютэранскай ды Гарадзецкага, на зьмену тым, хто стаіць у атачэньні рэзыдэнцыі прэзыдэнта. Многія крочаць яшчэ далей, да Вярхоўнай Рады. Варта будзе доўжыцца ўсю ноч.

## Украінскі Дом

Уздоўж кароткага адрэзку Хрышчаціку, які вядзе да Народнага Дому, стаяць два шэрагі людзей, утварыўшы жывы калідор. «Чакаем, мо Юшчанка паедзе, вітаць будзем». «А калі ён паедзе?» — «Ня ведаем, недзе бліжэй да вечара». На гадзіньніку 15.35.

Украінскі Дом — вялізная сьветла-шэрая будыніна, былы музэй Леніна. Сумесь канцэртнай залі «Менск» з Палацам Рэспублікі. Перад ім на флягштоках — украінскі двукалёр разам з памаранчавым палотнішчам, побач — эўрасьцяг.

На вуліцы, перад уваходам ва Ўкраінскі Дом, квадратам мэтраў на трыццаць стаяць жалезныя шчыты агароджы. Перад імі — шчыльны натоўп тых, хто жадае трапіць у сярэдзіну. На гэта трэба паўгадзіны — пускаюць па пяць-дзесяць чалавек, столькі, колькі выходзіць з Дому. Пакуль тое, у натоўп раздаюць паламаныя папалам шакалядкі. Да кожнага з чатырох бакоў квадратнага плоту падыходзяць дружыньнікі з каробкамі, у якіх — яблыкі ды бананы. Людзі, што стаяць найбліжэй, без аніякіх просьбаў перадаюць фрукты далей у натоўп, сабе бяруць апошнімі.

«Не налягайце, хлопцы, зараз свой уласны дом прыступам возьмеце!» — ушчувае дружыньнік. Нарэшце, надыходзіць чарга. «Праходзьце».

Увайшоўшы праз дзьверы Дому, многія проста спыняюцца ў зьдзіўленьні: найбольш выдатна арганізавана хаосу цяжка сабе ўявіць. У вялізным фае на першым паверсе — мо з тысячу чалавек, а мо й болей. Вакзальнага гармідару няма — замест яго навокал стаіць спакойны гул нягучнай гутаркі ды нясьпешных крокаў. У цэнтры памяшканьня людзі сядзяць на крэслах, хто-ніхто — на падлозе на коўдрах, яны пераматўляюцца, ядуць са сталоў ці проста з каленяў. Паміж людзьмі шчыруюць прыбіральшчыцы — усё больш маладухі з «Поры» — ды жвава выціраюць падлогу ад нанесенай з вуліцы слаты. Сьмецьцем ім займацца амаль не даводзіцца — наведнікі Дому скідаюць яго ў вялікія плястыкавыя мяхі.

Уздоўж сьценаў фае стаяць белыя боксы, падобныя да тых, зь якіх вядуць гандаль прадпрымальнікі ў шопінг-цэнтрах. У боксах справа ляжаць купы вопраткі. Добраахвотнікі стаяць ланцугом ды перадаюць рэчы з рук у рукі да сартавальнікаў, якія раскладаюць валёнкі да валёнак, шкарпэткі да шкарпэтак, порткі да портак, вешаюць на жэрдачку шалікі. Побач — у асобным боксе — бюро знаходак.

Зьлева таксама боксы, перад імі — сталы, за імі — добраахвотнікі, хто з памаранчавымі павязкамі, а хто й бязь іх. Тутака разьмясьціліся: даведка, запіс у лазьню, служба занятасьці (для тых, хто сам хоча зрабіцца добраахвотнікам), збор паведамленьняў пра парушэньні ў часе выбараў, пасяленьне. Дзяўчына ў белым швэдры, што сядзіць перад сьпісам адрасоў ды прозьвішчаў, кажа: «Мы зьбіраем зьвесткі ад тых, хто мае магчымасьць прыняць людзей. Да нас прыходзяць і тыя, хто ня мае, дзе начаваць».

Далей стаяць сталы для тых, хто жадае падсілкавацца. «Вам якую каву — «Якабс» ці «Нэскафэ»?» — пытаецца дзяўчына за столікам. Ну, украінцы — у любых умовах не адмаўляюць сабе ў задавальненьні прысутнасці выбарам — ня толькі прэзыдэнта, але й гатунку кавы.

Ля сьцяны ў глыбіні залі на стале ляжаць расьпяцце, кветкі, Эвангельле ды сьвечкі.

На другім паверсе — зноў сталы, зноў харчаваньне, але тут ужо больш людзей трывала атабарваюцца на ноч — навокал ляжаць стосы пэнаплясту, на якіх раскладаюць коўдры ды спальныя мяшкі.

На трэцім паверсе — буфэт, таксама бясплатны, з досыць эклектычным, але цалкам паўнавартасным мэню — а таму й большай чаргой. Акрамя звычайнага набору накшталт сухога кілбасна-галетавага пайку, тут можна атрымаць і салату, і накласьці сабе салёных гуркоў, і сыру, і — што асабліва цэніцца — гарачага супу.

Мужчынскі туалет. Паліць нельга — ніхто й ня паліць. На паліцах перад рукамыйнікамі — мыла, туалетная папера, нераспакаваныя зубныя шчоткі, паста, аднаразовыя лёзы ды пена для галеньня, нават сродак для чысткі адзеньня. І — чыста, нягледзячы на чаргу, што высоўваецца за ўваходныя дзьверы.

Крыху далей — за добра асьветленымі сталамі — сапраўдная аптэка. Тут раскладзеныя лекі, усё больш супраць прастуды. За выдачай сочаць каля дваццаці дактароў у белых халатах. «Мы, у асноўным, займаемся прафіляктыкай. Дапамагаем мабілізаваць абарончыя сілы арганізму. Нішто так ня лекуе чалавека, як станоўчыя эмоцыі», — сьмяецца доктар у памаранчавай павязцы на галаве.

За асобным столікам побач — гара сотавых тэлефонаў. «Мой яшчэ не зарадзіўся?», — пытаецца мужчына, падымаючы погляд ад газэты. Хлопец за столікам вышуквае ягоны тэлефон: «Яшчэ не». «То няхай яшчэ паляжыць», — кажа гаспадар тэлефону ды адыходзіць убок. Побач — таксама тэлефоны, але ўжо для бясплатных тэлефанаваньняў па Ўкраіне.

Паўсюль стаяць тэлевізары, па незалежным Пятым канале — жывая трансьляцыя з Майдану. Людзі мяняюць шкарпэткі, захутваюцца ў коўдры, гутараць, гуртуюцца па рэгіёнах, адкуль прыехалі, ці проста сьпяць.

Група беларусаў — чатыры хлопцы ды дзяўчына з Гомелю — глядзяць на ўсё навокал, нібы на дзіва якое: «Не, у нас такога ня будзе...»

Тое, што можна пабачыць на Хрышчаціку, на Майдане, у Народным Доме — гэта ня мітынг. Гэта тая Ўкраіна, якую ўкраінцы хочуць збудаваць — краіна, дзе кожны мае, што есьці, дзе жыць, чым лекавацца, мае годны занятак ды ганарыцца тым, што ён украінец. Аднак гэта таксама не ідылія — на сьцяне вісіць фота хлопчыка, які згубіўся ў натоўпе ўжо пару дзён таму. Бацькі шукаюць.

«Мы — ветлівыя, мы — культурныя, мы — лагодныя!» — заклікае вядучы мітынгу на Майдане. За мэтраў сто ад сцэны на чыгуннай агароджы вісіць згублены шалік ды праз кожныя пяць хвілін спаўзае да зямлі. І кожны раз яго падымаюць ды зноў вешаюць на агароджу — мо знойдзецца гаспадар у мільённым натоўпе.

Зьмены ў паводзінах найлепш бачныя не гасьцям, а тым, хто добра дасьведчаны ў звычайных манерах украінскай сталіцы. «Кіеў — гэта досыць хамскі горад», — кажа філёзаф Віталь Панамароў, кіевец з 45-гадовым стажам. «Я ўпершыню бачу такое. Раней, нават калі зьбіралася ў дзесяць разоў менш людзей, магло здарыцца што заўгодна. На Хрышчаціку цяпер ня Кіеў, а ўся Ўкраіна. Сюды прыехалі людзі з захаду. Нават самыя простыя зь іх больш культурныя за кіеўцаў — бабця Аўстрыя!».



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Удзельнікі пратэстаў імкнуцца захаваць нармальны лад жыцьця. На фота: пункт зарадкі мабільнікаў ва Ўкраінскім Доме. Калі тэлефон прымаюць на зарадку, на яго клеіцца паперка з прозьвішчам уладальніка.**

## Беларускае рэха падзеяў

28 лістапада прадстаўнікі Партыі БНФ і грамадзянскіх рухаў Глыбоччыны правялі акцыю ў падтрымку дэмакратычных перамен ва Ўкраіне. Сямёра ініцыятыўных жыхароў пад кіраўніцтвам сябра Сойму ПБНФ Ярaслава Берніковіча раздалі на рынку самаробныя паяровыя сьцяжкі, на якіх было напісана «Так!» Юшчанку!» ды «За нашу і за вашу свабоду!»

**Юры Калбасіч, Глыбокае**

## Вайна чутак

**Паводле чутак, якія распаўсюджваюць палітычныя праціўнікі Юшчанкі, прычынаю жахлівых зьменаў у яго на твары стала праказа. А Віктар Януковіч захварэў цалкам афіцыйна: з тэмпэратураю 38,7 ён у сераду ня змог прысутнічаць на нарадзе эканамічнага блёку ўраду.**

## Апошняе слова

Па Эўрапейскай плошчы крочыць грузін, загорнуты ў белы сьцяг з чырвоным крыжам. «Украінцам трэба трошкі-трошкі быць больш гарачымі, бо час працуе супраць іх», — кажа Пата з Тбілісі. Пата глядзіць на паўсотні аўто, якія гулкім памаранчавым патокам спускаюцца па вуліцы Грушэўскага. З адчыненых вокнаў бухае рэпавае «Разам нас багата — нас не падалаты!» (не адолець).

З Майдану Незалежнасьці чуецца вокліч, ад якога трасуцца сьцены: «Юля! Юля!» На маніторы — твар Цімашэнкі. Наколькі адныя ня могуць трываць «газавай прынцэсы», настолькі ж іншыя яе любяць — і такіх на Майдане абсалютная большасьць. Зраўняцца зь ёю паводле папулярнасьці можа хіба Руслана, але ня зараз: Юля кажа, што нельга далей чакаць, што яна ня верыць ані ў якія перамовы. Майдан згодны. Але нават для каралевы Майдану апошняе слова — за народным прэзыдэнтам. Таму, калі натоўп зноў парываецца гарлаць яе імя, Юля гукае ў мікрафон «Ю-шчан-ка!».

«Шапкі гецьі!» панёсься вокліч. Зь першымі словамі гімну «Шчэ нэ вмэрла Ўкраїна!» сотні тысяч людзей — ад карпацкіх гуцулаў да вытанчаных студэнтак Кіева-Магілянкі — прыціскаюць абветраныя далоні да сэрца, схаванага пад барашкавым кажухом ці пад аранжавай балоньяй. У тым ліку і няголеныя маладзён, які толькі што мацюкамі ўхваляў «Юліны словы». На Майдане сьняжынкі не далятаюць да зямлі — растаюць ад подыху.

Абсалютна ясна, што Януковічу прэзыдэнтам ужо ня быць і расейская мова ня мае шанцаў стаць дзяржаўнай над Дняпром. Няясна, ці пераможа рэвалюцыя, ці стане прэзыдэнтам Юшчанка. Мо ўкраінскія алігархі яшчэ зацягнуць перамовы, сабʼюць энэргію масаў, зваляць на апазыцыю адказнасьць за эканамічны хаос і прасунуць замест Юшчанкі нейкага зручнага нацыяналістычнага лідэра. Ды гэта няважна. Галоўнае, што нацыя адчула сябе нацыяй.

*Кіеў—Менск*

# Украінскія спартоўцы: абапал барыкад



Уладзімер Клічко зь Віктарам Юшчанкам і Русланай на Майдане Незалежнасьці.

AP

**Спартоўцы, як і майстры культуры, не засталіся ў баку ад украінскіх падзей. У падтрымку Януковіча выступіла «залатая рыбка» Афінаў алімпійская чэмпіёнка Яна Клачкова. Браты Клічкі адразу выказаліся ў падтрымку Юшчанкі. Прычым Уладзімер адмыслова прыляцеў зь Нью-Ёрку ў Кіеў — каб паўдзельнічаць у мітынгу «аранжавых».**

Віктар Фядоценка, бацька ўладальніка Кубку Стэнлі-2004 форварда «Тампы» Руслана Фядоценкі, заявіў журналістам, што ягоны сын таксама неўзабаве прыедзе ў Кіеў, каб падтрымаць кандыдата ад апазыцыі.

26 лістапада 25 спартовых журналістаў напісалі адкрыты ліст, пратэстуючы супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў: «Мы глыбока заклапочаны сытуацыяй у краіне і падтрымліваем мірную акцыю на Майдане Незалежнасьці ў Кіеве і ва ўсіх гарадах і вёсках Украіны. Гэта наша грамадзянская пазыцыя.

Мы заклікаем кіраўнікоў СМІ не выкарыстоўваць спартовую журналістыку як сродак палітычнай агітацыі. Мы адмаўляемся выкарыстоўваць этэр спартовых праграм і трансьляцый для палітычных заяў, інфармацыі і камэнтароў, што маюць палітычны падтэкст. Спартовая журналістыка — не пляцдарм для палітычных баталій».

Футбалісты падзяліліся. Цягам 14 гадоў спрэчку за першае месца ў чэмпіянаце вядуць непрымірымыя супернікі — кіеўскае «Дынама» і данецкі «Шахцёр». Але перад выбарамі яны былі разам — і прэзыдэнт кіеўскага «Дынама» Ігар Суркіс, і прэзыдэнт «Шахцёра» (Данецк) Рынат Ахметаў, як і старшыня Украінскае фэдэрацыі футболу Рыгор Суркіс, уваходзяць у каманду Януковіча.

Незадоўга да 21 лістапада лідэр «Міляну» і зборнай Украіны Андрэй Шаўчэнка з тэлээкрану заклікаў грамадзян прагаласаваць за Януковіча. Для многіх заўзятараў гэта стала шокам. На матчы Лігі чэмпіёнаў «Мілян»—«Шахцёр» 24 лістапада ўкраінскія заўзятары на цэнтральнай трыбуне «Сан-Сыра» вывесілі плякат на ўкраінскай: «Юшчанка — наш прэзыдэнт». Камісар УЭФА загадаў згарнуць плякат, а праз нейкі час дэлегаты УЭФА зьнялі яшчэ адну расьцяжку, гэтым разам напісаную па-італьянску: «Шаўчэнка, сорам! Твой выбар прымусіў украінскі народ плакаць».

Італьянская прэса адрэагавала імгненна: на наступны дзень найбуйнейшае спартовае выданьне «Газэта дэля Спорт» выйшла пад загалоўкам «Украінскія плякаты супраць Шаўчэнкі».

Выступіў у падтрымку прэм’ер-міністра і галкіпэр кіеўскага «Дынама» Андрэй Шаўкоўскі. На януковічаўскай акцыі «Дэмакратычная ініцыятыва» ён заявіў, зьвяртаючыся да апазыцыі: «Як футбаліст я лічу, што трэба ўмець прайграваць».

А вось большасьці гульцоў «Дынама» палітычная сытуацыя, відаць, «да лямпачкі». Бо касьцяк клюбу складаюць легіянэры зь Беларусі, Бразыліі, Марока, Румыніі, Сэрбіі, Харватыі, Узбэкістану і г.д. У «Шахцёры» украінцаў яшчэ меней.

Форвард левэркузэнскага «Баеру» і зборнай Украіны Андрэй Варонін больш асьцярожны ў выказваньнях: «Я не хацеў бы казаць, за каго галасаваў на выбарах. Кожны чалавек мае ўласную думку. Хлопцы, якія гуляюць у зборнай, таксама маюць уласную думку».

А вось былыя гульцы «Дынама» і нацыянальнай зборнай Сяргей Рэброў і Алег Лужны адкрыта сталі на бок Юшчанкі.

Рэброў, ураджэнец Данбасу, разам з усёй сям’ёй прыйшоў у Лёндане да помніка Сьвятому Ўладзімеру на мітынг у падтрымку Юшчанкі. А Алег Лужны на мітынгу ў брытанскай сталіцы заклікаў суайчыньнікаў змагацца за праўду, заявіўшы, што на выбарах перамог Юшчанка, а ўлады сфальсыфікавалі іх вынікі. Колішні капітан «Дынама» раскрытыкаваў галоўнага трэнэра Алега Блахіна, які прысьвяціў перамогу ў Стамбуле ў матчы адборачнага турніру над зборнай Турцыі (3:0) Януковічу: «Блахін ня мае права так казаць ад імя ўсёй каманды. Ня думаю, што ўсе гульцы нацыянальнай зборнай пагаджаюцца зь ягонымі словамі».

Тым часам у пятніцу, 25 лістапада, Дзяржкамспорт прыняў рашэньне, што ўсе спартовыя мерапрыемствы ў краіне, апроч футболу, да 10 сьнежня адмяняюцца. І як у ваду глядзелі. У мінулы ўік-энд не былі згуляныя два матчы футбольнага чэмпіянату. «Закарпацьце» (Вужгарад) «ня здолела» (такая фармулёўка) выехаць у Сімферопаль на матч з «Таўрыяй». А матч на захадзе краіны, у Луцку, паміж мясцовай «Валыньню» і «Шахцёром» быў перанесены «паводле ўзаемнай згоды бакоў». Наведнікі сайтаў іранізуюць: «Футбалісты Данецку баяцца выходзіць на поле ў аранжавай форме» (традыцыйныя колеры «Шахцёру»). Хоць чаго ім баяцца ў такой форме ў заходнеўкраінскім горадзе? Вось каб кіеўскае «Дынама» прыехала ў Луцк у сваіх традыцыйных бела-сініх колерах…

Проста ня верыцца, што калісь такія падзеі здарацца і ў Беларусі. Ня верыцца, што ў нас спартовыя журналісты афіцыйных каналаў набяруцца сьмеласьці і выступяць калі-небудзь з адкрытым лістом да грамадзкасьці. Як, зрэшты, і спартоўцы, што амаль як адзін падтрымліваюць «генэральны курс партыі».

Таму ўжо не выклікае нічога, акрамя зубнога болю, апошні абзац справаздачы прэсслужбы прэзыдэнта аб удзеле А.Лукашэнкі ў Алімпійскім сходзе, дзе яго пераабралі кіраўніком НАК: «Па шматлікіх просьбах прадстаўнікоў спартовае грамадзкасьці Беларусі кандыдатуру Аляксандра Лукашэнкі вылучыла алімпійская чэмпіёнка Юлія Несьцярэнка».

**Алег Раявец**

ГАЗЭТНЫ ШАПІК

# «Экзамэн правалены» — «Параза Крамля»

## «Беларусь сегодня» і «Народная воля» пра падзеі ва Ўкраіне

Пасьлявыбарная сытуацыя ва Ўкраіне знайшла сваё адлюстраваньне на старонках беларускіх газэт: у адных выклікала шчырую зайздрасьць, у іншых — раздражненьне.

Ва Ўкраіне ўжо пайшоў другі дзень рэвалюцыі, а першыя матэрыялы ў беларускіх газэтах на тэму ўкраінскіх выбараў зьявіліся толькі ў аўторак 23 лістапада праз маруднасьць друку, што адпачывае ў панядзелак. На першых палосах «Народнай волі» ды «Беларуси сегодня» здымкі прыхільнікаў лідэра апазыцыі Віктара Юшчанкі. Толькі што здымак з кіеўскага Майдану Незалежнасьці «Народная воля» падпісала «Вось так Украіна адстойвае сваю будучыню», а ў «Беларуси сегодня» здымак быў ілюстрацыяй да артыкулу «Гучная украінская ноч».

Абодва выданьні падаюць напачатку афіцыйныя вынікі другога туру выбараў. «НВ» прыводзіць таксама вынікі абодвух агульнаўкраінскіх сацапытаньняў, паводле якіх Юшчанка пераканаўча перамог, і спыняецца на мэханізмах фальсыфікацый ва ўсходніх абласьцях. Свайго карэспандэнта «НВ» ва Ўкраіне ня мела.

«СБ» не хавае свайго скептычнага стаўленьня да сытуацыі і крытыкуе ўсіх без разбору. Карэспандэнт «СБ» Ігар Кольчанка быў у цэнтры рэвалюцыі... і не заўважыў рэвалюцыі. Ён губляецца ў дробязях ды неістотных дэталях (праз самацэнзуру?) і аказваецца няздольны адчуць «дух часу», які толькі і можна адчуць на месцы падзеяў. Рэдакцыя «СБ» нават мусіла дадаць свае тлумачэньні. «Нашаму спэцыяльнаму карэспандэнту можна толькі паспачуваць, — пачынаецца рэдакцыйны камэнтар. — Сёньня ў засьнежаным Кіеве, сярод мітусьні і супярэчлівых чутак, вельмі складана ня толькі знайсьці эксклюзіўную інфармацыю для газэты, але й увогуле зразумець, што там адбываецца». З засьнежанага Менску, мяркуючы, усё бачна і зразумела значна лепш. Камэнтатар «СБ» бязь лішняе палітычнае карэктнасьці і проста чалавечае спагады піша пра Юшчанку: «Майкл Джэксан у лепшыя гады. Твар — у горшыя». І праводзіць поўныя недарэчнасьцяў гістарычныя паралелі: «Гэта ўжо папахвае норавамі эпохі Дырэкторыі, калі палітыкі Букавіны і Карпат пайшлі на адкрытую канфрантацыю з тагачасным палітычным Харкавам», — разьлічаныя на аўдыторыю, якая кепска ведае, што такое Букавіна і чым быў тагачасны Харкаў. «СБ» старанна падтрымлівае стэрэатып падзелу Украіны на Захад і Ўсход, піша пра падтрымку Юшчанкі ў заходніх абласьцях і Януковіча ва ўсходніх, ні слова ня кажучы пра тое, што ва ўсходніх Палтаўскай, Сумскай, Чарнігаўскай абласьцях Юшчанка атрымаў пад тры чвэрці галасоў. Камэнтатар хваліць Маскву за апэратыўнасьць: Пуцін першы павіншаваў Януковіча зь перамогай.

Прызнаньне ўкраінскім ЦВК перамогі Януковіча «СБ» пракамэнтавала як факт, які не выклікае сумненьняў, пацьвярджаючы яго думкай беларускіх назіральнікаў у складзе місіі СНД. «НВ», у сваю чаргу, зьвярнула ўвагу на тое, што толькі назіральнікі ад СНД ня ўбачылі сур’ёзных парушэньняў, у той час як паводле міжнародных назіральнікаў галасаваньне ў другім туры выбараў не адпавядала прынятым у Эўропе дэмакратычным нормам. «НВ» у некалькіх нумарах запар прыводзіла вытрымкі з сусьветнай прэсы адносна падзей ва Ўкраіне.

Найбольшую цікавасьць выклікаюць, аднак, камэнтары газэт наконт магчымага ўплыву ўкраінскіх падзей на сытуацыю ў Беларусі. У першыя дні «НВ» друкавала толькі храналёгію ды распавядала пра міжнародную рэакцыю на ўкраінскія выбары, але ўжо 25 лістапада зьявіўся вялікі ўласны матэрыял. Паводле Вячаслава Оргіша, на Ўкраіне адбылося «несумненнае паражэньне стратэгічных і тактычных схем Крамля, якія ён спрабуе ажыцьцяўляць на былой постсавецкай прасторы». Галоўнае адрозьненьне Беларусі ад Украіны — адсутнасьць моцнай і палітычна актыўнай грамадзянскай супольнасьці. Менавіта яна змагла аказаць магутную падтрымку лідэру ўкраінскай апазыцыі і даць упэўненасьць у канчатковай перамозе дэмакратыі. На падобнае разьвіцьцё падзей у Беларусі ў найбліжэйшы час разьлічваць не прыходзіцца, тым ня менш, з часам падобны рэсурс палітычнай актыўнасьці можа зьявіцца. «Украінскі ўрок можа падштурхнуць Маскву не зацягваць з рашэньнем праблемы ўстанаўленьня свайго стаўленіка ў Менску, пакуль Захад не пасьпеў падрыхтаваць сытуацыю ў Беларусі, каб нейкі апазыцыянэр не паўтарыў «фінт» Юшчанкі ў Менску», — падсумоўвае «НВ».

У «СБ» Беларусь увогуле ня згадвалася, але паралелі ўсё ж праводзіліся. «Украіна будавала грамадзянскую супольнасьць паводле заходняга ўзору. З палітычнымі партыямі, прыватнымі тэлеканаламі. Выбары сталі для Ўкраіны тэстам на сьпеласьць. Экзамэн правалены». Анафэма! Анафэма!.. У выніку ў суботнім нумары «СБ» за 27 лістапада пра Ўкраіну ўжо не было ні радка, як і ў большасьці выпускаў БТ.

**Алесь Трафіменка**

# Аранжавая рэвалюцыя

## «Украінцы ўбачылі, што яны — нацыя»

**«Гісторыю можна выкарыстоўваць як бомбу запаволенага дзеяньня, але ў Януковіча няма адмыслоўцаў, якія гэтую бомбу маглі б завесьці. Раскол Украіне не пагражае. Фінансавыя інтарэсы данбаскіх кланаў — ва Ўкраіне». Карэспандэнт «НН» гутарыць з гісторыкам Натальляй Якавенкай, загадчыцай катэдры гісторыі Нацыянальнага ўнівэрсытэту «Кіева-Магілянская Акадэмія».**

**«НН»: У Расеі апошнімі днямі шмат і, я б сказаў, з асаладою гавораць пра магчымы раскол Украіны на Захад і Ўсход ці, калі быць геаграфічна дакладным, на Поўнач і Поўдзень. Гэта сапраўды рэальна?**

**Натальля Якавенка:** Раскол, пра які цяпер кажуць, — гэта не прадукт старога расколу паміж казацкай Украінай ды астатняй Украінай, гэта прадукт падзелу Рэчы Паспалітай канца XVIII ст., калі Львоўская, Івана-Франкоўская ды Цярнопальская вобласьці ўвайшлі ў склад Аўстрыйскай, пазьней — Аўстра-Вугорскай імпэрыі. Аўстра-Вугоршчына развівалася пасьля «вясны народаў» крыху іншымі шляхамі. Дзякуючы адносна лібэральнай палітыцы дзяржавы ўсё, што можна было назваць украінскім, было ў гэтай частцы Ўкраіны найбольш арганізаванае. Пасьля няўдалай спробы стварыць адзіную Ўкраіну ў 1917—1919 г. Захад увайшоў у склад Польскай дзяржавы. Украінскае грамадзтва было дастаткова палітычна сьпелым, таму барацьба працягвалася на розных узроўнях. Як гэта было ўласьціва ўсёй Эўропе ў міжваенны пэрыяд, украінская меншасьць, вядома ж, захварэла на таталітарызм. Гэта быў «цайтгайст», дух часу паміж дзьвюма войнамі. Такі радыкальны нацыяналізм — мы яго называем цяпер інтэгральным нацыяналізмам — вельмі моцна дае знаць аб сабе ў часе вайны і пасьля вайны.

Гэта быў пэрыяд актыўнай палітычнай барацьбы, пад уласнымі лёзугамі, зь велізарнай ахвярнасьцю — вы ж ведаеце, што першым запаветам украінскіх нацыяналістаў было «здабыць украінскую дзяржаву або загінуць у барацьбе за яе». Гэтымі ідэямі былі ахоплены нават звычайна пасіўныя групы насельніцтва. І з такім багажом яны ўвайшлі ў Савецкі Саюз.

Усходняя частка Ўкраіны ўвайшла ў СССР з багажом досьведу калектывізацыі, голаду, рэпрэсіяў, замбаваньня савецкай ідэалёгіяй. Тая, другая палова Ўкраіны была ўжо гатовая да таго, што зь яе пачалі ляпіць пасьля вайны, гатовая да таго, каб стаць саўкамі. Гэта не выключае квазыдысыдэнцкіх настрояў, непрыманьня савецкага ладу, але гэта звычайны інтэлігенцкі насмарк, а ня той сур'ёзны супраціў рэжыму, да якога быў гатовы Захад. І таму, як толькі пачалася перабудова, Захад выйшаў ладзіць знакамітыя пікеты на Краснай плошчы за легалізацыю грэка-каталіцкай царквы. Рух пачаўся з Захаду, і гэта заканамерна.


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

Натальля Якавенка — доктарка гістарычных навук, прафэсарка, аўтарка фундамэнтальнага падручніка «Нарысы гісторыі Ўкраіны».

**«НН»: Дык ці ёсьць цяпер раскол?**

**НЯ:** Пытаньне далікатнае. Каб адказаць на яго, трэба строга дамовіца пра тэрміны. Што вы ўкладаеце ў панятак расколу? Бо гэта — слова небясьпечнае.

**«НН»: Скажам, ці адчуваюць сябе грамадзянамі Ўкраіны большасьць яе жыхароў?**

**НЯ:** Такога расколу няма. Гэтыя дзіўныя хлопцы, зь не зусім інтэлігентнымі, мякка кажучы, тварамі, якіх выдаюць за шахцёраў, на самай справе, відаць, звычайныя расканваяваныя зэкі; яны таксама называюць сябе грамадзянамі Ўкраіны, і падобна да таго, што яны ня хлусяць. Яны таксама адчуваюць сябе ўкраінцамі. Яны нам ня вельмі падабаюцца, але брата ці сястру не выбіраюць. За гэтыя гады незалежнасьці ўсе звыкліся адчуваць сябе ўкраінцамі — ня кожны гэтым ганарыцца, але ўсе ідэнтыфікуюць сябе зь дзяржавай Украінай.

**«НН»: Можа, гэта раскол паводле ўяўленьняў пра палітычны лад дзяржавы?**

**НЯ:** Людзі, якія галасуюць за Януковіча, менш за ўсё думаюць пра палітычны лад. Яны даволі туманна ды стыхійна яго адчуваюць. Хутчэй, гаворка ідзе аб тым, ці ісьці нам разам з СНД, ці ісьці разам з Захадам. Але тое, што мясцовыя рады на ўсходзе жадаюць «аддзяліцца», не азначае, што гэтага ж жадае і народ. Рады ў «чырвоных» абласьцях, як Данецкая, Луганская ды Запароская, не зьяўляюцца выбранымі ў строгім сэнсе гэтага слова. Гэта ці самі алігархі, ці купленыя імі палітыкі. Што да заяваў пра заснаваньне аўтаномных утварэньняў, дык я схільна думаць, што гэта проста казырная карта, якую выцягваюць з рукава з мэтай пабіць іншую казырную карту, а не сапраўдныя пагрозы. Фінансавыя інтарэсы гэтых людзей — ва Ўкраіне.

### Часткі павінны прыцерціся

**«НН»: Дык паводле чаго праходзіць раскол?**

**НЯ:** Раскол можа быць у непадабенстве: я бачу, што нацыя ствараецца, але гэта яшчэ не азначае, што яна ёсьць. Розныя яе часткі павінны прыцерціся адна да адной. Ёсьць розьніца мэнтальная, у паводзінах, зьвязаная з ладам жыцьця, з моваю, гэтая сума розьніц павінна перарасьці ў розьніцу, пра якую расказваюць анэкдоты, — так заўжды бывае ў такой буйной нацыі, але гэта не выклікае непрыманьня злоснага. Пакуль што гэта злуе, і ў гэтым можа быць пэўны раскол. «Яны нам непрыемныя, яны нам чужыя». Хаця гэтае палітычнае ўзбурэньне стварыла агульную абалонку: выявілася, што мы ня проста насельніцтва Ўкраіны, а народ Украіны і гэтую дзяржаву мы ня хочам мяняць ні на якую іншую. Але ўнутры мы яшчэ вельмі розныя.


WWW.DNI.RU

А тлумачыць усё расколам у гістарычнай памяці… Гэта любяць рабіць журналісты ды палітолягі. Дзе яна, тая гісторыя? У школьным падручніку? Тыя, хто ваявалі на захадзе Ўкраіны, і тыя, хто хочуць

> Стварыць дзяржаву, за якую не было б сорамна, — новая ідэя, што яднае ўкраінцаў.

сьвяткаваць перамогу ў вялікай айчыннай вайне. Але іх вельмі мала. Няхай яны жывуць да ста год, але некалі гэтых людзей ужо ўвогуле ня будзе, то ня будзе і прычыны для размовы. Гэтых людзей засталося некалькі тысяч, але тых, хто іх памяць эксплюатуе, — шмат. Але ж гэта розныя рэчы. Большасьць украінцаў усур'ёз ня ўспрымуць размоў, што ў Заходняй Украіне спрэс «бандэраўцы». Людзей, якія тут ваявалі, так шмат, што яны кажуць ужо проста кранальныя, забаўныя рэчы. Яны так пры гэтым гарачацца. Я была сьведкай сцэны ў тралейбусе, калі два старыя — абодвум гадоў па 75—78 — праехалі два прыпынкі і ўвесь гэты час сварыліся. Кожны ўжо барвовы, у кожнага ціск ужо павышаны, рукі дрыжаць. Дзьверы расчыняюцца, і той, хто выходзіць, тыцкае пальцам на таго, хто сядзіць: «Савецкі прыхвасьцень!» А той падымаецца і такім самым жэстам тыцкае ў яго ды крычыць: «Бандэраўская сволач!» Як успрымаць гэтых двух старых? Іх проста шкада.

Раскол, які спрабуе навязаць бок Януковіча, — гэта прыдумка, прадукт творчасьці маскоўскіх паліттэхнолягаў. Перш за ўсё спадара Паўлоўскага. А карані — дрэннае веданьне гісторыі. Палітолягі — людзі спрытныя, але ня вельмі адукаваныя. Гэта журналісцка-паліталягічнае ўспрыманьне гісторыі: яны бачаць тое, што ляжыць на паверхні і на чым, як ім здаецца, лёгка згуляць, але гэтага, на чым гуляюць, на самай справе няма. Заходнія палітолягі кажуць пра раскол таксама з прычыны павярхоўнасьці, браку адукаванасьці, дый сярод іх хапае тых, каго аплачваюць з маскоўскай кішэні. Гісторыя тут ні пры чым, яе можна выкарыстоўваць як бомбу запаволенага дзеяньня, але на самай справе гісторыя прайшла — яе няма. У сёньняшніх паліттэхнолягаў Януковіча няма адмыслоўцаў, якія гэтую бомбу маглі б завесьці.

### Якая нацыянальная ідэя

**«НН»: Станаўленьне нацыі — на грунце якой нацыянальнай ідэі?**

**НЯ:** Я не зусім ведаю, што такое нацыянальная ідэя. Але я паспрабую адказаць на ваша пытаньне. Гэта, калі зыходзіць з майго разуменьня, жаданьне, якое аб'ядноўвае большасьць электарату. Некалі Гарант сказаў, што «нацыянальная ідэя» не спрацавала. Відавочна, мелася на ўвазе ўкраінская ідэя, ідэя ўкраінскасьці Ўкраіны. Я думаю, у такой этнічна пярэстай дзяржаве, як украінская, нацыянальная ідэя ня можа быць украінскай. Гэта не супярэчыць таму, што дзяржаўная мова павінна быць украінскай, што школа павінна быць арыентаваная на ўкраінскую гісторыю. Але гэта ня можа быць украінскім у рамантычна-нацыянальным сэнсе. Трэба адшукаць тое супольнае, чаго жадаюць усе. Мы ж, гісторыкі, павінны стварыць такую школьную гісторыю — вы ж ведаеце, што школьная гісторыя ніколі не адпавядае праўдзе, яна прызначана для выхаваньня, — стварыць школьную гісторыю, дзе апавядалася б праўда, але больш-менш бесканфліктна, а гісторыкі будуць пісаць аб'ектыўныя навуковыя працы.

Мэта, што магла б быць супольнай для ўсіх, за гэтыя дні больш-менш вызначылася — гэта выкінуць з Украіны мафіёзную бандыцкую ўладу, зрабіцца нармальнай дзяржавай, якая жадае ісьці разам з усімі людзьмі, а не тварыць генацыд з Пуціным у Чачні. Як сказала Руслана: «Каб мне не было сорамна казаць паўсюль, што я ўкраінка». Стварыць дзяржаву, за якую не было б сорамна. Па-мойму, добрая ідэя. Жыць па законах, а не «па паняцьцях».

У нас згодна з палітычнай замовай стваралася «дзяржаўна-нацыянальная» гісторыя, усьпявалася дзяржаўнасьць. Адна гісторыя, якую гісторыкі пішуць, другая — якую дзеткі вывучаюць. Але адна з галоўных заваёў пачатку 1990-х — тое, што былі абноўлены падручнікі гісторыі. Тыя маладыя людзі, якія стаяць на Майдане, якія пайшлі ў школу на пачатку 1990-х, — гэта дзеці новых падручнікаў і новай школы.

### Роля лідэра

**«НН»: Падручнікі адыгралі больш ролі, чым фігура Ючшанкі? Лідэрамі нараджаюцца, ці іх робіць народ?**

**НЯ:** Харызматычныя лідэры, такія, якім быў, напрыклад, Ельцын у Расеі, для Ўкраіны не характэрныя. Апошні харызматычны лідэр, якога я магу прыгадаць, — гэта Багдан Хмяльніцкі. Харызматычны лідэр нараджаецца і вядзе за сабой грамадзтва ў крытычныя часы. Але нярэдка бывае й так, што лідэра выносіць і робіць лідэрам народ. Ючшанка заўжды быў звычайным, інтэлігентным палітыкам, які з дастаткова добрай жэстыкуляцыяй прамаўляў ардынарныя рэчы. Так, ён зьбіраў тысячы прыхільнікаў, але менавіта лідэрам ён зрабіўся за апошнія дні. Беларускі народ, як і ўкраінскі, звычайна спакойны, ня схільны да захапленьня лідэрамі. Для гэтага патрэбны зьбег акалічнасьцяў.

**«НН»: Падзеі лістапада — гэта новы 1648 год?**

**НЯ:** Я, гісторык, які дасьледуе XVI—XVII ст., скептычна стаўлюся да ўсіх аналёгій паміж даўнейшымі часамі ды сучаснасьцю. У XVI—XVII ст. мы яшчэ ня можам казаць пра ўкраінскую нацыю. Гэта абсалютна розныя часы, розныя грамадзкія структуры. Калі й можна праводзіць гістарычныя паралелі, то хіба толькі з рэвалюцыйнымі падзеямі 1917—1919 ды 1989—1991 г. Тое, што адбывалася ў 1917—1919 г., мела нашмат меншы маштаб, дый даўно гэта было. А пры канцы 1980-х мы самі былі ўдзельнікамі падзей. 15 гадоў таму, на пераломе, украінцы ўбачылі, што яны ёсьць. Цяпер украінцы ўбачылі, што яны — нацыя. Тое, што адбываецца цяпер, увойдзе ў кнігі гісторыкаў як «аранжавая рэвалюцыя». Гэта фэнамэнальная зьява, бо на нашых вачах з масы нарадзіўся народ.

*Гутарыў Алесь Кудрыцкі, Кіеў*

# Рабаўнік Ягайла,

Адам Воршыч

**Што цікавага ў новых дасьледаваньнях беларускіх гісторыкаў? Беларускую гісторыю апошнія гады перасьледуюць скандалы, але яны часьцей зьвязаны з палітыкай — напрыклад, забаронай падручнікаў, чым зь нечаканымі канцэпцыямі й адкрыцьцямі. Тым цікавей зазірнуць у «творчыя лябараторыі» навукоўцаў і даведацца, якое ж «варыва» там гатуецца.**



Першыя крокі інтэграцыі. Супольны сойм Паноў-Рады ВКЛ і польскага Сэнату. Гравюра 1506 году.

## Наш захопніцкі Грунвальд

Генадзь Сагановіч, дасьледуючы вайсковую гісторыю сярэднявечнай Беларусі, прыйшоў да высновы, што неабходна перагледзець стэрэатыпныя ўяўленьні пра Нямецкі ордэн. На ягоную думку, роля Нямецкага ордэну ў нашай гісторыі больш пазытыўная, чым было прынята лічыць, і дачыненьні зь ім вызначаліся далёка не адной варожасьцю. «Грунвальдзкай (Дубровенскай) бітвы, якая ў нас так услаўляецца, магло і ня быць — да яе прывяла, хутчэй, гульня суб'ектыўных фактараў», — кажа гісторык. У тым, што бітва ўсё ж адбылася, «вінаватымі» ён называе князёў — Вітаўта, а асабліва Ягайлу.

На час Грунвальду ваенны патэнцыял Ордэну ўжо істотна саступаў сілам Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, так што «ратаваць» славянскія землі ад тэўтонцаў не было ніякай патрэбы: «Як толькі Ордэн ні спрабаваў замірыцца зь імі. Але Вітаўт зь Ягайлам бачылі, што Ордэн імкліва траціць сілы, і вырашылі гэтым скарыстацца. Колькі тады было нарабавана!..» Што праўда, на агульным тле тагачаснай эўрапейскай палітыкі паводзіны Вітаўта зь Ягайлам былі не выняткам, а правілам.

Зыходзячы з гэтых фактараў, Сагановіч лічыць неабходным прыменшыць рэальнае значэньне Грунвальдзкай перамогі ў параўнаньні зь сёньняшнім уяўленьнем. Цяпер гісторык працуе над кнігай, у якой дасьць сваё бачаньне беларуска-нямецкіх дачыненьняў таго часу. Другая ягоная гістарычная праца — падзеі Хмяльніччыны ў Беларусі, часткова закранутыя ў «Невядомай вайне». У другой кнізе, над якой працуе, Сагановіч даказвае, што паўстаньне на чале з Хмяльніцкім у беларускіх паветах успрымалася зусім ня так, як на Ўкраіне. У нас казацкая вайна была зусім не вызвольнай. Невыпадкова і спадзяваных посьпехаў у Беларусі казакі не дамагліся.

## Люблінская унія й дзьве Рэчы Паспалітыя

Андрэй Янушкевіч называе сябе вузкім спэцыялістам, бо сфэра ягоных навуковых інтарэсаў укладаецца ў 15-годзьдзе. Але якое! З 1555 па 1570 г. — сюды ўплішчыліся і падзеі Інфлянцкай вайны, і Люблінская унія.

Дасьледчык называе гістарычным мітам меркаваньне, што інтарэсы магнатаў і шляхты ВКЛ напярэдадні уніі разышліся: маўляў, шляхта хацела далучыцца да Польскай Кароны, каб валодаць тымі ж «залатымі вольнасьцямі», а магнаты абаранялі незалежнасьць Княства. Па-першае, калі ім і было што абараняць, дык толькі карпаратыўныя інтарэсы. Па-другое, крыніцы паказваюць, што на самай справе магнаты не выступалі супраць уніі, нават тыя ж Радзівілы. Янушкевіч кажа, што за унію шляхта й магнаты Вялікага Княства выступалі разам: «Аналіз вядомага пасланьня 1562 г., у якім шляхта патрабавала польскіх «залатых вольнасьцяў», паказвае, што там ня ставілася пытаньне пра унію, тым больш — пра далучэньне да Польшчы. Толькі — супольная абарона ад іншаземных агрэсараў, элекцыя (выбары — **Рэд.**) будучага гаспадара, стварэньне адзінага прававога поля. Яна зусім не разыходзілася з магнацкімі прапановамі». Іншая рэч, што гэтае бачаньне уніі розьнілася ад польскага. Ужо ў 1563 г. вымалеваліся два асноўныя праекты: палякі выступалі за інкарпарацыю ВКЛ, ліцьвіны (і шляхта, і магнаты) прапаноўвалі больш «мяккі» варыянт, настойваючы на захаваньні асобнага Сойму. Радзівілы нават вылучылі праект «дзьвюх Рэчаў Паспалітых»: мы бяром усё найлепшае з вашай польскай шляхецкай дэмакратыі ды ўводзім гэта ў сябе, а уніі ніякай ня трэба! У вас свая Рэч Паспалітая і шляхецкая дэмакратыя, у нас — свая. І гэтыя рэформы набіралі вагу: у ВКЛ яшчэ да уніі была створана аснова для шляхецкай дэмакратыі, і шляхта была ёй задаволеная. «Іншая рэч, што тая дэмакратыя мела пераважна фармальны характар: шляхта была амаль пад поўным кантролем магнатэрыі. Але й Люблінская унія ня стала перамогай шляхты. Гэта была агульная параза ВКЛ», — кажа гісторык.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Генадзь Сагановіч: Роля Нямецкага ордэну ў нашай гісторыі больш пазытыўная, чым было прынята лічыць, і дачыненьні зь ім вызначаліся далёка не адной варожасьцю.

Унія была падпісана толькі пасьля таго, як Жыгімонт Аўгуст адарваў ад Княства землі Падляшша і Ўкраіны. «Пазьнейшыя саступкі ліцьвінам: шырокая ўнутрыпалітычная аўтаномія, сымболіка, тытулятура, асобнае заканадаўства — усё тое, чым мы сёньня ганарымся, было фармальнасьцю. У рэчаіснасьці Польшча валодала большымі рэсурсамі (і чалавечымі, і тэрытарыяльнымі, і гаспадарчымі), і на соймах прадстаўніцтва Кароны было ў некалькі разоў большым, чым Княства. Так мы апынуліся на другіх ролях у дзяржаве», — канстатуе Янушкевіч.

Дарэчы, перад падпісаньнем уніі Жыгімонт Аўгуст зрабіў адмысловыя захады, якіх не пасаромеліся б і сучасныя паліттэхнолягі. У 1567 г. ён асабіста прыехаў узяць удзел у абвешчаным паспалітым рушаньні. Прыезд гаспадара дзяржавы на вайну прыцягнуў надзвычайную колькасьць шляхты — блізу 30 тыс. чалавек; больш за гэтую колькасьць на той час сабраць у адным месцы было проста немагчыма. Скарыстаўшыся з гэтага, вялікі князь і кароль правёў своеасаблівы «шляхецкі рэфэрэндум». У вёсцы Лебедзева (цяперашні Маладэчанскі раён) адбыўся зьезд, на рашэньні якога абапіраўся Жыгімонт Аўгуст, «прабіваючы» праект уніі: магнатэрыя не магла рабіць выгляд, што шляхецкага рашэньня не было. А Жыгімонт Аўгуст скарыстаўся згодай шляхецкай масы на скліканьне агульнага сойму з палякамі, дзе мела б вырашыцца пытаньне уніі.

## Шляхцянка, спартанка, паўстанка

Супрацоўніца Інстытуту гісторыі Натальля Анофранка вывучае гісторыю жанчын першай паловы XIX ст. Кажа, што займаецца ня гендэрнай гісторыяй, а…



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Андрэй Янушкевіч: Люблінская унія ня стала перамогай шляхты. Гэта была агульная параза ВКЛ. Пазьнейшыя саступкі ліцьвінам: шырокая ўнутрыпалітычная аўтаномія, сымболіка — усё тое, чым мы сёньня ганарымся, было фармальнасьцю.



Вітаўт Вялікі. Літаграфія Міхася Басалыгі.

# тэрарыст Луцкевіч

жаночай. Кажа, што для гендэрных дасьледаваньняў (параўнаньне статусу, сацыяльнай ролі мужчыны й жанчыны) у Беларусі не напрацаваны матэрыял: у нас бяруць за аснову заходнеэўрапейскія, польскія, расейскія схемы й накладаюць на нашы падзеі. Між тым, уласныя гістарычныя крыніцы яшчэ не дасьледаваныя.

З 2-й паловы XVIII ст. ліцьвінскія шляхцянкі адчувалі сваю грамадзкую ролю як маці — спартанкі, грамадзянкі, абавязаныя выхоўваць маладое пакаленьне ў патрыятычным духу. Гэта вяло да канфліктаў: у Рэчы Паспалітай жанчыны маглі прысутнічаць нават на пасяджэньнях Сойму, а пасьля далучэньня да Расейскай імпэрыі яны пачалі траціць у правах. Дасьледніца прыводзіць такі прыклад: «Ізабэла Чартарыйская была натхняльніцай супраціву. Кацярына II яе шантажавала: забрала ў Пецярбург двух ейных сыноў — Адама і Канстанціна, гаворачы, што Ізабэла выхавала сваіх дзяцей у варожым духу і зрабіла гэта спэцыяльна!» Для таго каб зьмяніць палітычную сытуацыю, імпэратар пачаў займацца справамі жаночага выхаваньня.

Паўстаньне 1830—1831 г. паказала, што дагэтулешняе навучаньне, не кантраляванае ўладай, не дае плёну: жанчыны былі носьбітамі традыцый, захавальніцамі патрыятычнага духу. «Як бы ні выхоўвалі мужчын у дзяржаўных навучальных установах Расейскай імпэрыі, яны, вяртаючыся дадому, траплялі пад жаночы ўплыў — і станавіліся ворагамі ўлады», — кажа Анофранка. Каб запабегнуць гэтаму, дзяржава занялася стварэньнем жаночых пансіёнаў: выхоўвалі вернасьць Расейскай імпэрыі, навучалі толькі па-расейску, вучылі гісторыі Расеі.

У першай палове XIX ст. мяняецца статус жанчыны: у Рэчы Паспалітай яны валодалі маёмаснымі правамі, цяпер — не. Афіцыйны погляд быў такі: тут жанчына мае больш маёмасных правоў, таму яна разбэшчаная, яна павінна залежаць ад мужа. «Трэба ўявіць, якая колькасьць насельніцтва пазбавілася правоў — ня толькі шляхцянкі, але й мяшчанкі! Нават калі ў сям'і былі добрыя адносіны, муж ня мог перадаць жонцы частку сваёй маёмасьці. Не сумняюся, што тут павінны былі ўзьнікаць канфлікты, але гэтая сфэра ў нас яшчэ ня вывучаная», — адзначае спн.Натальля. Зьмяняўся і сам выгляд ды статус сям'і: у Расеі сям'я кантралявалася кананічным правам, парадкамі Расейскай праваслаўнай царквы. А ў нас жа былі яшчэ каталікі, пратэстанты, уніяты…

Яшчэ адна праблема, якая цікавіць дасьледніцу, — жанчыны ў паўстаньнях і войнах. Што магла рабіць сьвецкая паненка ў вайну? Ствараць грамадзкую думку, грамадзкае стаўленьне. Існавала нават палітычная спэкуляцыя ў гэтым сэнсе: «Упадабаньні падзяліліся паміж Напалеонам і Аляксандрам I. На балях, у салёнах сыходзіліся паненкі й паны ды адстойвалі свае меркаваньні: хто больш прыгожы, больш галянтны… Выкарыстоўвалі гэта й імпэратары. Графіня Патоцкая прыгадвала, як у Варшаве жанчын падчас ужо няпэўнай палітычнай сытуацыі напалеонаўскія ўлады прымусілі ехаць на баль: хочаш, ня хочаш — гэта абавязак! Аляксандар I дзейнічаў не з такім прымусам, але таксама хацеў спадабацца ліцьвінкам, полькам, каб яны яго падтрымалі».


ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

Натальля Анофранка: У Расеі яны лічыліся жонкамі ці маці грамадзяніна. А ў нас — грамадзянкамі!

Дарэчы, асаблівасьцю жаночай гісторыі ў Беларусі было й раньняе разьвіцьцё эмансыпацыі. Яшчэ з 1805 г. тут пачаліся дабрачынныя відовішчы, канцэрты з удзелам не прафэсійных актораў, а шляхцянак (магла ўзяць удзел і жонка губэрнатара). Нават ва ўкраінскай пэрыёдыцы была спасылка на віленскі досьвед: чаму гэтыя кабеты могуць, а ў Кіеве такога звычаю няма? Пачалося з канцэртаў, а потым узьніклі дабрачынныя арганізацыі. Напрыклад, таварыства барацьбы супраць воспы: кіравала ім жанчына, і яна павінна была весьці перапіску, умець рабіць прышчэпку і навучаць іншых, зьбіраць і падлічваць сродкі — весьці прафэсійную арганізацыйную дзейнасьць. Выходзіў нават пэрыёдык «Ідэі дабрачыннасьці», у якім ішоў зварот да жанчын «Шаноўныя грамадзянкі». «У Расеі яны лічыліся жонкамі ці маці грамадзяніна. А ў нас — грамадзянкамі!» — з гонарам адзначае Н.Анофранка. Гэта была эмансыпацыя, якая разьвівалася натуральным чынам на падрыхтаванай для гэтага грамадзкай глебе. Другая хваля эмансыпацыі, якая пайшла пры канцы XIX ст., ужо была заходнеэўрапейскага паходжаньня й ішла праз Пецярбург.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У будынку па Гандлёвай, 27 (на здымку — зьлева ўнізе) у 1905—1906 г. месьцілася падпольная друкарня Беларускай сацыялістычнай грамады. Загадваў друкарняй Ф.Стацкевіч. Пазьней была ліквідаваная кіраўніцтвам БСГ у сувязі з узмацненьнем рэпрэсіяў. Зараз будынак стаіць у плянах на знос.

## Тэрарысты з БСГ

Анатоль Сідарэвіч з жалем канстатуе, што ў Беларусі ніхто не вывучае гісторыю левага руху. «Нам трэба перапісваць нанава ўсю гісторыю Беларусі XX ст. Апошняя навуковая праца па гісторыі левага руху ў Беларусі выйшла ў 1927 г., яе напісаў Шмуэл Агурскі. Потым пайшла камуністычная трактоўка гісторыі, калі ўсе астатнія папросту замоўчваліся альбо шальмаваліся. Так што нам трэба вяртацца ў 1927 г. і пачынаць вывучэньне ад яго. Вядома, і паглядзець на тое, што за гэты час напрацавалі замежныя дасьледчыкі — у Амэрыцы, Ізраілі», — кажа ён.

Прыкладам такіх «белых плямаў» Сідарэвіч называе баявую дзейнасьць Беларускай сацыялістычнай грамады. Самымі вядомымі тэрарыстамі пачатку XX ст. лічацца эсэры. Аднак і іншыя левыя партыі (у тым ліку й сацыял-дэмакраты) ня грэбавалі такімі мэтадамі: і бальшавікі, і бундаўцы стралялі ў чыноўнікаў ды сяды-тады рабавалі банкі з поштамі.

«У сваіх успамінах «За 25 гадоў» Антон Луцкевіч гаворыць пра перамогу марксісцкай лініі ў Грамадзе й кажа, што была прынята сацыял-дэмакратычная тактыка. А потым піша, што менская арганізацыя БСГ адышла ад гэтай тактыкі і ў 1906 г. учыніла экспрапрыяцыю дзяржаўных грошай. І гэта наклікала на арганізацыю рэпрэсіі й нават стала прычынай канфлікту паміж ЦК і менскай арганізацыяй», — распавядае гісторык. Яшчэ, што праўда, трэба шукаць у архівах і ўспамінах, хто й калі зь менскіх сацыял-дэмакратаў учыняў гэты «экс». Аднак, кажа сп.Сідарэвіч, ня ўсё гладка нават ва ўспамінах Луцкевіча: «Мусіць, яго падвяла памяць. У 1906 г. па-расейску выйшла брашура «Справаздача пра партыйную канфэрэнцыю 3—4 чэрвеня 1906 г.», якая да нас дайшла ня кніжкай, а перапісаная рукой А.Луцкевіча. І адзін з пунктаў яе рэзалюцыі — для паляпшэньня фінансавага становішча партыі зьвяртацца да экспрапрыяцыі дзяржаўных каштоўнасьцяў».


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Анатоль Сідарэвіч: Антон Луцкевіч піша, што менская арганізацыя БСГ у 1906 г. учыніла экспрапрыяцыю дзяржаўных грошай.


Разьвітаньне з інсургентам. 1860. Карціна Артура Гротгера.

**Frankfurter Allgemeine**

## «Эўропа ўпала тварам у балота»

**Прыбалты з палякамі ў шоку ад палітычнай сьлепаты Брусэлю. Квасьнеўскі і Адамкус не даверылі пасрэдніцтва ў Кіеве Хаўеру Саляну.**

Ну нарэшце ён такі паехаў у Кіеў, наш эўрапейскі шэф-дыплямат Хаўер Саляна. Хоць, зважаючы на той шалёны ціск, які аказвае Расея на ўкраінскія выбары, сьцяг Эўропы ён меў бы падняць там яшчэ некалькі тыдняў таму. Але Саляна, які так часта бывае ў Пуціна, паехаў спачатку ў Рамалах на Блізкі Ўсход. Правільна, Эўропу Ўкраіна не хвалюе? Прыбалты з палякамі ў шоку ад палітычнай сьлепаты Брусэлю.

Дзіва, што ні Квасьнеўскі, ні Адамкус не даверылі пасрэдніцтва ў Кіеве пану Вярхоўнаму камісару з Брусэлю.

Рэвалюцыі зьдзяйсьняюцца неспадзявана. Размах народнага паўстаньня, грамадзянскі дух і ахвярнасьць украінскай апазыцыі ўражваюць. Але ж сытуацыя была прадказальнай. Са стопрацэнтнай імавернасьцю чакалі фальсыфікацыі вынікаў і масавых пратэстаў.

Амэрыканцы папярэдзілі Маскву пра палітычны фол. Эўропа ж змаўчала. Шмат у якіх яе сталіцах Украіну, як і лукашэнкаўскую Беларусь, адносяць да сфэры ўплыву Масквы і лічаць такі стан рэчаў вельмі зручным. Як нам растлумачылі ў ведамстве фэдэральнага канцлера, Эўропа ўстрымалася, каб не ўзмацняць «грузінскай траўмы» расейцаў.

**Маркус Вэнэр — маскоўскі карэспандэнт «FAZ»**

«Франкфуртэр альгемайнэ цайтунг» — уплывовая кансэрватыўная нямецкая газэта.

**УКРАЇНСЬКА ПРАВДА** (ПІДТРИМАЙМО СТРАЙК)

## Як нам легітымізаваць Юшчанку

**Без абурэньня грамадзян з нагоды нахабнага парушэньня іх выбарчага права ня здарылася б таго, што цяпер ужо здарылася.**

Але нелігітымнасьць Януковічавай перамогі ў другім туры, пацьверджаная ЦВК яе адмовай разглядаць скаргі аб парушэньнях і фальсыфікацыях, зусім не азначае легітымнай перамогі Юшчанкі.

Да гонару каманды Юшчанкі і яго самога, р-р-рэвалюцыйныя настроі часткі яго акружэньня з нагоды абвяшчэньня яго прэзыдэнтам былі ўтаймаваны. Юшчанка падзякаваў сьпікеру Літвіну, які папярэдзіў пра сымбалічнасьць прынесенай прысягі.

Юшчанка гатовы да перавыбараў. Гэта зь яго боку дэманстрацыя ўпэўненасьці ў бясспрэчнай перамозе, якую ён, відавочна, хоча даказаць усяму сьвету таксама як форму пераканаўчай легітымізацыі сваёй будучай улады.

Нацыя рэкорднымі тэмпамі аднавіла свае натуральныя каштоўнасьці, якія супадаюць з агульначалавечымі, і проста памножыла іх на сваю адукаванасьць, стараннасьць ды волю да перамогі. І калі крыніца ўлады зрабіла сваё волевыяўленьне, то гэта — не рэвалюцыя зь яе ідэалістамі, фанатыкамі і нягоднікамі. Гэта — выбары.

**Ірына Пагарэлава**

«Украінская праўда», www.pravda.com.ua — Інтэрнэт-газэта, апазыцыйная да Кучмы-Януковіча, першым рэдактарам якой быў забіты пры нявысьветленых абставінах Георгі Гангадзэ.

**КРИТИКА**

## Беларусь і ўкраінская справа

**Ход беларускай рэфэрэндумнай кампаніі стаў сыгналам трывогі: калі міжнародная грамадзкасьць нічога ня зробіць, Украіну спаткае доля Беларусі.**

Першы тур выбараў ва Ўкраіне адбываўся неспадзявана спакойна, парушэньні выбарчага права трапляліся, але ня сталі масавымі. Адной з прычын стала неспадзявана велічэзная колькасьць замежных наглядальнікаў (звыш чатырох тысяч) ды журналістаў (пад тысячу). Калі яшчэ ў верасьні на Эканамічным форуме ў Крыніцы Барыс Тарасюк сказаў, што для належнага маніторынгу ўкраінскіх выбараў спатрэбіцца сама меней чатыры тысячы наглядальнікаў, здавалася, што гэта нерэальна. І, магчыма, гэтых наглядальнікаў сапраўды не было б, калі б не беларускія выбары. Ход беларускай рэфэрэндумнай кампаніі стаў сыгналам трывогі: калі міжнародная грамадзкасьць нічога ня зробіць, Украіну спаткае доля Беларусі. Украінская дэмакратыя патрабавала падтрымкі міжнароднай грамадзкай думкі і атрымала яе. Чатыры тысячы наглядальнікаў літаральна з усяго сьвету сустрэліся 31 кастрычніка над Дняпром. Гэта і яны не дазволілі «ўкрасьці» ўкраінскія выбары.

**Багуміла Бердыхоўская**

«Крытыка» — інтэлектуальны месячнік, выходзіць у Кіеве.

**дни.ру**

## Пуцін і фальсыфікацыі — у адным шэрагу

**Выбарчую кампанію Юшчанкі фінансавалі многія, і ўсё б нічога, але ён зьдзейсьніў адну вялікую памылку — скарыстаў фінансавую дапамогу Барыса Беразоўскага.**

«Дни.Ру» апублікавалі стэнаграму выступленьня палітоляга Марата Гельмана на пасяджэньні клюбу «Адкрыты форум» у маскоўскім гатэлі «Арарат Парк Хаят». М.Гельман уваходзіў у групу палітолягаў, якія дапамагалі В.Януковічу.

**— Чаму Пуцін так актыўна дапамагаў Януковічу?**

— Гаворка ішла пра непрымальнасьць Юшчанкі. І тут, акрамя агульнапрынятых меркаваньняў, ёсьць адно важнае асабіста для Пуціна. Выбарчую кампанію Юшчанкі фінансавалі многія, і ўсё б нічога, але ён зьдзейсьніў адну вялікую памылку — скарыстаў фінансавую дапамогу Барыса Беразоўскага. А зь Беразоўскім у Пуціна ўласныя рахункі. Сур'ёзны аргумэнт? Гледзячы для чаго. Маштаб міжнародных праблем, зьвязаных з сытуацыяй ва Ўкраіне, несупастаўна большы. Маштаб падачак, якія мы яшчэ зробім, каб дапамагчы Януковічу-прэзыдэнту, калі ён ім стане, будзе вялікі. А страта даверу насельніцтва ў цэнтры Украіны — незаменная.

Мы спалілі той рэсурс уплыву, які ў нас заўсёды быў, — маскоўскую патрыярхію, якая так актыўна ў апошні тыдзень узялася за кампанію. Дыскрэдытаваны найважнейшы легітымны інструмэнт уплыву ва Ўкраіне на карысьць Расеі. Гэта значыць Пуцін, РПЦ і фальсыфікацыі — у адным шэрагу.

**— Як можа разьвівацца гэтая сытуацыя? Хто яе кантралюе?**

— Ёсьць толькі адзін чалавек, які застаецца над сытуацыяй, — гэта Кучма. На гэтым узроўні барацьбы ўсё залежыць цяпер ад яго. Яму трэба прыгожа пайсьці і захаваць добрае да сябе стаўленьне ўсіх палітыкаў сьвету. Я называю гэта «рукападаванасьць». І мне відавочна, што для захаваньня твару Кучму выгадней здаць Януковіча.

Праўда, тут рацыянальныя довады могуць саступіць эмацыянальным. А менавіта — асабістая непрыязнасьць Кучмы і Юшчанкі. Юшчанка сабраў вакол сябе шмат ворагаў Кучмы.

Калі ж разьбіральніцтвы паміж бакамі і спадарожны ім стан няпэўнасьці зацягнуцца, дык тады пачнецца паступовае ператварэньне рэгіянальных эліт у суб'екты палітыкі. Іншымі словамі, пачнецца раскол краіны. У гэтай сытуацыі расколу ў Расеі зьявіцца хоць нейкая невялікая прастора для манэўру.

«Дні.Ру» — расейскае інтэрнэт-выданьне.

**НЕЗАВИСИМАЯ ГАЗЕТА**

## Кантрольны званок

**Ва Ўкраіне ўдаецца дасягнуць таго, што ніяк не выходзіць у Расеі, — яднаньня нацыяналізму і прагі свабоды.**

Палітычна актыўная Ўкраіна — з апазыцыяй, палітычна пасіўная Ўкраіна — ні з кім. Актыўная частка народу хоча перамен, ёй абрыд «карумпаваны рэжым».

Тое, чаму можна толькі пазайздросьціць, седзячы ў Маскве, — актыўнасьць і спакой добразычлівага натоўпу. Так, людзкія хвалі, шторм. Але мяккі шторм, не агрэсіўны. «Рэвэ та стогнэ Дніпр шырокый», — але злобы няма. У нас нічога падобнага не было ні ў 1993 г., калі натоўп кінуўся штурмаваць мэрыю і Астанкіна, зьбіваць «палонных», схопленых у мэрыі, ні ў 1991.

Так, ва Ўкраіне — куды больш сьпелае грамадзтва. Адна з прычын тая, што ва Ўкраіне (як у 1990—1991 ва Ўсходняй Эўропе і Прыбалтыцы) удаецца дасягнуць таго, што ніяк не выходзіць у Расеі, — яднаньня нацыяналізму і прагі свабоды.

Палітычнае кіраўніцтва Расеі церпіць ва Ўкраіне найбуйнейшае паражэньне за ўсе апошнія гады.

Зрабіць стаўку «не на таго», дэманстраваць сапраўды імпэрыялістычную высакамернасьць, лезьці ў чужы манастыр са сваім статутам — ды яшчэ як лезьці! З нагамі! У гэтым — уся расейская палітыка. Імпэрская пагарда да «ўсялякіх там украін-грузій».

І нарэшце мана. Абсалютная мана, якую ТБ ліе ў вочы расейскаму гледачу, — паўбяды. Бяда ж у тым, што самі ўлады заблыталіся ва ўласнай мане, самі ня ведаюць, дзе хлусяць, дзе кажуць праўду. Тая самая мана, у якой патанулі ў Беслане.

Украіна — кантрольны званок. Няхай расейская ўлада не хвалюецца так моцна пра братоў-украінцаў — яны самі дадуць сабе рады. Але хай паглядзіць НА СЯБЕ ва ўкраінскае люстра. Дробная карысьлівасьць тлустых зладзюг. Падлізьніцтва. Некампэтэнтнасьць. Абсалютная, інтэгральная мана. І вось з гэтымі хохмамі мы едзем у Адэсу?..

**Леанід Радзіхоўскі**

«Незавісімая газэта» — расейская штодзённая газэта, стаіць на лібэральна-кансэрватыўных пазыцыях.

**газета.ru**

## Слава Ўкраіне!

**Я ў Кіеве. Я бачыў радасны горад. Я бачыў плошчу, запоўненую людзьмі ў аранжавых шаліках і куртках, і людзей гэтых было столькі, што мне не ставала позірку ахапіць іх. І я маліўся Богу, каб ён дазволіў мне пражыць тую пару гадоў, якія патрэбны, каб убачыць у Маскве тое, што я бачу ў Кіеве.**

Я бачыў машыны, якія едуць па горадзе і сыгналяць у такт лёзунгу «Юшчанка! Юшчанка!». Ня толькі ў цэнтры, але і на любой вуліцы, гэта значыць не для таго, каб павітаць прыхільнікаў, а проста для сябе ад радасьці. А на дахах машын сядзяць людзі, размахваюць сьцягамі і таксама крычаць.

Гэты народ, гэтыя юнакі і дзяўчаты, гэтыя дзеці і старыя — іх больш, чым у сваіх самых сьмелых фантазіях можа ўявіць міністар ці прэзыдэнт Расеі, калі вымаўляе слова «народ». У іх хрупкія целы, але непахісны дух.

Віктар Юшчанка з уласьцівай яму мяккасьцю і кампраміснасьцю можа пайсьці на перагаворы зь Леанідам Кучмам ці з прадстаўнікамі Расеі, але Майдан ня прыме перагавораў. Людзі ня пойдуць з Майдану, пакуль Віктар Юшчанка ня стане прэзыдэнтам Украіны, таму што справа ня ў Віктару Юшчанку, справа ў свабодзе.

Я зайшоў ненадоўга ў гасьцініцу напісаць гэтую калёнку, а за вокнамі ў мяне раве радасны горад. Я сяджу ў нумары і баюся, што якаянебудзь гніда ў Маскве аддасьць загад страляць.

Але зараз я дапішу, выйду на Майдан і перастану баяцца.

**Валеры Панюшкін**

«Газэта.ru» — лібэральная расейская інтэрнэт-газэта.

**Le Monde**

## Расея сябе маргіналізавала

У пасьлявыбарчым працэсе Расея ня ведае, як выблытацца з сытуацыі, у якую яна сама сябе паставіла. Цяжка сказаць, ці была адсутнасьць расейскіх пасярэднікаў на перамовах умоваю Эўразьвязу і толькі пасьля ён саступіў ціску Леаніда Кучмы. Прэс-сакратар расейскага МЗС ужо прызнаў, дарэчы, што ў выпадку адмены вынікаў выбараў Расея «нічога ня зможа зрабіць».

**Мадлен Ватэль**

«Монд» — уплывовая штодзённая газэта. У замежнапалітычных ацэнках блізкая да «Ке-д'Арсэ» — францускага МЗС.

**РОССИЙСКАЯ ГАЗЕТА**

## Трэ было дзейнічаць мацней

**Сяргей Караганаў, рэдактар часопісу «Расея ў глябальнай палітыцы»**

Мы мелі права аддаваць перавагу аднаму з кандыдатаў. Але наша падтрымка нагадвала камэрцыйную апэрацыю і рабілася так, што не магла ня выклікаць раздражненьня. Зразумела, мы ня ведалі і не хацелі ведаць, што адбываецца ва Ўкраіне, адпаведна мы зрабілі няправільныя высновы. Гэта ня значыць, што я ня згодны з нашым умяшаньнем, нягледзячы на тое, што яно было меншым у параўнаньні з умяшаньнем нашых заходніх партнэраў ці супернікаў.

«Расійская газэта» — урадавае выданьне Расеі.

**The Guardian**

## Гетмана робіць натоўп, а не Вашынгтон

Апошні тыдзень у Кіеве распаліў уяву сусьветных СМІ наконт аднаўленьня супрацьстаяньня Расеі й Захаду. Кожную раніцу ў цэнтры Кіева зьбіраўся натоўп, наэлектрызаваны бруднымі фальсыфікацыямі, якія адабралі прэзыдэнцтва ў фаварыта Захаду Віктара Юшчанкі. Асабліва настроі радыкалізаваліся, пасьля таго як урад прызнаў свайго прэм'ера Януковіча пераможцам. Гэта пратэст ня столькі супраць амэрыканскага ці расейскага кандыдата, колькі супраць дванаццаці гадоў дрэннага кіраваньня. І гэты факт нашмат важнейшы, чым тое, што Юшчанка мае моцныя сувязі з Вашынгтонам (а гэта праўда) ці што дзяржэп ЗША ўклаў мільёны ў кампанію «За свабодныя выбары» (таксама праўда), якая на самай справе магла паспрыяць толькі апазыцыі.

Гетмана робіць натоўп, а не Вашынгтон. На самой справе, праграмы двух Віктараў мала розьняцца. Абодва, напрыклад, маюць вывесьці кантынгент з Іраку. Галоўнае адрозьненьне — Юшчанка больш рынкавы, а Януковіч аддае перавагу каманднай эканоміцы савецкага ўзору.

Тым ня менш, кампанія супраць Юшчанкі працягваецца ў заходнеэўрапейскай прэсе, якая гаворыць пра нацыяналістычныя настроі на Хрышчатыку. Толькі стоячы ў цэнтры Кіева сярод нармальна хаатычнага, часта хмяльнога, але мірнага натоўпу, не адчуваецца экстрэмізму.

Існуе таксама дзіўнае пераканаваньне, быццам Украіна, акупаваная ці кантраляваная Масквой з XVII ст., ня мае права на незалежнасьць альбо што праўкраінская рыторыка Юшчанкі нясе пагрозу «нацыяналізму». Няўжо быць украінцам — гэта так дрэнна? Этнічныя татары ў Крыме, здаецца, так ня думаюць. Яны падтрымалі Юшчанку. Весткі пра аграмадную папулярнасьць Януковіча была значна перабольшаныя. Адзіную рэальную падтрымку ён мае толькі ў шахцёраў, якія баяцца, што Юшчанка зачыніць старыя, небясьпечныя шахты (ён хутчэй за ўсё гэта зробіць, і правільна зробіць).

Паліттэхнолягі і журналісты Януковіча распаўсюджвалі рапарт Брытанскага Хельсынскага камітэту па правах чалавека, які супярэчыць пазыцыі большасьці краін, апроч Кітаю, Расеі, Беларусі і краін Цэнтральнай Азіі, што выбары былі чэснымі. Толькі Майдан Незалежнасьці дае іншы досьвед. Для большасьці людзей — гэта першы смак сапраўднага самавызначэньня. Тое, што нехта на Захадзе ня верыць у іх, іх зусім не кранае.

**Нік Пэйтан Уолш, маскоўскі кар. газэты з Кіева**

## Хто такі Лафлэнд?

**У суботу, 27 лістапада, чалавек па імені Джон Лафлэнд выступіў на старонцы камэнтароў і пошты газэты «The Guardian» у абарону**

**«вынікаў» выбараў ва Ўкраіне, і дзівосным чынам менавіта ягоны артыкул працытавалі ўсе пуцінскія, кучмаўскія і лукашэнкаўскія СМІ. Хто такі гэты Лафлэнд? На гэтае пытаньне адказвае карэспандэнт самой «Гардыян» у аўторак, 30 лістапада.**

Самы моцны бок Лафлэнда заключаецца ў тым, што ён бачыць тое, чаго, здаецца, не заўважае ніхто іншы на Захадзе. Там, дзе рэпарцёры ў Кіеве, уключаючы ўласнага карэспандэнта «The Guardian» Ніка Ўэлша, сустракаюцца з сапраўды дэмакратычным рухам, Лафлэнд сутыкаецца з «нэанацыстамі». І калі большасьць аглядальнікаў паведамляюць пра канкрэтныя выпадкі сур'ёзных электаральных махлярстваў і парушэньняў з боку прыхільнікаў дзеючага прэм'ер-міністра, Лафлэнд скардзіцца толькі на сыстэматычную перадузятасьць супраць (трэба меркаваць, ні ў чым не вінаватага) пана Януковіча.

Пошук у Інтэрнэце дазваляе высьветліць, што гэты шаблён характэрны для Лафлэнда ў апошнія некалькі гадоў і пашыраецца на цэлы шэраг краін. Лафлэнд рознымі спосабамі ставіць пад сумненьне думку пра тое, што правы чалавека ўяўляюць сабой праблему ў Беларусі ці што сэрбы моцна лютавалі ў Косаве.

У артыкуле ў «The Guardian» ён выступіў пад аблічам прадстаўніка Брытанскай Хельсынскай праваабарончай групы (BHHRG). Заснаваная ў 1992 г., BHHRG пасылае сваіх наглядальнікаў на выбары і рыхтуе даклады, у якіх — прыблізна ў духу Лафлэнда — амаль нязьменна асьрэчваюцца вывады іншых, больш вядомых праваабарончых арганізацый. Праз гэта на адрас BHHRG выказвае крытыку Міжнародная Хельсынская фэдэрацыя па правах чалавека, якая заяўляе, што BHHRG лічыць за лепшае «іграць пінаяраўскую ролю «пасткі» для адцягваньня агню крытыкі ад эўрапейскіх аўтарытарных правіцеляў новага пакаленьня», замест таго каб ажыцьцяўляць рэальны маніторынг іх злоўжываньняў.

Я нічога ня ведаю пра фінансавыя справы BHHRG, але сълед вядзе нас да «Sanders Research Associates», «кансалтынгавай фірмы па рызыках», у працы якой, як сказана на яе вэб-сайце, рэгулярна ўдзельнічае Лафлэнд. «Кіраўніком» гэтай фірмы выступае Крыс Сандэрс. Выказваньні Лафлэнда па Ўкраіне не зьяўляюцца самымі ўражальнымі асаблівасьцямі «Sanders Research Associates». Тут пальму першынства трэба аддаць паведамленьню пра Руанду, напісанаму для гэтай фірмы канадзкім журналістам па імені Крыс Блэк. Блэк — адзіны чалавек з усіх, каго мне давялося бачыць, хто бярэ ў двукосьсі словы «генацыд» у дачыненьні да падзей у Руандзе. Руанда, ці бачыце, была цалкам на сумленьні Злучаных Штатаў Амэрыкі, і ў любым разе гэта не было справай рук племені хуту.

Блэк таксама ўзначальвае юрыдычную камісію Міжнароднага камітэту па ахове Слабадана Мілошавіча. Блэк езьдзіў у складзе дэлегацыі ў Паўночную Карэю. Справаздача, якую ён напісаў па вяртаньні, поўная спасылак на шчасьлівых сялян і адданых рэжыму салдат. Ён выказаў меркаваньне, што паўночнакарэйская сыстэма шмат у якіх адносінах больш дэмакратычная, чым парлямэнцкія сыстэмы на Захадзе.

Гэта дзіўная кампанія. Мне здаецца, што Лафлэнд і яго прыяцелі ўяўляюць сабой групу правых лібэртарыянцаў-антыдзяржаўнікаў, якія нейкім чынам трансфармаваліся ў абаронцаў самых дрэнных рэжымаў і самых жахлівых дыктатараў нашай плянэты.

«Гардыян» — левалібэральная брытанская газэта.



Сьвятаслаў Вакарчук, лідэр гурту «Океан Ельзи», раздае амонаўцам кветкі.

«КОРРЕСПОНДЕНТ»

# Страйк і фэст на Майдане

**«Віягра» раздае рэвалюцыянэрам валёнкі, Сафія Ратару на Майдане — піражкі замерзлым маніфэстантам, Руслана выставіла намёт з мэдыкамэнтамі... Разьлічаныя піяр-хады ці выява сапраўднае грамадзянскай пазыцыі?**

Заява Русланы за некалькі дзён да другога туру выбараў, што яна ня можа маўчаць і абірае Юшчанку, зьдзівіла. Падчас выбарчай кампаніі яна спачатку сьпявала зь Януковічам, а потым пагражала судом усім кандытатам, хто наважыцца выкарыстаць яе імя ў сваіх «брудных» мэтах.

І тут першы тур нібыта зьняў здранцьвеньне зь пераможца «Эўрабачаньня»: заява пра свой сапраўдны выбар, абвяшчэньне галадоўкі, 300 бясплатных білетаў на яе сольны канцэрт жыхарам Майдану.

Пра групу «Віягра» таксама праходзіла інфармацыя, нібыта дзяўчаты падтрымліваюць сваімі палкімі танцамі Януковіча. І Валеры Меладзэ, які часьцяком сьпявае разам зь дзяўчатамі, агітаваў за Януковіча. Так што рашэньне групы перадаць 1000 пар валёнак украінскім дэманстрантам на Майдане зьявілася сюрпрызам. Самі дзяўчаты на галоўным кіеўскім пляцы пабаяліся зьяўляцца. Відаць, захаладна для танцаў у міні-спадніцах.

Затое не пабаялася прыехаць у Кіеў Сафія Ратару — прадстаўніца расейскай папсовай тусоўкі. Розныя каралёвы і бабкіны аб'езьдзілі ўсю Ўкраіну з «дабрачыннымі» канцэртамі. Ратару, хоць у «Песьні году» ўдзельнічае не адзін дзясятак год, ад сваіх паплечніцаў адасобілася.

Хто ведае, можа, заўтра і прадусарскі штаб Веркі Сярдзючкі дашле ў Кіеў цёплыя футры?

Алег Скрыпка, дарадца Ючанкі па пытаньнях культуры, сваёй пазыцыі не мяняў. Перад другім турам лідэр групы «Воплі Відаплясава» зрабіў заяву, што ён зьедзе на эміграцыю, калі да ўлады прыйдзе недэмакратычны кандыдат.

Скрыпка ў гэтыя дні неафіцыйна ачоліў «унію ўкраінскіх музыкаў» і заявіў ад імя такіх груп, як «ВВ», «Океан Ельзи», «Плач Єремії» ды інш, што ўкраінскія музыкі падчас нацыянальнага страйку ня будуць граць камэрцыйных канцэртаў і будуць выступаць выключна на Майдане.

Музыкантаў, што жадаюць падтрымаць сваім выступам Юшчанку, усё болей. Мэр Кіева даў загад збудаваць яшчэ некалькі сцэнічных пляцовах у цэнтры гораду, бо галоўная не зьмяшчае ўсіх жадаючых. Цікава, што на Хрэшчаціку можна ня толькі пачуць музыку, але і паглядзець тэатральныя пастаноўкі. Іх даюць трупы Маладога тэатру і драматычнага тэатру імя Франка, якія таксама далучыліся да страйку. Апошні пры гэтым адмовіўся ад заплянаваных гастроляў у Беларусі на знак пратэсту супраць віншаваньня Януковічу ад Лукашэнкі.

**Сяргей Будкін**

# «Лукашэнка талерантнейшы за Пуціна»

**Аранжавыя хусьцінкі палымнелі ў кішэньках смокінгаў удзельнікаў украінскага мужчынскага харавога ансамблю «Man Sound», які выступаў на канцэртных пляцоўках Менску ў рамках Дзён украінскай культуры. Кіраўнік гурту Зьміцер Выгоўскі (на фота першы справа) адказаў на пытаньні карэспандэнта «НН».**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**— Чаму на канцэртах Вы ўпрыгожылі свае строі аранжавымі хусткамі?**

— Мы падтрымліваем Віктара Юшчанку, сапраўды народнага прэзыдэнта, і верым, што народ здолее абараніць свой выбар і перамога.

**— Гэта Ваша ўласная ініцыятыва ці мо Міністэрства культуры?**

— Цалкам наша. Мы не залежым ні ад кога. Не знаходзімся ні пры кім — ні пры філярмоніі, ні пры Міністэрстве культуры, і гэта наш сьвядомы выбар.

**— Як Вы ацэньваеце цяперашнія падзеі ва Ўкраіне?**

— Гэта гістарычны момант! Упершыню на маім жыцьці ўвесь народ падняўся на абарону свайго голасу. Усе ведаюць, як рабіліся гэтыя выбары, як усё брутальна, нахабна фальшавалася. Людзі бачылі, што іх сябры, знаёмыя, суседзі, сваякі падтрымліваюць Юшчанку, а ў выніку перамогу напісалі Януковічу. Народ абурыўся.

**— Чым, на Вашу думку, скончыцца супрацьстаяньне двух кандыдатаў?**

— Мы спадзяёмся, што ўсё скончыцца афіцыйнай перадачай улады Віктару Юшчанку.

**— Як Вы ставіцеся да віншаваньня Лукашэнкам Януковіча зь перамогай на выбарах?**

— Яго віншуюць розныя прэзыдэнты. Магчыма, гэта даніна дыпляматыі. Нам усё роўна. Лукашэнка ў параўнаньні з Пуціным паводзіць сябе талерантна. Той бруд, які выліваюць расейскія СМІ, і тое, што кажа расейскі прэзыдэнт, ня лезе ні ў якія рамкі. Пуцін проста падлівае алею ў агонь.

**Гутарыў Арцём Лява**

# Шляхетныя рэвалюцыі

## Чэхія—Славаччына—Сэрбія—Грузія—Украіна. Беларусь?

Увосень 1989 г. рэвалюцыя вярнула Чэхію да сябе самой. Гэта быў першы прыклад, калі грамадзкае паўстаньне развяліла спарахнелы рэжым, які страціў энэргію, але па завядзёнцы разглядаў законы як праверку грамадзян на ляяльнасьць, а адзіным іхнім правам лічыў абавязак падпарадкоўвацца.

Чэхаславаччына была ценем Савецкага Саюзу — з камуністычнай партыяй, з правіламі без гульні і маразмам, падмацаваным акупацыяй. Чэхія хутка вызвалілася з імпэрыі нямогласьці, але Славаччына на кароткі час адбудавала сваю — каб потым праз ашаламляльныя выбары зь ёй разьвітацца.

Пояс аўтарытарных рэжымаў узьнік на руінах Савецкага Саюзу: Беларусь, Прыднястроўе, Абхазія, Паўднёвая Асеція. Такою была Сэрбія часоў Мілошавіча, зонай нямогласьці была і Грузія Шэварднадзэ. Бяскроўныя рэвалюцыі вырвалі гэтыя краіны зь міжчасься.

### Правілы гульні

Палітолягі шмат раскажуць аб правілах аксамітных рэвалюцый: патрэбна згуртаваная апазыцыя, гатоўнасьць людзей выйсьці на вуліцы, фінансавая падтрымка, пераход сілавых структур на бок дэманстрантаў.

Але ва ўсіх аксамітных рэвалюцыях адбываецца вяртаньне грамадзянам права на выбар. Кланы, якія манапалізуюць уладу ў аўтарытарных дзяржавах, зводзяць правілы да тэхнічных інструкцый выканаўцам, аплятаюць іх «тэлефонным правам» і шантажуюць падуладных. Але аксамітная рэвалюцыя разбурае маналіт паслушэнства.

Паводле камуністычных нормаў чэскія студэнты ня мелі права на дэманстрацыю. Але як грамадзяне яны такое права мелі — і сьцьвердзілі яго сваім учынкам.

Каб устанавіць правілы, людзі мусяць спыніць выкананьне старых нормаў і абвясьціць пра правілы самі — на вуліцы. Людзі становяцца цэнтрам нормаў — грамадзянамі. Гэта і ёсьць зарукай бяскроўнасьці шляхетных рэвалюцый.

Ва Ўкраіне, якую затапіла аранжавая хваля надзеі, няма крывавых сутычак. Цімашэнка заклікае аранжавых Юшчанкі накарміць, адагрэць і перааігтаваць сініх Януковіча. Калі аранжавыя й сінія сустракаюцца — няма боек.

Аранжавая рэвалюцыя імкнецца выкарыстоўваць не заплямленыя фальсыфікацыямі легітымныя структуры: Раду, Вярхоўны суд.

### Канец хаосу

На пачатку 1990-х у асяродзьдзі расейскіх палітолягаў і практыкаў была агучана ідэя «кіраванага хаосу». На думку гэтых людзей, Захад разьдзімае ў памежных з Расеяй краінах і ў самой Расеі канфлікты. Гэта прыводзіць да таго, што аб'екты ўзьдзеяньня становяцца слабымі і мусяць увесь час зьвяртацца да пасярэдніка, якім выступае Захад.

Тэорыя «кіраванага хаосу» — пекны прыклад люстэрка, калі агучваюцца й дасьледуюцца *свае* жаданьні й памкненьні пад выглядам чужых паскудзтваў.

Насамрэч першай краінай, дзе расейская тэорыя кіраванага хаосу даўно й напоўніцу ўвасобілася, была Рэч Паспалітая, якую стагодзьдзе аслаблялі скванпыя суседзі, а потым увогуле расьцягнулі на кавалкі.

Загана аматараў кіраванага хаосу ня толькі ў тым, што ён рана ці позна скончыцца, але і ў тым, што хібны сам пасыл: цэнтральнаэўрапейцы не сыравіна, а грамадзяне — і самі творцы свайго лёсу.

Сёньня Ўкраіна з Усходняй Эўропы вяртаецца ў Цэнтральную.

Дойдзе чарга і да Беларусі.

**Андрэй Расінскі**

# Нельга прымаць звычаі традыцыйнага грамадзтва за сутнасьць ісламу

Артыкул «Другая душа Эўропы» ў «НН» №43 выклікае мноства пытаньняў. Падбор фактаў пакідае ўражаньне антымусульманскага ўпярэджаньня: сарацыны, тэрарысты, робяць абразаньні і ня любяць эўрапейскай культуры, чужародны арганізм у целе Эўропы. Артыкул апэруе вельмі няпэўнымі тэрмінамі, што не дадае яму аб'ектыўнасьці. Што такое «мусульманскае грамадзтва»? Грамадзтвы, скажам, Босьніі, Самалі і Ірану адрозьніваюцца між сабой ня менш, чым «хрысьціянскія грамадзтвы» Беларусі і Балівіі. А ад такіх абагульненьняў патыхае каляніяльным арыенталізмам.

Ня варта прыпісваць эксцэсы, прычыны якіх палягаюць у традыцыйным грамадзтве, ісламу. Нельга прымаць звычаі традыцыйнага грамадзтва за сутнасьць рэлігіі!

Так званыя мусульмане Эўропы ня ёсьць адзінай супольнасьцю. Мусульманскае адзінства існуе ў галовах жменькі ідэалістаў-мусульманаў і мас-культуры Захаду. Няма гэтага адзінства і ніколі не было! У шыіцкім Іране лепш маўчыце, што вы суніт, а ў суніцкім вольным Курдыстане ня раю казаць курдзкім паліцыянтам пра свой шыізм. У Пакістане — яшчэ горай: гэта могуць быць вашы апошнія ў жыцьці словы.

Да абразаньня дзяўчынак іслам ня мае аніякага дачыненьня. Хіба толькі тое, што яно практыкуецца ў некаторых мусульманскіх краінах Афрыкі, дзе ёсьць складнікам **традыцыйнае культуры**. Але такі самы звычай адзначаецца і ў праваслаўнай Этыёпіі.

Наконт нарвэскіх міністарак, дык ці не зашмат нахабства — патрабаваць мадэрнізацыі несваёй рэлігіі? Я згодны наконт дыскрымінацыі жанчын, працэдураў разводу і г.д. Але гэта зноўку **праблемы традыцыйнага грамадзтва**.

Нямецкія туркі дзесяцігодзьдзямі працавалі на Нямеччыну, і Нямеччына прывяла іх у свой дом. Калі ў немцаў няма дзяцей, а ў туркаў яны ёсьць, дык гэта праблема немцаў. А па-нямецку цяпер у любым разе гаворыць больш імігрантаў з Турэччыны, чым раней, і нават у парлямэнце ФРН ёсьць дэпутат-турак Джэм Ёздэмір.

А што ж за «эўрапейскія каштоўнасьці» заўжды панавалі ў Эўропе? Мо гэта каштоўнасьці хрысьціянскай Гішпаніі, што выбіла ўсё карэннае насельніцтва Амэрыкі? Альбо каштоўнасьці, дзякуючы якім Нямеччына замахнулася на канчатковае вырашэньне жыдоўскага пытаньня ўсяго толькі шэсьцьдзесят год таму? Альбо каштоўнасьці, якія давалі выкшталцонай Францыі права мардаваць альжырцаў да віетнамцаў усяго толькі колькі дзесяцігодзьдзяў таму?

Не, слушна адзначыце вы, мы кажам пра каштоўнасьці вышэйшай эўрапейскай культуры, носьбітамі якой былі адукаваныя слаі грамадзтва, інтэлігенцыя. Але адпаведнік такое самае культуры існаваў ды існуе і ў тым канглямэраце краін, якія вы называеце мусульманскімі. Праблема ж іх палягала й палягае ў **адсутнасьці інфраструктуры для пашырэньня і прасоўваньня гэтае культуры**. Паспрабуйце вы, курдзкі Кант ці Сартр, пашырыць свае погляды, калі на ваша места сыплюцца хімічныя бомбы (made in Germany), а рэдакцыя вашага часопісу яшчэ ўчора была расстраляная ў поўным складзе іракімі жаўнерамі, чыё ўтрыманьне аплачана са сродкаў ЗША/СССР. Што вам застаецца? Альбо ўзяцца за зброю (сэнсу няшмат, бо ваяваць трэба ня проста зь мясцовай тыраніяй, а з усёй сусьветнай герархіяй), альбо зьехаць у Галяндыю ды далучыцца да тамтэйшага мільёну мусульманаў. Абодва выйсьці прыводзяць да зьмізарненьня вас і культуры вашага краю гэтаксама.

Як напісаў Фуад Аджамі (сацыёляг-лібанец, што ўцёк у ЗША), няма чаго дзівіцца застою арабскіх краін, ведаючы пра памеры эміграцыі зь іх. Ён параўнаў сёньняшнюю арабскую сытуацыю са становішчам у Японіі перад яе мадэрнізацыяй у эпоху Мэйдзі. Шчасьце Японіі, адзначыў Аджамі, што японцы не маглі масава ўцякаць за мяжу.

Таму й працягваецца застой **традыцыйных** грамадзтваў, што няма **ні інфраструктуры, ні мэдыятараў** — адукаванага слою, інтэлектуалаў.

Гэта яшчэ ня ўсё. Справа ў тым, што адначасна ідуць працэсы ўрбанізацыі, індустрыялізацыі. Сяляне прыходзяць са сваіх кішлакоў у гарады, дзе маргіналізуюцца. З сабой яны нясуць чужую для месьцічаў культуру.

Тое, пра што вы пішаце, дружа, — гэта навала сялянаў, якія ў выніку працэсаў дэмаграфічнага выбуху і ўрбанізацыі прыходзяць у гарады. Складваецца адпаведная палітычная культура, што не вызначаецца выкшталцонасьцю. Але ўсё адно разьвіцьцё ідзе ў лепшы бок.

Не паказвайце пальцам на маладога турка, які ганарыцца сваёй турэцкасьцю і мусульманскасьцю. Ён ганарыцца імі, бо Нямеччына дала яму лепшую адукацыю, чым меў ягоны бацька, што прыехаў з анаталійскай вёскі, дзе не было нават электрычнасьці. Ягоны бацька меў больш цемрашальскія погляды, але маўчаў, бо ня ўмеў іх артыкуляваць. Ягоны сын, я ўпэўнены, больш талерантны і можа пра свае перакананьні выказвацца. І гэта не радыкалізацыя, гэта падвышэньне ўзроўню адукаванасьці й культуры.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Нельга падыходзіць да закранутай праблемы ў стылі Самуэля Гантынгтана, а інакш як разьвіцьцём ягоных ідэй ваш артыкул назваць цяжка. Праца Гантынгтана выклікае зашмат сумненьняў ужо хаця б з прычыны аблуднасьці базавых зьвестак, на якія ён грунтаваўся (колькі нумароў таму Алег Латышонак у «Arche» разабраў, мякка кажучы, неадпаведнасьць зьвестак пра Ўсходнюю Эўропу ў Гантынгтанавай кнізе). Гэты фактычна ідэалягічны твор я паставіў бы на адну паліцу з такімі шэдэўрамі, як творы сацыял-дарвіністаў ці «Майн Кампф». І ня варта мяшаць такія рэчы з навукай. Ад «яршоў», як вядома, толькі галаўны боль.

**Сяргей Богдан, Тэгеран**

# Хто і чаму галасаваў за Буша

Левы радыкал Лёлік Ушкін у «НН» №43 сакавіта апісвае аблом «прагрэсіўнай часткі чалавецтва» пасьля выбараў у ЗША. Далей Лёлік апісвае тыя ідэі, з дапамогай якіх, на ягоную думку, рэспубліканцы выйгралі кампанію. А вось тут, як казалі калісьці, хочацца паспрачацца…

Рэч у тым, што лібэральная прэса Амэрыкі і Эўропы трактуе вынікі выбараў у ЗША цалкам «у Лёлікавым стылі» — штосьці накшталт «тупыя рэспубліканцы ўзьнялі маргінальныя пытаньні і перамаглі прагрэсіўных дэмакратаў». Кансэрватыўныя вясковыя калгасьнікі («redneck» паіхняму) перамаглі гарадзкіх сучасных лібэралаў.

Што ж, давайце глыбей зірнем на гэтую Амэрыку і паспрабуем разабрацца, чаму яна прагаласавала за Буша, тым больш што ў жыцьці мы гэтых «сярэдніх амэрыканцаў» амаль ня бачым — нам у Эўропе ўсё больш прагрэсіўныя лібэралы трапляюцца. (Прыведзеныя далей зьвесткі ўзятыя з exit poll, праведзенага CNN у дзень галасаваньня.)

Хто ж гэтыя ёлупні, якія прагаласавалі за выкапня з выкапняў, аб'екта насьмешак усяго прагрэсіўнага чалавецтва — Джорджа Буша? Паершае, белыя мужчыны — 62% за Буша, 37% за Керы. Ну, гэта яўна адны ідыёты. Настолькі беспрасьветна тупыя, што Буш выйграў галасы белых мужчын нават у найлібэральнейшых Каліфорніі і Нью-Ёрку. Ідэйны сябар Лёліка Ушкіна, таксама «левы радыкал» Майкл Мур калісьці сваю кнігу так і назваў — «Дурныя белыя мужчыны». Усю кнігу ён тлумачыць, што белыя — прычына ўсяго зла на плянэце, абураецца тым, што яны асьмельваюцца зарабляць больш за чорных, а ў турмы трапляюць менш і г.д.

Ну няхай, пра паліткарэктнасьць мы яшчэ пазней пагаворым, а пакуль працягнем вывучаць бушаўскі электарат. Узрост. Катэгорыя 30—44 гады — людзі, якія ўжо ўсталяваліся, маюць сем'і, справу. Зь іх за Буша — 53%, за Керы — 46%. Дарэчы, сярод старэйшых (45—59 гадоў) падтрымка Буша памяншаецца — 51%, за Кэры — 48%. То бок не выпадае ўжываць яшчэ адзін «назойлівы» штампік — за дэмакратаў, маўляў, моладзь, за рэспубліканцаў — старыя.

Цяпер паглядзім на даходы амэрыканскага электарату, і... вы ўжо здагадваецеся, заканамернасьць самая простая: чым багацейшы, тым больш за Буша — ад 36% у катэгорыі самых бедных да 63 сярод самых багатых. Вось жа, яўна не адны тэхаскія каўбоі галасавалі за Буша.

Хто ж выбірае лібэральную дэмакратыю насуперак калгасьніку і імпэрыялісту Бушу? У першых шэрагах тут афраамэрыканцы: за Буша 11%, за Керы — ажно 88%. Вось дзе, аказваецца, самыя шчырыя прыхільнікі грамадзянскіх свабод і лібэральных каштоўнасьцяў. Чамусьці мне, аднак, здаецца, што сярод шэрагу прычынаў такога галасаваньня — разуменьне таго, што дэмакраты пасьля прыходу да ўлады павысяць падаткі і пачнуць павялічваць дапамогі бедным і беспрацоўным. Рэспубліканцы такім людзям кажуць: «Працаваць трэба, і мы панізім падаткі ўсім працоўным», — а дэмакраты прытуляюць іх, няшчасных, да бюджэтных цыцак, і баюць: «Смакчыце, мы яшчэ дамо». (Я ўвогуле ня надта веру ў гэтую казачку пра няшчасных амэрыканскіх беспрацоўных. У ЗША пры наяўнасьці жаданьня працу знаходзіць і беларускі студэнт нават бяз добрай ангельскай мовы, і мэксыканскі селянін, і чорны гаіцянец, які праўдамі-няпраўдамі трапіў у Амэрыку. А вось некаторыя амэрыканцы ня могуць. А на халеру ім працаваць за тысячу ў месяц, калі можна не працаваць за 800?)

Парадокс сытуацыі яшчэ і ў тым, што цяпер менавіта левыя лібэралы ў Амэрыцы якраз і ўзначальваюць наступ на традыцыйныя амэрыканскія свабоды. Гэта яны сваёй паліткарэктнасьцю навалілі на свабоду слова і выказваньняў, фактычна навязваючы грамадзтву «паліткарэктную» цэнзуру, кастрыруючы творчасьць.

Фэміністкі падаюць на рэстаран у суд за тое, што на сьцяне намаляваная голая жанчына, з працы звальняюць за «этнічныя» анэкдоты, а ў кіно ты можаш загадзя адгадаць, што драпежная, але паліткарэктная анаконда зжарэ ўсіх белых, затое нэгр і жанчына-лацінаамэрыканка застануцца жывымі. А гэтыя дэбільныя курсы па прадухіленьні сэксуальных дамаганьняў, якія ў часы Клінтана праходзіла фактычна кожная амэрыканская арганізацыя, дзе тлумачылі, чаму нельга глядзець на жанчын і якіх анэкдотаў нельга расказваць (ды ніякіх нельга). Відавочна, у апошнія гады гэтай шызафрэніі стала менш (тут я наступаю на горла ўласнай песьні, бо паліткарэктнасьць заслугоўвае асаблівай баляды).

Хацелася б паставіць тлустую кропку на міце пра «маральныя каштоўнасьці», якія нібыта пагналі амэрыканцаў у многіх штатах галасаваць за Буша.

Як любым людзям, дэмакратам цяжка прызнаць сваю паразу — даводзіцца прыдумляць апраўданьні, каб зрабіць перамогу рэспубліканцаў менш легітымнай у маральных адносінах, даказаць, што апанэнт выйграў толькі дзякуючы апэляцыі да прымітыўных і нізкіх інстынктаў. Вось і выцягнулі на сьвет божы міт пра тое, што менавіта рэфэрэндумы аб забароне аднаполых шлюбаў у 11 штатах паклікалі амэрыканцаў на галасаваньне — эфэктыўней за танныя беларускія буфэты і канцэрты самадзейнасьці. Маўляў, шчыльныя рады гамафобаў адарвалі свае «цнатлівыя» задніцы ад канапы, каб прыйсьці і прагаласаваць за Буша і Чэйні (у якога, дарэчы, дачка адкрытая лесьбіянка). Міт настолькі несамавіты, наколькі і непраўдзівы.



Як адзначае знакаміты кансэрватыўны аналітык Чарльз Краўтхамэр у «The Washington Post», колькасьць галасоў, набраных Бушам у параўнаньні з 2000 г., павялічылася па ўсёй краіне на 3,1%. Ва ўсіх 11 штатах, дзе праводзіліся рэфэрэндумы аб аднаполых шлюбах, колькасьць

> Менавіта левыя лібэралы Амэрыкі ўзначальваюць наступ на традыцыйныя свабоды.

прыхільнікаў Буша павялічылася менш, чым у 39 штатах, дзе такіх рэфэрэндумаў не было. Як увогуле можна казаць пра перамогу зацятых белых эвангелістаў, калі Буш у параўнаньні зь мінулымі выбарамі атрымаў значны рост падтрымкі ад габрэяў, лацінаамэрыканцаў, а таксама жанчын (асабліва замужніх) і пажылых людзей. Карацей, як выказаўся адзін з амэрыканцаў на форуме, «я, напрыклад, атэіст, цалкам падтрымліваю аднаполыя шлюбы і нават аддаю перавагу чырвонаму віну перад півам з бляшанкі. Але мне і ў галаву б не прыйшло галасаваць за сацыяліста Керы».

Дарэчы, наконт віна, якое, як я разумею, стала адным са спажывецкіх сымбаляў кампаніі Керы — прынамсі, адразу ў некалькіх тэлеперадачах я бачыў, як прыхільнікі Керы выхваляліся, што пасьля перамогі на выбарах абавязкова вып'юць добрага чырвонага віна, а вось бушаўцы няхай жлукцяць сваё піва. Як сказаў бы мой калега Юры Дракахруст, вельмі «архетыпічны» момант. Дэмакраты былі калісьці партыяй простых людзей, такіх, як Лёлік Ушкін ды іншыя беларускія анархісты, што любяць кульнуць келіх піва на праспэкце Скарыны каля сквэру Дзяржынскага. Цяпер жа «страшэнна далёкія яны ад народу» — са сваёй прэтэнзіяй на высакалобасьць і элітарнасьць.

Застаецца параіць дэмакратам словамі клясыка — «трэба дома бываць часьцей, трэба дома бываць ня госьцем».

Забаўна і алягічна, дарэчы, што антыглябалісты выступаюць супраць Буша. Ім бы супраць Керы пратэставаць, спальваць ягоныя партрэты з выдатным буржуазным загарам. Керы — гэта якраз і ёсьць глябалізм ды інтэрнацыяналізм. Буш — гэта больш нацыянальны, у пэўным сэнсе нават нацыяналістычны праект.

Пасьля выбараў некаторыя экзальтаваныя амэрыканцы здуру нават пачалі выказваць імкненьне эміграваць у Эўропу, але паколькі такія ідэі прыходзяць у галаву якраз не тэхаскім фэрмэрам, а людзям даволі заможным, то, мяркую, паразважаўшы, мала хто зь іх захоча плаціць эўрапейскія падаткі па 40 працэнтаў за сумнеўнае задавальненьне сустрэцца тут з шалёнымі цэнамі і антыамэрыканізмам.

Часам, калі я зьдзіўляю людзей сваімі рэспубліканскімі прыхільнасьцямі, мне кажуць — пажыў бы сам у гэтай глыбіннай патрыярхальнай Амэрыцы. А навошта? Неабавязкова быць японцам, каб любіць японскую кухню. Ня трэба быць тэхаскім каўбоем, каб разумець патрэбнасьць і незаменнасьць менавіта такой унікальнай Амэрыкі для сьвету. Як слушна адзначыў Самуэль Гантынгтан, амэрыканская ідэнтычнасьць пабудаваная на англа-саксонскай культурнай спадчыне (і справа не ў нацыянальнасьці і колеры скуры — па-мойму, Кандаліза Райс адпавядае гэтай ідэнтычнасьці больш, чым той самы Майкл Мур). Калі б на бераг Паўночнай Амэрыкі у канцы XV ст. першымі высадзіліся гішпанцы ці французы, тут была б Бразылія альбо Квэбэк, але маем што маем — англамоўныя ЗША, самую моцную і дынамічную частку заходняй цывілізацыі. І на сёньняшні дзень якраз рэспубліканцы найлепш адлюстроўваюць пэрспэктыву яе захаваньня і разьвіцьця.

**Віталь Цыганкоў, Прага**

# У здаровай апазыцыі здаровая нацыя

Калі я атрымаў, як і ўсе грамадзяне, напярэдадні рэфэрэндуму спэцнумар «СБ», маю ўвагу найбольш прыцягнуў матэрыял нядаўняга незалежнага журналіста Сяргея Канашыца аб Беларусі як спартовай нацыі. Артыкул быў аздоблены каляровымі фатаздымкамі А.Лукашэнкі, які гуляе ў футбол (дзіўна, чаму не ў хакей), і Юліі Несьцярэнкі. Прагледзеўшы гэты матэрыял, я падумаў, што апазыцыя цалкам і безагаворачна прайграе барацьбу з уладай на спартовай арэне.

За апошні час палітыка і спорт у сучасным грамадзтве зьнітаваліся так цесна, што мяжу паміж імі можна разгледзець хіба што толькі праз мікраскоп. Таму кожны паважны палітык не абміне магчымасьці «засьвяціцца» перад аб'ектывамі тэлекамэр разам зь якой-небудзь спартовай зоркай, што бясспрэчна дадасьць яму дадатковых балаў. Але «ўсе» — ня значыць беларуская апазыцыя, з атачэньня якой ніколі не чуваць ніякіх заяў на спартовую тэму, апроч часам вельмі рэзкіх словаў Уладзімера Парфяновіча. Вось нядаўна прайшлі Алімпійскія гульні ў Атэнах — хай бы тыя ж спн.Сурвілла ад ураду БНР ці Вячорка зь Лябедзькам ад імя сваіх партый накіравалі афіцыйнае віншаваньне мэдалістам гульняў, дык не. Цішыня. Можа, я чаго ня ведаю, але прызнаюся — пра такія віншаваньні ня чуў. Ня трэба цяпер апраўдваць сябе тым, што яны выступалі пад «лукашысцкімі» сьцягамі. Слушна піша сп.Навумчык у «НН»: спартоўцы проста закладнікі, як і мы з вамі, гэтага становішча. Прыйдзе дэмакратычная ўлада, і ніводзін са спартоўцаў не адмовіцца выступаць пад нашым бел-чырвона-белым сьцягам. Ён не чужы для нашых футбалістаў, хакеістаў, тэнісістаў — падчас гасьцявых матчаў нашых зборных за мяжой беларускія заўзятары часьцей за ўсё зь бела-чырвона-белымі штандарамі. І тое, што кумір усёй беларускай моладзі Макс Мірны згадзіўся ў Чарльстане фатаграфавацца пад нашым сьцягам, таксама шмат аб чым гаворыць.

Тое, што спорт выхоўвае волю да перамогі, не адкрыцьцё. Тую волю, якой нашай апазыцыі не хапае на працягу колькіх гадоў. Так, наўскідак, прыгадваюцца толькі футбольныя турніры імя Г.Карпенкі і ў абарону Беларускага ліцэю, а таксама штогадовы барысаўскі «Кубак Незалежнасьці» — гэта, мабыць, усё, на што здольныя дэмакратычныя сілы ў сфэры спорту. Прычым усе гэтыя турніры не займелі ніякага розгаласу.

Грэблівае стаўленьне да спорту з боку беларускай эліты — гэта савецкая спадчына, калі паняткі «інтэлігент» і «спорт» былі несумяшчальныя. Дарма што ўжо ўвесь астатні сьвет прызнаў спорт часткай культурнага кантэксту. Так ужо склалася (амаль без выключэньняў), што дыктатары заўсёды любяць спорт, але ці нагода гэта грэбаваць ім для нацыянальнай эліты?

> Хай бы Івонка Сурвілла ці Анатоль Лябедзька віншавалі беларусаў-чэмпіёнаў.

Чаму б спадарам лідэрам «Пяцёркі+» не наведаць замест якойсьці пустой канфэрэнцыі ў Варшаве футбольны матч зборнай у Менску? Пасядзець, пагалёкаць. Паразмаўляць зь людзьмі на трыбунах. Ужо ж Лябедзьку, Фралова ці Калякіна заўзятары пазнаюць, бо хто не глядзеў хоць адной сэрыі з тэлесэрыялаў Азаронка?

Колісь С.Дубавец пісаў на старонках «НН», што ўлада і апазыцыя нібыта гуляюць адзін матч, але на розных пляцоўках. У ідэале трэба было б дэмакратам скалаціць сваю банду і кінуць выклік прэзыдэнцкай хакейнай камандзе ці пазмагацца на «Менскай лыжні». Я добра разумею, што ўсе мае прапановы ня пойдуць далей старонак «НН», што зладзіць гэта загнанай і скрозь забароненай апазыцыі нялёгка, але ж прызнайцеся, кожны хацеў бы паглядзець на тое дзіва.

А пакуль апазыцыя бязьдзейнічае на спартовым полі, Рыгаравіч ганяе шайбу з уладальнікам Кубку Стэнлі расейцам Мікалаем Хабібуліным і нашай зоркай Русланам Салеем, будуе ў Лагойску гарналыжны курорт, наведвае ў бальніцы хворую Юлію Несьцярэнку, дае ордэны Максу Мірнаму і Валодзю Ваўчкову. Карацей, сухая перамога прадстаўнікоў улады.

А праўду кажа Лукашэнка, што здаровая нацыя — гэта залог усіх посьпехаў грамадзтва ў будучыні.

**Зьміцер Панкавец, Барысаў**

# 17 кастрычніка — гэта 11 верасьня

**У нас ёсьць тыл — гэта вольны сьвет. У Беларусі не сканала дыктатура, ня скончыўся народ, не прапала апазыцыя, ёсьць пункты канцэнтрацыі супраціву, ня зьнікла мова, немінуча будуць выбары. Стаўшы самадастатковай, незалежнай ад народу, улада непазьбежна дэградуе.**

Эсхаталягічны артыкул В.Сіліцкага «Сызыфаў выбар» (№41) адлюстроўвае пэўныя настроі і мае пад сабою грунт, але я ня згодны з часткаю экстрэмісцкіх высноў.

Па-першае, ніколі ня трэба адчайвацца, а ў палітыцы тым болей. Яна грунтуецца на мностве пераменных чыньнікаў.

Па-другое, сьвет значна зьмяніўся, мы не адны, не самотныя, і надыход дэмакратыі ў Беларусі няўмольны. Наша справа — расчышчаць ёй шлях і кідаць ёй пад ногі вербныя галінкі. Рэжым па-савецку жадае стаць стэрыльным ад іншадумства, ад палітычных партый, ад грамадзкіх арганізацый, ад усяго. Абсалютна яму гэта ня ўдасца, а толькі ў той ступені, у якой саступім мы. А саступаць няма чаго і няма куды.

Няўдачы беларускай дэмакратыі запраграмаваны даўно. Разбуральныя войны, 200 гадоў тэрарыстычнага каляніялізму (зь іх 80 гадоў асабліва генацыднага рэжыму). Чаму так лёгка разьвіліся фашыстоўскія рэжымы ў Расеі, Італіі ды Нямеччыне? Бо грамадзтва было хворае. Чаму так лёгка адбыўся пераход да дэмакратыі ў Італіі, Нямеччыне, Партугаліі, Гішпаніі? Бо ў іх была шырокая прыватная ўласнасьць і хоць трохі сярэдняе клясы.

Чаму так балюча ідзе дэмакратыя да нас? Бо ў нас няма каму быць дэмакратыяй, дэмасу крытычна мала. Каму даць той «кратас»? Памянёныя чыньнікі абсалютна адсутнічаюць у Беларусі. Кіроўны слой, намэнклятура, паводзіць сябе паводле вывучанага каляніяльнага альгарытму — іншаму ён не пасьпеў навучыцца. Ён ня ўмее і ня хоча здабываць уладу праз канкурэнцыю палітычных ідэй, а хоча толькі яе красьці. Досьвед улады, вядома, рэч сур'ёзная, але калі табе месца ля ўлады гарантавана, то сон розуму забясьпечаны.

Хіба можна разьлічваць на электаральны посьпех у люмпэнізаваным грамадзтве? Ды ўлада купляе дастатковую частку, бярэ яго напракат на патрэбны для выбараў час праз славутае «хлеба і цырку!». Дастаткова некалькіх патэрналісцкіх выступаў па талевізіі перад любым сэрцу ўлады сельскім па мысьленьні люмпэнам (занадта шпарка і ненатуральна сталіся мы гарадзкой нацыяй). Чаму так пільна пасьвіць рэжым нашых гандляроў і прадпрымальнікаў? Бо цудоўна ведае, што з гэтага парастку вырасьце сярэдняя кляса, якая запатрабуе сабе кавалак улады. Таму хай сабе гандлююць, але разьвіцца ім не дамо. Адсюль і пэрыядычныя экспрапрыяцыі прадпрымальнікаў. Хаўрус нацыянальнага бізнэсу і нацыянальнай палітыкі — гэта сьмерць рэжыму. Таму так грозна папярэдзіў першы прэзыдэнт бізнэсоўцаў пра лютую расправу, калі, божа крый, хто зь іх дасьць жменю грошай апазыцыі.

От тут і трэба дзейнічаць. Аб'ектыўна мэты гандляроў і палітыкаў супадаюць. Улада прысабечыла ТБ? Хай гандляры нашага базару зьбіраюць па паўдаляра кожныя два тыдні, каб у нашым горадзе выходзіла выданьне на чатыры старонкі А4 з тыражом у паўтарыдзьве тысячы асобнікаў для стварэньня базы дэмакратыі.

Разьвіцьцё малога падпольнага апазыцыйнага друку — рэч першаступеннай важнасьці. Тут у цэнзуры кароткія рукі. Трэба пераканаць эўрапейцаў таксама ахвяраваць трохі сродкаў на гэтыя мэты, бо прадухіленьне разьвіцьця поўнамаштабнай фашысцкай дыктатуры на постсавецкай прасторы — справа інтэрнацыянальная.

(Нягледзячы на лямант рэжыму пра казачныя сумы даляраў, якія абрынуліся на апазыцыю, гэта проста хлусьня. На кожныя выбары мы ідзём зь нішчымнымі кішэнямі, мо таму і вынікі такія… Але 10 кастрычніка на прыступках Дому культуры ў Сасновым Бары двое мужыкоў моцна прыставалі да мяне з пытаньнем «За што ты жывеш?». Наіўныя вераць, што я шчырую за даляры. Хай ідуць да нас, падзелімся.)

Яшчэ важная рэч — сацыяльна-эканамічная адукацыя. У гэтым сэнсе наш народ практычна ўвесь непісьменны. Ці ж не ідыёцтва — зьвязваць выплату пэнсій з існаваньнем Аляксандра Рыгоравіча? І гэта разважаньні ня толькі лядачай бабкі, але нават часткі маладых!

Калі ў кожным 100000 горадзе мы прапусьцім праз асьветную сыстэму 100—200 чалавек, дык атрымаем важкую колькасьць пісьменных актывістаў. Гэта будзе павелічальнае шкло грамадзтва. Трэба вывучаць гісторыю прафсаюзнага руху ў Эўропе, мэтады іхняй барацьбы, бо мы ў нашым разьвіцьці ці не ў 1904-м…

Далей, трэба вучыць людзей мэтадам негвалтоўнага супраціву. На працы ў іх ёсьць начальнік, у двары і дома яны — вольныя людзі. Трэба выкараняць фаталістычнае ўяўленьне пра ўсёмагутнасьць улады, гэта ня так! Улада — не каменны блёк, што яна можа паддавацца ўзьдзеяньню. Рукі ва ўлады не разьвязаны абсалютна.

Улада стварае свой міт пра другую сусьветную вайну? Хай гісторык-патрыёт напіша аб'ектыўную брашуру на ключавыя тэмы. Моладзь гоняць у БРСМ? Напішыце, чаму гэта незаконна.

Як кажуць італьянцы, прапаганда павінна быць капілярнай, арыентаванай на праблемы кожнага пласта грамадзтва. Вялікая памылка ці бяда апазыцыі, што дагэтуль актывісты ня маюць даведніка па розных пытаньнях беларускага жыцьця. Чаму дагэтуль масе народу невядомы паказьнікі лепшага жыцьця нашых заходніх суседзяў? Чаму, нягледзячы на рост эканомікі, каля сарака працэнтаў насельніцтва недаядае?

Народ палохаюць вайною? Напішыце, чаму гэта практычна немагчыма ў Беларусі. Народ палохаюць NATO? Раскажыце ў брашурцы пра NATO.

Спадарам нацыянальным паэтам трэба даваць заказы на прадукцыю — сатырычныя вершы, мастакам — на карыкатуры; трэба ствараць субкультуру таталітарнага супраціву: ні дня бяз графіці, як казаў Апэлес. (Учора перачытаў сёе-тое зь Янкі Купалы. Паэт марна зьвяртаўся да мужыка, будзіў яго. А вось нам, мужыцкім сынам, грэх не пачуць паэта.)

Як бы ні выконвалі партыі і няўрадавыя арганізацыі капрызьлівыя патрабаваньні ўлады, апошнія знойдуць яшчэ больш вычварныя. Нават невідушчы бачыць, куды гэта вядзе.

Таму до! Ніякіх перарэгістрацый, ніякіх выкананьняў небясьпечных для апазыцыі распараджэньняў. У Амэрыцы было 11 верасьня, для нас гэта 17 кастрычніка. Барацьба перайшла ў іншую фазу. У нас ёсьць тыл — гэта вольны сьвет. У Беларусі не сканала дыктатура, ня скончыўся народ, не прапала апазыцыя, ёсьць пункты канцэнтрацыі супраціву, ня зьнікла мова, немінуча будуць выбары. Стаўшы самадастатковай, незалежнай ад народу, улада непазьбежна дэградуе. (Які вал недарэчных папяровых распараджэньняў пайшоў зьверху ўніз!) Ёсьць дзе сеяць. Дзіўна чуць, што апазыцыйныя вярхі апанаваў пэсымізм (у нас ужо ёсьць адзін трансьлятар эсхаталягічнага, страшнага і жудаснага). Перашкода — гэта нараджэньне новай магчымасьці. Дыктатуру ў лоб ня возьмеш, трэба гуртам браць яе за мяккае падчарэўе.




**Мікола Бусел, Дуброва (Сьветлагоршчына)**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

15 лістапада на дэпутата Гарадоцкага райсавету **Леаніда Гаравога** склалі пратакол за «дробнае хуліганства»: як дырэктар Вархоўскай базавай школы ён перашкодзіў супрацоўніку раённага аддзелу адукацыі атрымаць пісьмовыя тлумачэньні ад прыбіральшчыцы сваёй школы. Суд 23 лістапада адклаў пасяджэньне па справе Гаравога, бо пракуратура не дала дазволу прыцягваць да адказнасьці дэпутата. Недзяржаўнай газэце **«Кур'ер з Барысава»** 15 лістапада Мінінфармацыі вынесла папярэджаньне — за публікацыю «інфармацыі маcава-палітычнага зьместу» й за адсутнасьць імя заснавальніка ў выходных зьвестках. 23 лістапада ў Горадні на ўдзельніка ўшанаваньня памяці братоў Каліноўскіх у Сьвіслачы (31 кастрычніка) **Дзяніса Івашына** склалі пратакол за ўдзел у несанкцыяваным мітынгу й выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі. 24 лістапада такі ж пратакол склалі на **Валер'я Маціяса**. Крымінальную справу **Міхаіла Марыніча** 23 лістапада перадалі ў Менскі райсуд. Падчас акцыі ў падтрымку Юшчанкі ў Менску 24 лістапада затрыманы актывіст «Зубра» **Мікіта Сасім**. 25 лістапада на беларуска-ўкраінскай мяжы з украінскага боку былі затрыманыя каардынатар «Хартыі'97» **Зьміцер Бандарэнка** (яму пры затрыманьні вывіхнулі руку), актывісты «Зубра» **Ўладзімер Кобец**, **Зьміцер Барадка**, **Аляксандар Атрошчанкаў**, якія ўдзельнічалі ў акцыях у падтрымку Юшчанкі ў Кіеве. У той самы дзень суд вызваліў іх праз адсутнасьць складу злачынства. 25 лістапада калегія Менгарсуду адхіліла скаргу **Вольгі Завадзкай** на дзеяньні пракуратуры Беларусі, якая адмовілася вяртацца да разгляду справы ейнага сына Зьмітра. Пракуратура Ленінскага раёну Менску 25 лістапада адмовілася пачынаць крымінальную справу па факце зьбіцьця кіраўніка АГП **Анатоля Лябедзькі** й **журналістаў** расейскіх тэлеканалаў **НТВ** і **Ren-TV** праз адсутнасьць складу злачынства ў дзеяньнях міліцыянтаў. Рэдактара ваўкавыскай «Местной газеты» **Андрэя Шантаровіча** 26 лістапада аштрафавалі на 50 базавых велічыняў за «несанкцыянаваны пікет» — так раённы суд ацаніў ягоную галадоўку. Суд Полацку 26 лістапада адмовіў **Свабоднаму прафсаюзу беларускаму** (СПБ) у пазове да Наваполацкага гарвыканкаму: СПБ палічыў незаконным, што гарвыканкам не зарэгістраваў трох аргструктур СПБ — Наваполацка-Полацкую рэгіянальную арганізацыю, а таксама арганізацыі на ААТ «Нафтан» і Наваполацкай ЦЭЦ. Уначы з 27 на 28 лістапада ў Шчучыне затрыманы **Зьміцер Кіенка**: яго і двух мінакоў, якія пагадзіліся стаць сьведкамі, спрабавалі абвінаваціць у распаўсюдзе газэты «Тут і цяпер». Іх пратрымалі ўсю ноч, пратаколаў не складалі, справай займецца КДБ. 29 лістапада на трое сутак арыштаваны **Ягор Баброў** — за ўдзел у акцыі 21 кастрычніка ў Менску, яго тады ж затрымалі, але адпусьцілі. Старшыня «Гарадзенскага выбару» **Зьміцер Іваноўскі** затрыманы 29 лістапада падчас несанкцыяванага мітынгу прадпрымальнікаў: яго абвінавацілі ў распаўсюдзе ўлётак з заклікам прыняць удзел у акцыі. 29 лістапада пракуратура Баранавічаў вынесла папярэджаньне экс-кандыдату ў дэпутаты ПП НС **Аркадзю Блінкоўскаму**, які ў сваім артыкуле ў газэце «Intex-press» заявіў пра фальсыфікацыі вынікаў выбараў. Ушацкі суд 29 лістапада адмовіў у аднаўленьні на працы сябру ПБНФ **Мікалаю Пратасевічу**, даверанай асобе кандыдата ў дэпутаты, хаця суд прызнаў незаконнымі дзьве з чатырох вымоў, паводле якіх звальнялі Пратасевіча. Адміністрацыя ААТ «Рэчыцкі доследны завод «Рытм» 29 лістапада папярэдзіла пра звальненьне па скарачэньні штатаў старшыню прафсаюзнай арганізацыі РЭПАМ **Ірыну Паплаўную**, ня вызваленую ад асноўнай працы тэхноляга.

**АШ**

# Звышзадача белінтэлігенцыі

Працяг са старонкі 1.

Гэта сьведчыць, што кіраўніцтва «Белкнігі» ня здольнае кантраляваць сваю імпэрыю. Увогуле, у Менску з набыцьцём «ARCHE» не павінна быць праблемаў, бо тут хапае й незалежных крамак.

**— А ў Горадні ці Барысаве?**

— Па краіне застанецца сетка прыватнага распаўсюду, гэта ўсе абласныя цэнтры плюс найбуйнейшыя раённыя. Нашым адказам «Белкнізе» зьяўляецца праграма рэгіянальных прэзэнтацыяў, неўзабаве адбудзецца сустрэча рэдакцыі са студэнтамі аднаго з унівэрсытэтаў, ня буду называць якога, каб не сарвалі. У Менску нас набываюць ня толькі менчукі, прыязджаюць адусюль.

Сёньня экстрэмальная сытуацыя вакол «ARCHE» будзе індыкатарам здароўя незалежніцкай часткі беларускага грамадзтва, бо цяпер існаваньне любой культурніцкай ініцыятывы як ніколі залежыць ад грамадзкай падтрымкі, у тым ліку ў рэгіёнах. Улады радыкалізуюць такія асяродкі, якія склаліся, напрыклад, вакол «ARCHE», сваімі неразумнымі драконаўскімі рэпрэсіўнымі захадамі.

**— Па-мойму, мы іншых захадаў і ня бачым. Беларуская культура пасьлядоўна й мэтанакіравана заганяецца ў падпольле.**

— Нягледзячы на ўсе рэпрэсіі, дзяржава не дайшла да таго, каб дзеячаў беларускай культуры садзіць у турмы. Сёньня ніхто не забараняе выдаваць кніжкі, газэты, пісаць геніяльныя раманы й п'есы. Іншая справа, што дзейнасьць гэтая не санкцыянуецца дзяржавай альбо натыкаецца на яе халодную абыякавасьць.

Сёньня беларусы апынуліся ў такой самай сытуацыі, як палякі ў



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

1950-я гады. Ясна, што калі ня будзе нейкіх экстравагантных надзвычайных сытуацыяў, цяперашні рэжым праіснуе доўгі час. Польская інтэлігенцыя ў падобнай сытуацыі знайшла адзінае слушнае выйсьце — павялічвала культурны капітал нацыі. Напрыклад, толькі ў 1980-я гады ў drugim obegu, г.зн. у падпольлі, на грошы падпольнай «Салідарнасьці» было выдадзена больш за 10 тысяч кніжак, што ў немалой ступені й прывяло да мірнай перамогі дэмакратыі ў Польшчы.

Пры ўсёй сваёй паказной моцы беларускі рэжым мае адзін істотны недахоп — ён, як і рэжым савецкі, хранічна недаацэньвае культуру. Але Беларусь акурат належыць да той досыць рэдкай групы краінаў, дзе сама нацыя ўзьнікае ў выніку культурнай актыўнасьці. Магчыма, каб Францішак Багушэвіч ня выдаў двух сваіх геніяльных зборнікаў, праз сто гадоў Беларусь не атрымала б сваёй незалежнасьці. Прынамсі, прычынна-выніковыя сувязі паміж гэтымі дзьвюма падзеямі існуюць. І яшчэ адна звышзадача беларускай інтэлігенцыі — паказаць палітычнай адміністрацыі, што культура — гэта страшная палітычная сіла.

**— Тады гэта ўжо не культура. Мне здаецца, што культура й палітыка — гэта своеасаблівыя антыподы, яны ня могуць супадаць. Палітыка займаецца надзённымі праблемамі, культура — тэмамі вечнымі.**

— Праблема сёньняшняга беларускага інтэлігента — неразуменьне свайго месца ў культурніцкай прасторы. Дзеяньні дзеячаў культуры па-ранейшаму скіраваныя на стварэньне нейкіх абстрактных вечных вартасьцяў. А ва ўмовах усёабсяжнай палітызацыі грамадзтва яны павінны фармаваць бягучыя перакананьні шараговага беларускага грамадзяніна. Пара ўжо адысьці ад гэтых амбіцыяў накont вечнасьці й займацца злыбедамі й посьпехамі сярэднестатыстычнага беларуса. Мы павінны фармаваць культурную карціну сьвету суайчыньнікаў, перастаць займацца нейкімі малаактуальнымі абстрактнымі задачамі й перайсьці да палітызаванай, але непазьбежнай у нашых варунках культурнай працы. Чым і займаецца апошнія некалькі гадоў часопіс «ARCHE»: мы працуем зь беларускай эмпірыяй, мы адгукаемся на рэчаіснасьць, мы фармулюем нашы адказы на тыя выклікі, якія ставяцца перад грамадзтвам самой гісторыяй.

**— Апошні сёлетні нумар «ARCHE» прысьвечаны расейскамоўнай культуры ў Беларусі й праблеме нашай дзьвюхмоўнасьці. Ці варта беларускамоўнаму выданьню засяроджвацца на гэтай праблеме?**

— Нас цікавіла ідэалёгія, якой прытрымліваюцца прадстаўнікі расейскамоўнага лягеру. Якім чынам яны бачаць нашу краіну? І аказалася, што з боку нашых расейскамоўных калег існуе кансэнсус, што лукашэнкаўская практыка дзьвюхмоўя ёсьць правільнай. І Сьвятлана Алексіевіч, і Аляксандар Фядута, і Пётар Марцаў, і Леанід Заіка, і легіён іншых дзеячаў згодныя, што дзьвюхмоўе — гэта дабро для беларускай дзяржавы. Практычна ўсе з апытаных намі пацьвердзілі, што павінен быць «выбар» мовы навучаньня, што і ажыцьцявіў Лукашэнка. Мы бачым: тое, што было для беларускамоўнай інтэлігенцыі апаганьваньнем сьвятыняў, спрычыняла агромністыя псыхалягічныя траўмы, тое зьяўляецца нармальным для нашых расейскамоўных калег-інтэлектуалаў. І гэта вельмі небясьпечная зьява.

Нездарма ў тым жа нумары «ARCHE» ідзе наша палеміка зь Юр'ем Дракахрустам, які выказаў думку, што расейскамоўныя беларусы ёсьць найбольшымі прыхільнікамі дэмакратыі ў Беларусі. Мы паспрабавалі давесьці адваротнае: пакуль Беларусь будзе заставацца расейскамоўнай, датуль сур'ёзна гаварыць пра эўрапейскую інтэграцыю не выпадае. Бо якраз расейскамоўныя беларусы найбольш падпадаюць пад уплыў дзяржаўнай прапаганды. Пакуль беларуская мова будзе мець толькі нейкую дзялянку ў рэчышчы культурна-моўнага апартэіду, датуль беларуская дзяржава будзе бясконца далёкай ад Эўропы.

> Пакуль у краіне будзе моўны апартэід, беларуская дзяржава будзе бясконца далёкай ад Эўропы.

Сёньня ні ў якім разе нельга ўпадаць у паняверку й стагнацыю. Беларускае культурніцкае поле вельмі мала занятае. Скажам, у сэгмэнце літаратурна-мастацкіх выданьняў існуюць толькі два больш-менш рэгулярныя праекты — «ARCHE» й «Дзеяслоў». Патрэбныя сілы, аптымізм і ўлучанасьць у агульнаэўрапейскі кантэкст. Вельмі часта можна пачуць, што Лукашэнка раз і назаўсёды перамог так званы беларускі нацыяналізм. Гэта дурасьць. Янку Купалу й Якуба Коласа ня зможа перамагчы ніякі Лукашэнка. І самае галоўнае, неабходна ўсьвядоміць, што Беларусь — гэта краіна, якая творыцца нашымі думкамі, нашымі ідэямі й нашымі рукамі.

**Гутарыў Міхась Скобла**
**Паводле радыё «Свабода»**

НАВІНЫ СПОРТУ

## БФФ падвяла вынікі

Беларуская фэдэрацыя футболу вызначыла сьпіс з 22 найлепшых гульцоў першынства. У групу «А» (першыя нумары) увайшлі менскія дынамаўцы Сяргей Паўлюковіч, Ян Цігараў, Андрэй Разін, Віталь Валадзянкоў, Юры Шуканаў, Леанід Ковель, гульцы БАТЭ Юры Жаўноў, Алег Страхановіч, а таксама Аляксандар Юрэвіч («Шахцёр», Салігорск), Раман Васілюк («Дынама», Берасьце), Валер Стрыпейкіс («Нафтан», Напапалацк). Найлепшы галкіпер — Ю.Жаўноў, абаронца — С.Паўлюковіч, паўабаронца — А.Разін, форвард — В.Стрыпейкіс.

## Герой нашага часу

У чарговым туры футбольнае бундэсьлігі «Баварыя» перамагла дэбютантаў сэзону «Майнц» 4:2. На 24-й хвіліне сустрэчы гулец мюнхенскага клюбу і зборнай Нямеччыны Мэхмэд Шоль зламаў скіўіцу адразу ў двух месцах. Але пра гэта ён даведаўся толькі пасьля фінальнага сьвістка, у бальніцы. Нягледзячы на невыносны боль, Шоль адгуляў усю сустрэчу, забіў мяч і аддаў галявы пас.

## Посьпех украінскага футболу

20 сьнежня ў «Opera House» у Цюрыху будзе названы найлепшы гулец году паводле вэрсіі Міжнароднай фэдэрацыі футболу. Прэтэндэнты: Андрэй Шаўчэнка («Мілян», зборная Ўкраіны), Т'еры Анры («Арсэнал», зборная Францыі), Раналдзіньё («Барсэлёна», зборная Бразыліі). Шаўчэнка — прэтэндэнт і на атрыманьне «Залатога мяча», які ўручаецца паводле апытаньня «France Football». «Залаты мяч» — куды больш прэстыжны прыз. Летась яго атрымаў паўабаронца «Ювэнтусу» і зборнай Чэхіі Павал Нэдвэд.

## Дзе варта быць

У чацьвер у Нарвэгіі жаночым і мужчынскім спрынтам стартуе першы этап Кубку сьвету па біятлёне. Паказваць у жывым этэры гэтае відовішчнае спаборніцтва ўзяўся тэлеканал «Лад». У суботу (у 11.55 і ў 13.55) будуць трансьлявацца гонкі пераследу ў жанчын і мужчын, у нядзелю (у 11.25 і 13.10) — эстафэты.

**АР**

# Прэзэнтацыя з трыма «не»

26 лістапада ў клюбе «Леа» ўрэшце адбылася прэзэнтацыя ліцэйскага дыску «Веру ў цябе». Першая спроба прэзэнтаваць праграму не ўдалася: у траўні зь невядомых прычынаў ліцэістам адмовіў клюб «Рэактар», у жніўні тое ж адбылося ў «Бліндажы». Цяпер арганізатары абмяжоўваліся мінімальнаю рэклямаю, каб не прыцягваць увагі чыноўнікаў. Але заля была амаль запоўненая.

Напярэдадні дырэкцыя клюбу выставіла арганізатарам тры ўмовы: не прыцягваць «забароненых гуртоў», не згадваць «забароненага Ліцэю», не выкарыстоўваць «беларускага афармленьня» і «палітыкі». Абмежаваліся голай сцэнай, а калі Андрэй Хадановіч выкрыкнуў «Жыве Ліцэй!», ледзь угаварылі адміністрацыю не спыняць імпрэзы. Дарэчы, свайго абяцаньня здабыць канцэртную апаратуру клюб ня выканаў.

Выступілі ліцэіст Коля Тоўсьцік з рок-н-роламі, лірык Павал Супаненка, выкладнікі Андрэй Хадановіч з Аляксеем Крукоўскім выканалі шэраг кавэраў на ўсім вядомыя песьні. Гурт «Парасон», удзельнік праекту «Веру ў цябе», прасьпяваў некалькі ўласных песень, сярод якіх кавэр пінкфлойдаўскага «Another Brick in The Wall», дзе замест «We don't need your education» гучала «Нам ня трэба вашых школаў...» Пасьля выступіў прызэр «Басовішча» «Тарпач» і, на завяршэньне, ліцэйскі гурт «The Mediums».

А вось абяцаная гледачам беларуская дыскатэка не адбылася. Клюб папярэдзіў, што, маўляў, у іх ужо і так будуць праблемы...

**ЛР**

# Год «Адкрытаму архіву»

**Тэлеперадача «Адкрыты архіў» на сёньня — інтэлектуальная вітрына БТ. У Купалаўскі музэй павіншаваць перадачу з днём нараджэньня сабраліся Ўладзімер Арлоў і Максім Жбанкоў, Пятро Васючэнка і Міхась Чарняўскі, Ганна Запартыка і Людка Сільнова і яшчэ дзясяткі інтэлектуалаў.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Адкрыты архіў» узьнік год таму пры супрацы тэлерэжысэра **Алеся Матафонава (на фота)** й гісторыка Віталя Скалабана. Кожная перадача доўжыцца 26 хвілін.

Генпрадусар БТ Уладзімер Субат заззначыў, што сам часам баіцца, каб «Адкрыты архіў» ня стаў «закрытым». Ня дзіва! Матафонаў са Скалабанам падчас вечарыны дэманстравалі і ўрыўкі зь перадач, якія па тых ці іншых прычынах ня выйшлі ў этэр. Напрыклад, перадача, прысьвечаная Лаўрэнцію Абецэдарскаму яшчэ толькі падрыхтаваная да паказу. «Мы доўга думалі, якой зрабіць гэтую перадачу, каб пасьля яе не закрылі праект», — прызнаўся А.Матафонаў.

Настаўнік Матафонава па Ўнівэрсытэце культуры культуроляг Вячаслаў Ракіцкі адзначыў, што вельмі важна захаваць унікальныя тэлеперадачы «Адкрытага архіву»: на БТ стужкі не захоўваюцца больш за 5 гадоў. Аўтары ж перадачы ня маюць на яе ніякіх правоў пасьля паказу па тэлебачаньні й атрыманьня ганарару — уладальнікам робіцца тэлеканал. Матафонаў зазначыў, што быў бы рады, калі б нехта дапамог выхаду перадач «Адкрытага архіву» на відэа.

**Адам Воршыч**

# Урачыстасьці ў Слуцку

27 лістапада на Случчыне адзначаліся 84-я ўгодкі Слуцкага збройнага чыну. Сябры КХП-БНФ наведалі месцы баёў у Грозаве, Семежаве і Вызьне (цяпер Чырвоная Слабада). На магілах змагароў былі ўскладзены кветкі. У Слуцку калёна з больш як 80 чалавек прайшла пад бел-чырвона-белымі сьцягамі па цэнтры гораду. Каля краязнаўчага музэю, дзе ў 1920 г. адбыўся зьезд Случчыны, які прыняў рашэньне аб узброенай барацьбе супраць расейскіх агрэсараў, адбыўся мітынг. Пазьней на тое ж месца прыехалі сябры партыі БНФ «Адраджэньне», але паколькі яны не атрымалі дазволу ад гарвыканкаму, мітынгу не было.

**АТ**

# Тэатры

**Опэра**

**2** (чц) — «Царская нявеста».
**4** (сб) — «Сэвільскі цырульнік».
**5** (ндз) — «Аіда».
**7** (аўт) — «Вечар рамансу».
**9** (чц) — «Тоска».
**11** (сб) — «Яўген Анегін».

**Балет**

**3** (пт) — «Лебядзінае возера».

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**2** (чц) — «Івона, прыцэса Бургундзкая».
**3** (пт) — «Памінальная малітва».
**4** (сб) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**5** (ндз) — «Ромул Вялікі».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**2** (чц) — «П'емонцкі зьвер».
**4** (сб) — «Адвечная песьня».
**5** (ндз) — «Палёты з анёлам».

**Моладзевы тэатар**

**2** (чц) — «Хітрая закаханая».
**3** (пт) — «Жарсьці ў Віндзоры».
**4** (сб) — «На вачах у жаночай берагавой аховы».
**5** (ндз) — «Тойбэле і яе дэман».

**Тэатар імя Горкага**

**2** (чц) — «Дзівакі».
**3** (пт) — «Сунічная паляна».
**4** (сб) — «Дэтэктар хлусьні».
**5** (ндз) — «Тэрмінова патрабуецца... самагубца».
**7** (аўт) — «Тата, тата, бедны тата!..».
**8** (ср) — «Адзіны спадкаемца».
**9** (чц) — «Анджэла і іншыя».
**10** (пт) — «Трагічная аповесьць пра Гамлета, прынца Дацкага».
**11** (сб) — «Перад заходам сонца».
**12** (ндз) — «Вольны шлюб».

# Выставы

**Чалавек і бясьпека**

**З 7 да 10 сьнежня** ў выставачным павільёне на пр.Машэрава, 14 адбудзецца Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Чалавек і бясьпека». Асноўныя напрамкі экспазыцыі: асабістая бясьпека грамадзян (сыгналізацыйныя сыстэмы асабістай бясьпекі і аховы маёмасьці, электрашокавыя прыстасаваньні і электронныя сыстэмы абароны, газавая зброя, асабістыя сродкі аховы, сыстэмы аховы жылых памяшканьняў, замкі і г.д.); чалавек, экалёгія і здароўе; апэратыўна-крыміналістычная тэхніка аховы правапарадку...

**Цырульнае майстэрства**

**З 9 да 12 сьнежня** ў выставачным павільёне на вул.Я.Купалы, 27 адбудзецца 4-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Інтэрстыль-2004». Падчас выставы пройдзе 7-ы Адкрыты конкурс Беларусі па цырульным майстэрстве на кубак Менску.

**Фота хоку**

**З 10 да 19 сьнежня** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастатцва (пр.Ф.Скарыны, 47) працуе літаратурна-фатаграфічная выстава «Фота хоку» Дзьмітрыя Плаксы і Ігара Корзуна (Швэцыя—Беларусь). Квіткі — 2000.

**Музыка Менску**

**11 і 12 сьнежня** на катэдры графічнага дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (Каліноўскага, 50а) працуе выстава «Музыка Менску» Стэфана Люндгрэна (Швэцыя).

**Японская кераміка**

У Нацыянальным мастацкім музэі **да 6 сьнежня** працуе выстава японскай керамікі. Квіткі — 2000.

**Арцель мастакоў**

У музэі сучаснага выяўленчага мастатцва **з 9 да 18 сьнежня** працуе выстава-прэзэнтацыя «Арцель мастакоў». Квіткі — 2000

**Нясьвіскія калекцыі Радзівілаў**

**Да 5 сьнежня** ў мастацкім музэі праце выстава «Нясьвіскія калекцыі Радзівілаў». Квіткі — 2000.

**Два жыцьці напракат**

**Да 19 сьнежня** ў Доме фота (вул. Мясьнікова, 78) працуе выстава фатаздымкаў Валер'я Цітова «Два жыцьці напракат». Уваход вольны.

# Клюбнае жыцьцё

**Белая вежа** (284–69–22)

**2** (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Grizzly.
**3** (пт), 23.00 — «Поп-корм, альбо Гісторыя цацак»: dj Конь, dj Юма, d-jane Юма Юніёр.
**4** (сб), 22.00 — dj Міхель.
**5** (ндз), 22.00 — dj Alex.

**Бліндаж** (219–00–10)

**2** (чц), 23.00 — dj Egor.
**3** (пт), 23.00 — Blind Rave.
**4** (сб), 23.00 — dj Egor.
**5** (ндз), 23.00 — dj Egor.

**Bronx** (288–10–61, Velcom: 103, 105)

**2** (чц), 22.00 — dj-bar.
**3** (пт), 22.00 — жывая музыка.
**4** (сб), 23.00 — dj-bar.

**Гудвін** (226–13–06, 626–13–03)

**2** (чц), 21.00 — жывая музыка.
**3** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**4** (сб), 21.00 — жывая музыка.
**5** (ндз), 21.00 — жывая музыка.
**6** (пн), 21.00 — жывая музыка.

**X-Ray** (223–93–55)

**3** (пт), 22.00 — «X-Ray Yourself»: dj Kastilla, dj Dasha Pushkina.
**4** (сб), 22.00 — dj-bar.




# Менская кінаафіша з 3 да 5 сьнежня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Уімблдон» (прэм'ера): **3—5** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
«Кепскія дзяўчаты»: **3—5** (пт—ндз) 16.30, 18.30, 20.30.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Белыя цыпачкі»: **3** (пт) 16.20 (іл, пд), 18.40 (іл, пд), 21.00 (пд); **4, 5** (сб, ндз) 16.20, 18.40, 21.00 (пд).
«Прынц і я»: **4, 5** (сб, ндз) 14.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Два нулі»: **3** (пт) 18.00 (іл); **4** (сб) 20.00; **5** (ндз) 18.00.
«Тата»: **3** (пт) 20.00; **4** (сб) 18.00; **5** (ндз) 20.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Уімблдон» (прэм'ера): **3** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00 (пд); **4, 5** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00 (іл, пд).
**«Масква»** (223-27-10)
«Уімблдон» (прэм'ера): **3** (пт) 17.00, 19.00 (пд), 21.00 (пд); **4, 5** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00 (пд), 21.00 (пд).
**«Мір»** (284-37-71)
«Два нулі»: **3, 4** (пт, сб) 16.00, 20.20; **5** (ндз) 16.00 (іл), 20.20.
«Ван Хельсынг»***: **3—5** (пт—ндз) 18.10.
«Эфэкт матылька»***: **3—5** (пт—ндз) 16.40, 18.50, 21.00.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Галава ў воблаках» (прэм'ера): **3** (пт) 16.00, 18.40, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.40, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Пярэпалах у інтэрнаце»: **3—5** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Два нулі»: **3, 4** (пт, сб) 19.00, 21.00; **5** (ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

# Для дзяцей:

**Опэра**

**12** (ндз) — «Горад майстроў».

**Балет**

**5** (ндз) — «Чыпаліна».

**Тэатар юнага гледача**

**2** (чц), 18.00 — «Паганага нораву варты плён».
**3** (пт), 19.00 — «Маленькія трагедыі».
**3** (пт), 14.00, **4** (сб), 11.00, 14.00 — «Папялушка».
**5** (ндз), **12** (ндз) 11.00 — «Залатое сэрцайка».
**5** (ндз), 16.00 — «Паліяна».
**7** (аўт), 18.00 — «Палачанка».
**11** (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка».
**12** (ндз), 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**5** (ндз) — «Афрыка».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**3** (пт) — «Хрустальны туфлік».
**5** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

**Юнаму гледачу:**

**«Аўрора»**
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **3** (пт) 14.30; **4, 5** (сб, ндз) 12.30, 14.30.
«**Берасьце**»
«Ледавіковы пэрыяд»: **3** (пт) 12.00, 14.00.
Зборнік мультфільмаў: **4, 5** (сб, ндз) 12.00.
«**Дружба**»
«Ледавіковы пэрыяд»: **3** (пт) 12.00, 14.00; **4, 5** (ндз) 11.00, 13.00.
«**Мір**»
«Я — Цэзар»: **4, 5** (сб, ндз) 13.00.
«**Піянер**»
«Карлік Нос»: **3** (пт) 11.00; **4, 5** (сб, ндз) 11.00, 15.00.
«Кашэчыя лісты»: **3** (пт) 15.00; **4, 5** (сб, ндз) 13.00.

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

## Беларускія музыкі — за Юшчанку

Групы «ZET», «Крамбамбуля» хочуць выступіць у найбліжэйшым часе на галоўным кіеўскім пляцы. Музыкі маюць папярэднюю дамоўленасьць з украінскім бокам і гатовы прыехаць у сталіцу Украіны за свой кошт. Група «Індыга» дакладна едзе ў Кіеў — грае сольны канцэрт 2-га сьнежня ў клюбе «44».

## Новая хатка Пузыні

Вядомы рэстаўратар і музыка Ўладзімер Пузыня пры канцы году мае адчыняць свой музэй-майстэрню «Беларускую хатку». Папярэдняя майстэрня, якая 20 гадоў праіснавала ў адным з інтэрнатаў Беларускага ўнівэрсытэту культуры, увосень 2002 г. была зачыненая, калі адміністрацыя БУКу звольніла майстра. Пузыня адрадзіў сурму, басэтлю, дуду, флейту, удасканаліў цымбалы, жалейку, ліру. З гукаў Пузыневай сурмы пачынаўся навучальны год у Беларускім ліцэі. Дарэчы, на пасьлярэфэрэндумных мітынгах у кастрычніку ён захварэў на запаленьне лёгкіх. Цяпер майстар знаходзіцца ў клініцы кіраўніцтва справаў прэзыдэнта (былая «Лечкамісія»).

## Прэмія Кіта

1 сьнежня адбылося ўручэньне прэміі імя Барыса Кіта. Ляўрэатамі сёлета сталі пісьменьнік Уладзімер Арлоў і геоляг акадэмік Радзім Гарэцкі.

## Бутэвічу — за Ажэшку

Пісьменьнік Анатоль Бутэвіч стаў ляўрэатам літаратурнай узнагароды апольскай асацыяцыі «ZaiKS» за пераклад раману Элізы Ажэшкі «З-над Нёману». З гэтага раману ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» была адноўлена сэрыя «Скарбы сусьветнай літаратуры».

## Гран-пры «Лістапада»

Найбольшую колькасьць прызоў на XI Мінскім фэстывалі «Лістапад-2004» атрымаў расейска-ўкраінскі фільм «Кіроўца для Веры» (рэж. Павал Чухрай): за найлепшую рэжысуру, за найлепшыя мужчынскую (Багдан Ступка) і жаночую (Алена Бабенка) ролі. Прызам «За найлепшую рэжысуру» быў адзначаны таксама фільм Дзьмітрыя Месхіева «Свае».

## Толкін пад аховай

Дом Дж.Р.Р.Толкіна ў перадмесьці Оксфарду, дзе ён пісаў «Хобіта» і «Валадара пярсьцёнкаў», урад Вялікабрытаніі ўзяў пад ахову й занёс у сьпіс гістарычных помнікаў. Гэта 8-пакаёвы будынак, дзе пісьменьнік жыў у 1930—1947 г. падчас працы ў тамтэйшым унівэрсытэце.

## Сышоў Хейлі

У сваім доме на Багамскіх выспах у 84 гады ад інсульту ў сьне сканаў пісьменьнік Артур Хейлі. Ён аўтар 11 раманаў, самыя вядомыя зь іх «Аэрапорт», «Гатэль», «Колы». Хейлі нарадзіўся ў Англіі ў 1920 г., ня скончыў школы, бо бацькі не змаглі заплаціць за навучаньне. Падчас вайны быў лётчыкам, выконваў выведвальныя палёты на Блізкім Усходзе. Пісаць пачаў з сцэнароў для тэлевізіі. Крытыкі ганілі раманы Хейлі за мастацкую недасканаласьць, але адзначалі іх надзвычайную рэалістычнасьць: аўтар пісаў толькі пра тое, у чым добра разьбіраўся. З канца 70-х Хейлі пасяліўся зь сям'ёй (меў ад двух шлюбаў чатырох сыноў і дзьвюх дачок) на Багамах і ў апошнія гады перастаў пісаць для публікі.

## Жорсткі Бэсон

Два найбуйнейшыя брусэльскія кінатэатры адмовіліся дэманстраваць новы фільм П'ера Марэля паводле сцэнару Люка Бэсона «Перадмесьце 13», спасылаючыся на залішнюю жорсткасьць кінатвору. У Францыі за першы тыдзень кіно паглядзелі блізу 500 тыс. чалавек. Фільм распавядае, як вязень дапамагаў спэцаддзелу паліцыі разблытваць злачынствы.

**АВ, Сяргей Будкін; БелаПАН, Gazeta.pl**

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## «Анталёгія кіно» і «Падарожжа дылетанта»

Зь перадач апошняга тыдня запомнілася «Анталёгія беларускага кіно». Там можна было пачуць, як фільм нашага земляка Ю.Тарыча «Крылы халопа» быў уключаны амэрканцамі у сьпіс найлепшых сусьветных. Адкрыцьцём для мяне стала наяўнасьць у гісторыі нашага кіно папярэдніка Азаронка — Корш-Сабліна. Яго фільм «У агні народжаная» прысьвечаны «ратаваньню» беларусаў ад БНР. Ідзе год 1929-ы, антыгероі фільму (у кадрах лёгка пазнаеца Ластоўскі) жывуць на Беларусі, куды прыехалі, паверыўшы новай уладзе. Але вострыя пытаньні стваральнікі перадачы старанна абыходзяць. Без адказу застаецца, чаму зь «Лясной былі» выразаны кадар з А.Чарвяковым і ншымі кіраўнікамі Рэспублікі.

Непрыемна ўразілі ў «Падарожжы дылетанта» (перадача, якую я вельмі люблю) эпізоды, прысьвечаныя Гаўрылу Беластоцкаму. Нашто папулярызаваць стары чорны міт аб рытуальных забойствах, ствараць на гэтым культ для дзяцей? Прыкра, што сп.Жыгімонт падае ўсё гэта некрытычна.

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Аблокі ў ложку, вайна і здрада



«Галава ў аблоках» («Head in the Clouds»)
ЗША—Вялікабрытанія—Гішпанія—Канада, 2004, каляровы, 121 хв.
**Жанр:** гістарычная мэлядрама
**Адзнака:** 5,5 (з 10).

«Галава ў аблоках» — гэта гісторыя каханьня, якое разгортваецца ў 1930—1940-я гады, падчас вайны і ў розных краінах. Гай сустракае авантурную і расьпешчаную Гільду ў Кембрыджы, але ім не наканавана быць разам. Толькі калі Гільда (Шарліз Тэрон) адкрывае выставу ў Парыжы, Гай (Сьцюарт Таўнсэнд) знаходзіць яе і жыве зь ёй — і яе сяброўкай Міяй (Пэнэлёпай Крус).

Лёгкі і нязмушаны любоўны трохкутнік (адзін з бакоў якога не зусім традыцыйны) распадаецца, калі надыходзіць вайна. Гай і Мія зьяжджаюць на вайну ў Гішпанію, а абураная грамадзянскім выбарам сяброў Гільда аддае перавагу апалітычнай творчасьці й прыватнаму жыцьцю. Але вайна толькі пачынаецца, і гэта не канец любоўным выпрабаваньням.

Рэжысэр Джон Дуіган трапна аднаўляе прыватную гістарычную атмасфэру, мастак фільму Джонатан Лі правёў месяцы ў вывучэньні старых фатаграфій, а шыкоўныя касьцюмы Марыё Давігнона, якія нагадваюць тагачасныя рэвалюцыі ад Како Шанэль, надзвычай пекна глядзяцца на Шарліз Тэрон і Пэнэлёпе Крус.

Драматургія карціны часам вялая, аўтары не заўжды ведаюць, што ім рабіць з героямі, і зьбіваюцца на спрошчаны дыдактызм. Для шчымлівага лірызму бракуе рэжысэрскага погляду, а для грунтоўнай эпічнасьці — канфліктаў.

Але дасьціпныя дыялёгі нададуць шарм, пекны эратызм сагрэе, а асобныя стылёвыя дэталі — рудыя трусы на павадку, палюбоўнікі ў капелюшах і з гальштукам у ваньне — гэта нязмушаныя разынкі сапраўднага кіно.

**Андрэй Расінскі**

ФЭЛЬЕТОН

# Правільная мадэль паводзінаў

Віктар Шандаровіч

**Некалі Кіеў быў маці гарадоў рускіх. Цяпер афіцыйная Масква глядзіць на маму з трывогай і нават спрабуе лячыць. Але такое адчуваньне, што позна піць баржомі.**

А яшчэ ж у нядзелю ўсё ішло цалкам у рамках расейскіх паліттэхналягічных напрацовак — перакінулі на ўкраінскі фронт дывізію разнастайных паўлоўскіх, папсу да агітацыі прыстроілі, ад Веркі Сярдзючкі да Ўладзімера Пуціна.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што менавіта прэзыдэнт Пуцін першым і ледзьве не апошнім павіншаваў Януковіча зь перамогай. Другім — і апошнім — Януковіча павіншаваў зь перамогай Лукашэнка; на гэтым паток віншавальных тэлеграм вычарпаўся. Але Лукашэнка — адрэзаная луста, а з нашым усё куды драматычней.

Бо Пуцін жа хоча да людзей і цягнецца да заходніх каштоўнасьцяў — я маю на ўвазе перш за ўсё нерухомасьць і прадметы побыту. І стаяць яму падабаецца ня побач з Кім Чэн Ірам і бацькам гэтым, назаўсёды перавыбраным, а з Тоні Блэрам ці Сыльвіё Бэрлюсконі на благі канец… Ён сябе ў такой кампаніі чалавекам адчуваць пачынае.

На «вялікай васьмёрцы» патусавацца з Бушам-юніёрам, на машынцы для гольфу пракаціцца зь ветрыкам.… І каб пахла не анучай ды партрэтам Дзяржынскага, а цывідам і «Крысьтыянам Дыёрам».

Але тайная драма нашага гаранта заключаецца ў тым, што для ўсяго гэтага трэба паводзіць сябе як мінімум ня горш за Бэрлюсконі: бізнэс пакрываць цішэй, парлямэнтам не падцірацца, не раскідваць пальцы па ўсім Каўказе… Ня езьдзіць у сувэрэнныя суседнія дзяржавы агітаваць за клясава блізкіх рэцыдывістаў…

Вось за што я люблю нашага прэзыдэнта найбольш — за шчырасьць! Вось і цяпер: спачатку два месяцы напралёт у працоўны час піярыць Януковіча і кідаць кавалкі расейскага бюджэту ў топку гэтага данецкага паравоза, а потым выйсьці ў Лісабоне і сказаць: панове, нашто вы фарбуеце аднаго кандыдата ў расейскія колеры? Гэта контрапрадуктыўна, панове! Панове, вы зьвяры…

Аналягічны парадак дзеяньняў (спачатку пажыць у сваё задавальненьне па паняцьцях, а потым выйсьці ва ўсім белым) добра асвоілі і пуцінскія калегі ў самой Украіне.

Выступаючы ў мінулую сераду, прэзыдэнт Украіны Леанід Кучма ацаніў дзеяньні апазыцыі як «замах на сувэрэнітэт і непадзельнасьць Украіны», падкрэсьліўшы, што апазыцыя «штурхае на раскол дзяржавы». Прэзыдэнт зьвярнуўся з заклікам да палітычных сіл заставацца ў прававым полі. З гэтым жа заклікам да апазыцыі зьвярнуўся Віктар Януковіч.

Вось правільная мадэль дзяржаўных паводзін. Намаляваць прэм'ер-міністру, насьледнічку, што дзесяць працэнтаў яўкі, засандаліць на яго шалі тону сапсаваных бюлетэняў; самому ў гэты час зьнікнуць з вачэй, нібыта цябе няма ў прыродзе… а калі сотні тысяч абакрадзеных выбаршчыкаў выйдуць на вуліцы — зьявіцца каля свайго трызубца з заклапочаным жоўта-блакітным тварам і сказаць: давайце, суграмадзяне, заставацца ў прававым полі…

Потым зацьвердзіць у ЦВК усе гэтыя фількіны граматы як афіцыйныя вынікі выбараў — і зноў заявіць: давайце будзем цывілізаванымі людзьмі! І, на ўсякі выпадак, аблажыцца АМАПам. Гэта значыць, іначай кажучы, падпільнаваць чалавека, даць яму па твары, а калі ён падымецца і пойдзе даць здачы, закрычаць: «Толькі бяз рук!» — і тут жа зноў даць па тварах. І адразу выклікаць міліцыю. Выдатная схема! Вось толькі ці пройдзе гэты нумар на Храшчаціку цяперашняй зімой, я ня ведаю. Ня ўпэўнены.

**Паводле «Эхо Москвы»**




**КІЕЎСКАЯ МОДА: кожны модны бутык лічыць за гонар упрыгожыць вітрыну па- юшчанкаўску і зрабіць зьніжку «ўдзельнікам акцыі грамадзянскай непакоры».**

## КРЫЖАВАНКА



**Па вертыкалі**: **2**. Падкова-падобная вежа замку ля яго ўваходу. **3**. Замежны агляд. **4**. Уласьцівасьць. **6**. Немэлядычнае гучаньне. **7**. Зьнешняя частка дрэва. **8**. Злодзей-рабаўнік. **9**. Дапаўненьне. **10**. Антыпод нулявога мэрыдыяну. **13**. Інструмэнт для падважваньня грузу. **17**. Фундатар. **18**. Асаблівая ласка. **21**. Вялікая адлегласьць часу. **22**. Так беларусы ў лесе крычаць. **25**. Адсечаны кавалак. **26**. Гэта калі грошы ёсьць, а траціць шкада. **28**. Дрыгва. **29**. Невыпадкова. **30**. Іначай — калматы. **32**. Апавяданьне Васіля Быкава. **33**. Гарэзьлівая дзеўчына. **37**. Сьпіс страў, якія толькі што скончыліся. **38**. Унівэрсальны адказ на пытаньне «чаму».

**Складальнік: Аляксандар Ворвуль, vorvule@tut.by**

**Па гарызанталі**: **1**. Пірацкая атака. **5**. Паўднёваэўрапейскі рэгіён. **11**. Верш-чытанка па першых літарах. **12**. Частка крыла самалёта. **14**. Калега абатысы. **15**. Малы неахайны кавалак тканіны або паперы. **16**. Раней — мясная крамка, цяпер — любая. **19**. Спаборнік у дыспуце. **20**. Іначай — возера. **21**. «Альтэр ...». **23**. Асноўная мера даўжыні. **24**. Суп бязь юшкі. **27**. Першая частка назвы сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. **31**. Беспадстаўная хоробрасьць. **33**. Мясны выраб з фаршу. **34**. Рускае «в сторону». **35**. Мэханічнае начыньне. **36**. Паганская ікона. **39**. Навуковец-генэрал. **40**. Тутэйшы плютакрат. **41**. Праваслаўны сьвятар. **42**. Галоўная частка стравы.

**Адказы**

**Па гарызанталі**: 1. Абардаж. 5. Балканы. 11. Акраверш. 12. Закрылак. 14. Абат. 15. Абрывак. 16. Ятка. 19. Апанэнт. 20. Азярына. 21. Эга. 23. Мэтар. 24. Гушча. 27. Абу. 31. Бравада. 33. Катлета. 34. Убок. 35. Тэхніка. 36. Ідал. 39. Акадэмік. 40. Этнакрат. 41. Бацюшка. 42. Рахунак.
**Па вертыкалі**: 2. Барбакан. 3. Рэвю. 4. Атрыбут. 6. Асананс. 7. Кара. 8. Налётчык. 9. Дадатак. 10. Экватар. 13. Рычаг. 17. Мэцэнат. 18. Пяшчота. 21. Эра. 22. Агу. 25. Абрубак. 26. Задорага. 28. Багна. 29. Нездарма. 30. Кашлаты. 32. Абэліск. 33. Какетка. 37. Мэню. 38. Таму.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**З дваццатым агулам** і чацьвёртым у гэным стагодзьдзі Днём народзінаў віншую мілую сяброваньку Тасю! Будзь! Проста будзь! Сяргей

**Ksienia**, vinšuju! Žadaju bolej śviethaha, mieniej niepatrebnaha i niezrazumiełaha. Kab siabry nie zabyvali i času chapała na ŭsio. P.S.

### КАНТАКТЫ

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Т.: 274-73-75. Валянціна

**Спадарства**! Шукаем месца (кавярня, рэстарацыя) для ладжаньня дзён народзінаў, дзіцячых сьвятаў зь беларускамоўным вядоўцам. Т.: 288-68-91. Ігар і Ганна (пасьля 19-й)

### КНІГІ

**Кнігі—поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — п/с 333, 220050 Менск, э-адрас exlibris@tut.by, вэб-вузел http://knihi.net, т. 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае**: Уладзімер Арлоў «Каханак яе вялікасьці»; часопісы «Асамблея» 6—7/2004, «Дзеяслоў» №11. Т.: 8-029-643-57-33, электронны адрас exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай. Новыя CD**: «Юр'я»: «Весначуха», «БУМэранг»; «Крама»: «Наваполацкі канцэрт», «Osimira»: «Прошча», «Троіца»: «Журавы», «Ulis»: «Танцы на даху», «Чужаніца», «Краіна доўгай белай хмары». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Прадаю** «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» (т.1), ёсьць іншыя добрыя беларускія кнігі. Т.: 400-45-91

**Прадам брашуру** аб пісьменьніку Юрку Віцьбічу. Віцебск-9, 210009, да запатрабаваньня. Падліпскаму А.

**Новыя** ды старыя нумары «Arche», «Нацыяналізм у XX ст.» Э.Сьміта, «Уводзіны ў палітыку», «Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР» (са слоўнікам), кнігі ды відэа для дзетак, дапаможнікі, слоўнікі, калядныя паштоўкі, аўдыё, CD, майкі штотыдзень з панядзелка па пятніцу на Румянцава, 13 (ТБМ) 12.30—19.00. Т.: 707-40-01

**Прадам кнігі**: Я.Сямашка «Армія краёва», «Наша Ніва» 1906—1908 г. (факсым.), «Наша Ніва» 1910 г., энцыкляпэдыя «Архітэктура і нумізматыка Беларусі» ды іншыя. Т.: 8-029-753-70-05

**Прадам кнігі**: збор твораў У.Караткевіча ў 8 т., У.Галубок «Творы», кнігі «Памяць»: «Полацак», «Менскі р-н», «Орша» ў 2-х кн. ды іншыя. Т.: 8-029-753-70-05

### ПРАЦА

**Часопіс «ARCHE»** шукае дырэктара-адміністратара на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўваць на э-адрас arche@arche.org.by.

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юрась

Шукаю аднадумцаў для ўтварэньня беларускага турыстычнага клюбу. btclub@tut.by

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Запрашаем у падарожжа**

**5 сьнежня** (нядзеля)
**Горадня з заездам у Мураванку**. 21000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**12 сьнежня** (нядзеля)
«**Нёманская каса**» па маршруце: **Менск—Вузда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Вішнявец—Новы Сьвержань—Менск**. 18000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Усім аўтарам, чые тэксты не надрукаваныя і хто не атрымаў адказу ў «Паштовай скрынцы».** У Рэдакцыю прыходзіць зашмат матэрыялаў, што і выклікала патрэбу пашырэньня газэты да 24 старонак. Большасьць матэрыялаў нетэрміновага характару будуць чакаць наступнага году, бо цяпер ня маем тэхнічнай магчымасьці зьмясьціць іх на 16 палосах.

**Фанату «Дарыды».** Цэнім Ваш гумар.

**Андрэю М. з Гомеля.** Тэкст пра тураўскіх габрэяў XII ст. занадта гіпатэтычны. Дарэчы, цікавыя думкі на гэтую тэму фармуляваў у сваіх публікацыях лінгвіст Пол Вэксьлер.

**Ганьне Я. зь Берасьця.** Па-першае, запозна даслалі рэцэнзію. Па-другое, у ёй многа фармалізму, рэцэнзія не даказвае значнасьці выставы. Пішэце яшчэ.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3516. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 03.12.2004.
Замова № 7312.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а